А. А. Палейка

# МЕДЫЯТЭКСТЫ
## Ў НАВУЧАННІ ГІСТОРЫІ І ГРАМАДАЗНАЎСТВУ

Дапаможнік для настаўнікаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

*Рэкамендавана*
*Навукова-метадычнай установай*
*«Нацыянальны інстытут адукацыі»*
*Міністэрства адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2018

УДК 373.5.016:94(072)
ББК 74.266.3я77
П14

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра гісторыі паўднёвых і заходніх славян гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (кандыдат гістарычных навук дацэнт *Л. А. Козік*); настаўнік гісторыі кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Бярозы імя В. Х. Галаўко» *Г. М. Руціч*; настаўнік гісторыі і грамадазнаўства кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Лагойска», член секцыі гістарычных дысцыплін дзяржаўнай камісіі па падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў у гуманітарна-грамадазнаўчай сферы *З. Я. Вінаградава*

**Палейка, А. А.**
П14 Медыятэксты ў навучанні гісторыі і грамадазнаўству : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. А. Палейка. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018. — 95 с. : іл.
ISBN 978-985-553-543-1.

Дапаможнік складзены ў адпаведнасці з новымі вучэбнымі праграмамі па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі і грамадазнаўстве для V—XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і можа выкарыстоўвацца таксама ў адукацыйным працэсе па пераходных вучэбных праграмах, абноўленых з улікам стварэння дыдактычных умоў для рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу. Разглядаюцца асаблівасці рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні гісторыі і грамадазнаўству, медыяадукацыйныя аспекты школьнай гісторыка-грамадазнаўчай адукацыі. Прапануюцца метадычныя рэкамендацыі па рабоце з рознымі відамі і жанрамі медыятэкстаў.
Адрасуецца настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

**УДК 373.5.016:94(072)**
**ББК 74.266.3я77**

**ISBN 978-985-553-543-1**

© Палейка А. А., 2018
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2018

# Ад аўтара

***Шаноўныя калегі!***

Стварэнне метадычнага дапаможніка па выкарыстанні медыятэкстаў на ўроках гісторыі і грамадазнаўства абумоўлена надзвычайнай актуальнасцю і высокім патэнцыялам медыяадукацыі як сродку рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў падрыхтоўцы вучняў. Мэта сучаснай школы — не перагружаць вучня ведамі, а ствараць умовы для выпрацоўкі трывалай каштоўнаснай пазіцыі асобы і ўменняў і навыкаў выкарыстання набытых ведаў. Адрозненне кампетэнцый ад традыцыйных ведаў, уменняў, навыкаў (ВУН) палягае менавіта ў каштоўнаснай пазіцыі, якая вызначае паводзіны асобы ў сітуацыі выбару, а самі кампетэнцыі разглядаюцца як гатоўнасць скарыстаць засвоеныя ВУН, сфарміраваны вопыт дзейнасці для рашэння практычных і творчых заданняў, працягу адукацыі, працоўнай дзейнасці, паспяховай сацыялізацыі. Медыяінфармацыйныя кампетэнцыі вучняў належаць да ключавых ведаў, уменняў, навыкаў і каштоўнасных установак, неабходных для бяспечнага жыцця і паспяховай самарэалізацыі асобы ў інфармацыйным грамадстве. Выкарыстанне ў адукацыйным працэсе прадуктаў вытворчасці медыя — медыятэкстаў — стварае спрыяльныя ўмовы не толькі для фарміравання медыяінфармацыйнай пісьменнасці, але і для развіцця і ўдасканалення сацыяльных, грамадзянскіх, культурных і камунікатыўных кампетэнцый вучняў.

Плануецца, што настаўнікі гісторыі і грамадазнаўства пасля азнаямлення з дапаможнікам:

- *ацэняць патэнцыял выкарыстання медыятэкстаў у адукацыйным працэсе для рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні гісторыі і грамадазнаўству;*
- *навучацца аналізаваць медыятэксты розных відаў і жанраў;*
- *навучацца адбіраць медыятэксты да ўрокаў па змесце вучэбнага прадмета і адаптаваць ключавыя пытанні для іх аналізу ў залежнасці ад узросту сваіх навучэнцаў і мэт навучання;*
- *здолеюць спланаваць і паспяхова правесці ўрокі гісторыі і грамадазнаўства з выкарыстаннем медыятэкстаў;*
- *зробяць работу з медыятэкстамі сваёй пастаяннай педагагічнай практыкай.*

Дапаможнік складзены ў адпаведнасці з новымі вучэбнымі праграмамі па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі і грамадазнаўстве для V—XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і можа выкарыстоўвацца таксама ў адукацыйным працэсе па пераходных вучэбных праграмах, абноўленых з улікам стварэння дыдактычных умоў для рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу. У вучэбнае выданне ўключаны матэрыялы семінараў і трэнінгаў па медыяадукацыі для настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства, якія адбыліся на працягу трох апошніх гадоў у Нацыянальным інстытуце адукацыі, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, абласных інстытутах развіцця адукацыі, школах і гімназіях нашай краіны. Вялікая ўвага надаецца распрацоўкам на аснове шматлікіх публікацый матэрыялаў па рэалізацыі рэспубліканскага інавацыйнага праекта «Укараненне мадэлі фарміравання медыякультуры вучняў ва ўмовах сучаснага інфармацыйна-камунікатыўнага асяроддзя ўстаноў адукацыі». На стварэнне дапаможніка вельмі паўплывалі спрыяльныя ўмовы для абмеркавання медыяадукацыйнай праблематыкі і высокі ўзровень прафесійнай камунікацыі ў сеткавых настаўніцкіх суполках *Медыяадукатар* у Facebook, *Медыяадукатар* і *Web Κλειώ* ў Google+. Плённае супрацоўніцтва з педагогамі іншых

краін і абмен досведам падчас адукацыйных візітаў і ў сеткавай камунікацыі пасадзейнічалі інтэграцыі найлепшага замежнага досведу медыяадукацыі ў беларускую школу.

Асаблівасцю дапаможніка з’яўляецца прыярытэт нацыянальнага кампанента ў змесце — пераважаюць матэрыялы па айчыннай гісторыі і тэндэнцыях развіцця сучаснага беларускага грамадства.

У першай частцы дапаможніка настаўнікі пазнаёмяцца з асаблівасцямі рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні гісторыі і грамадазнаўству, разгледзяць медыяадукацыйныя аспекты школьнай гісторыка-грамадазнаўчай адукацыі, засяродзяцца на аналітычнай структуры — алгарытмах работы з інфармацыяй, відах медыятэкстаў і пытаннях для іх аналізу, ацэняць прапанаваныя спосабы ўключэння работы з медыятэкстамі ў адукацыйны працэс па гісторыі і грамадазнаўстве.

У другой частцы прапануюцца метадычныя рэкамендацыі па рабоце з рознымі відамі і жанрамі медыятэкстаў, мноства практыкаванняў, кейсаў і электронныя рэсурсы, пазначаныя QR-кодамі. Практыкаванні распрацаваны на аснове публікацый айчынных і замежных аўтараў і прызначаны для фарміравання метапрадметных уменняў і навыкаў работы з інфармацыяй і медыя. Лепш арыентавацца ў практыкаваннях настаўніку дапамагаюць метадычныя і змястоўныя тэгі — ключавыя словы, якія аформлены як ***#хештэгі***. Да кожнага практыкавання прапануецца кароткае апісанне яго правядзення як прыклад вучэбнай ці практычнай сітуацыі. У канцы дапаможніка можна знайсці ***«Даведнік па практыкаваннях»*** (табл. 23, с. 83–87) — выніковую табліцу, у якой яны сістэматызаваны ў адпаведнасці з тэмамі вучэбных праграм. У дапаможніку для самастойнай распрацоўкі настаўнікамі медыяадукацыйнага кампанента ўрокаў размешчаны ***кейсы*** — медыятэксты з праблемнымі пытаннямі да іх і каментарыямі для педагогаў, якія сістэматызаваны ў адпаведнасці з тэмамі вучэбных праграм у ***«Даведніку па кейсах з медыятэкстамі»*** (табл. 24, с. 88–89). Асноўныя паняцці і тэрміны медыяадукацыі можна знайсці ў ***«Слоўніку медыяпедагога»*** (с. 90–91). Адаптацыі пытанняў для аналізу розных медыятэкстаў навучэнцамі рознага ўзросту знаходзяцца ў ***«Памятках для вучняў»*** (с. 91–93). Пад ***QR-кодамі*** ў дапаможніку змешчаны гіперспасылкі на электронныя адукацыйныя рэсурсы — «воблачныя» прэзентацыі і навучальныя ролікі, медыяадукацыйныя сайты і сеткавыя суполкі медыяадукатараў. Навігацыйны апарат дапаможніка дазваляе настаўнікам лепш арыентавацца ў новым змесце і хутчэй знаходзіць патрэбны матэрыял.

## Умоўныя абазначэнні

 — метадычныя парады

 — кейсы з медыятэкстамі

 — практыкаванні

— гіперспасылкі на электронныя адукацыйныя рэсурсы

# Частка 1

## РЭАЛІЗАЦЫЯ КАМПЕТЭНТНАСНАГА ПАДЫХОДУ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ ПА ГІСТОРЫІ І ГРАМАДАЗНАЎСТВЕ СРОДКАМІ МЕДЫЯАДУКАЦЫІ

### 1.1. Кампетэнтнасны падыход да падрыхтоўкі вучняў па гісторыі і грамадазнаўстве: мэты, метады і сродкі, вынікі навучання

Мэтай школьнай гісторыка-грамадазнаўчай адукацыі з'яўляецца садзейнічанне станаўленню адказнай і творчай асобы, якая валодае развітой свядомасцю і самасвядомасцю, крытычным мысленнем, здольнай на аснове засваення сацыяльна-гуманітарных ведаў пра чалавека, грамадства і дзяржаву, асэнсавання асноўных тэндэнцый развіцця сучаснага грамадства вызначыць шляхі канструктыўнай самарэалізацыі і ўключыцца ў прадуктыўную стваральную дзейнасць [1]. Вучэбныя прадметы «Гісторыя Беларусі», «Сусветная гісторыя» і «Грамадазнаўства» адыгрываюць значную ролю ў фарміраванні нацыянальнай, грамадзянскай, культурнай ідэнтычнасці асобы і выхаванні грамадзянскасці і патрыятызму і з'яўляюцца асновай для развіцця сацыяльных, грамадзянскіх, медыяінфармацыйных, культурных і камунікатыўных кампетэнцый [2].

Кампетэнтнасны падыход да падрыхтоўкі вучняў прадугледжвае такое вызначэнне мэт, зместу, метадаў, сродкаў, вынікаў навучання, каб яны спрыялі фарміраванню гатоўнасці вучняў да жыццядзейнасці ў свеце, які пастаянна змяняецца. У дачыненні да адукацыйнага працэсу кампетэнцыі ўяўляюць сабой зададзеныя вучэбнай праграмай патрабаванні да падрыхтоўкі вучняў у выглядзе пераліку асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў навучання (гл. мал. 1). Асобасныя вынікі — гэта каштоўнасныя арыенціры, устаноўкі, стаўленне; метапрадметныя — уменні і навыкі эфектыўна арганізоўваць дзейнасць, камунікаваць, працаваць з інфармацыяй і выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі, публічна прадстаўляць вынікі дзейнасці; прадметныя — веды (уяўленні і сістэмныя веды аб асноўных фактах, паняццях, тэорыях), уменні і навыкі (распазнаваць, характарызаваць, аналізаваць, параўноўваць, тлумачыць і ацэньваць падзеі і працэсы і інш.).

Кампетэнтнасны падыход да падрыхтоўкі вучняў прадугледжвае не механічнае запамінанне пэўнага аб'ёму інфармацыі (дат, паняццяў, асоб, падзей), а фарміраванне вопыту самастойнага рашэння вучэбных і практычных задач, якія патрабуюць выкарыстання засвоеных ведаў і ўменняў. Сярод іх — уменні шукаць і апрацоўваць інфармацыю з розных крыніц, пераўтвараць інфармацыю з візуальнага ў вербальны выгляд і наадварот, адрозніваць меркаванні і інтэрпрэтацыі ад гістарычных фактаў, праводзіць аналіз гістарычных крыніц і рэканструяваць на іх аснове вобразы гістарычнага мінулага і яго ўдзельнікаў і г. д. Паводле вучэбных праграм для фарміравання кампетэнцый вучняў прынцыпова важным з'яўляецца выкарыстанне розных крыніц гістарычнай і сучаснай сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі (хрэстаматый, навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры, сродкаў масавай інфармацыі,




*Мал. 1. Структура кампетэнцый*

інтэрнэт-рэсурсаў) і ўключэнне вучняў у розныя віды вучэбна-пазнавальнай дзейнасці па змястоўных лініях гістарычнай адукацыі: гістарычны час, гістарычная прастора, гістарычнае развіццё, чалавек у гісторыі [2].

У апошніх вучэбных праграмах па грамадазнаўстве з'явіўся новы змест: медыя, масавая камунікацыя, інфармацыйная культура, віртуальнасць разглядаюцца на розных узроўнях вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў, значная ўвага акцэнтуецца на рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач з выкарыстаннем розных крыніц сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі, матэрыялаў электронных і друкаваных СМІ. Для практычнай рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў адукацыйным працэсе рэкамендуецца ўлічваць сучасныя адукацыйныя трэнды (медыяадукацыя, «змяшанае» навучанне, «перакулены клас», візуалізацыя

навучання і інш.), умець арганічна спалучаць інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі і праектныя методыкі з традыцыйнымі методыкамі; выкарыстоўваць актыўныя і інтэрактыўныя метады навучання і ўмець праводзіць аналіз і ацэнку выкананых практыкаванняў і гульняў («мазгавы штурм», ролевая і дзелавая гульні, мадэляванне праблемных сітуацый, дыскусія, метад праектаў, кейс-метад і інш.) [3].

На сённяшні дзень у айчыннай вучэбна-метадычнай літаратуры па гісторыі і грамадазнаўстве для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі пераважна разглядаецца арганізацыя работы вучняў з пісьмовымі гістарычнымі крыніцамі, сярод якіх летапісы, хронікі, дагаворы і пагадненні, партыйныя праграмы, адозвы, палітычныя прамовы, мемуары, дзённікі, пісьмы, гістарычная проза і паэзія, эпас, песні і інш. У навучанні гісторыі асобна вылучаецца работа з нагляднасцю — творамі выяўленчага мастацтва і вучэбнымі карцінамі, карыкатурамі, плакатамі, фатаграфіямі, якія пераважна выкарыстоўваюцца настаўнікамі «для вобразнай дэманстрацыі новых фактаў, для абагульнення і праверкі ведаў і ўменняў вучняў, але… значна радзей у ілюстрацыях бачаць візуальныя крыніцы гістарычнай інфармацыі, раўназначныя друкаваным тэкстам» [4, с. 117]. Паступова сітуацыя змяняецца: у прадметных навукова-метадычных часопісах і іншых педагагічных выданнях з'яўляецца ўсё больш метадычных публікацый, прысвечаных візуальным формам прадстаўлення і засваення вучэбнай гістарычнай інфармацыі (М. Мініцкі, С. Паноў, Г. Давідоўская, Н. Кушнер, З. Вінаградава, Г. Руціч, І. Шымко, А. Гулюк і інш.), выкарыстанню вуснагістарычных крыніц (І. Кашталян, І. Раманава, І. Соркіна, Д. Касякова, І. Бернат), рабоце па развіцці грамадзянскасці сродкамі кінаклуба (І. Пясенка). Асобна неабходна вылучыць метадычныя публікацыі па рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні гісторыі з выкарыстаннем комплексаў разнастайных крыніц (С. Паноў, А. Корзюк, А. Колтан, С. Кудраўцава, В. Жук).

Такім чынам, сённяшняе абнаўленне вучэбных праграм і вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу ў кантэксце рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу стварае спрыяльныя ўмовы для інтэграцыі медыяадукацыі ў навучанне. У наступным параграфе настаўнікам прапануецца азнаёміцца з асноўнымі паняццямі і тэорыямі медыяадукацыі ў рэчышчы актуалізацыі і сістэматызацыі ведаў пра развіццё сацыяльнай камунікацыі, медыя і інфармацыйнае грамадства.

**Літаратура і электронныя рэсурсы**

1. Конкурс на создание новых учебных пособий для учреждений общего среднего образования // Образовательный портал [Электронный ресурс]. — 2018. — Режим доступа: http://adu.by/ru/uchitelyu/konkurs-na-sozdanie-uchebnykh-posobij/dlya-uchrezhdenij-obshchego-srednego-obrazovaniya.html. — Дата доступа: 20.07.2018.
2. История Беларуси: нормативные правовые документы // Национальный образовательный портал [Электронный ресурс]. — 2017. — Режим доступа: http://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2017–2018-uchebnyj-god/202-uchebnye-predmety-v-xi-klassy/1284-istoriya-belarusi.html. — Дата доступа: 20.04.2018.
3. Методические рекомендации по организации образовательного процесса по учебному предмету «Обществоведение» // Национальный образовательный портал [Электронный ресурс]. — 2018. — Режим доступа: http://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2017–2018-uchebnyj-god/202-uchebnye-predmety-v-xi-klassy/1285-obshchestvovedenie.html. — Дата доступа: 20.08.2018.
4. *Корзюк, А. А.* Выкарыстанне гістарычных крыніц на ўроках гісторыі і грамадазнаўства: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. А. Корзюк. — Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2016.

## 1.2. Медыяадукацыя: гісторыя, асноўныя паняцці, тэорыі, падыходы

Станаўленне сучаснага грамадства стала вынікам некалькіх інфармацыйных рэвалюцый, якія змянілі не толькі спосабы апрацоўкі і перадачы інфармацыі, але і сістэму каштоўнасцяў, лад жыцця людзей, спосабы вытворчасці (мал. 2).




*Мал. 2. Інфармацыйныя рэвалюцыі і грамадства*

Кожная інфармацыйная рэвалюцыя адкрывала новыя магчымасці назапашвання інфармацыі і каналы абмену інфармацыяй, удасканальвала спосабы яе перадачы — змяняла камунікацыю, якая станавілася ўсё больш масавай. Адным з заснавальнікаў філасофіі сацыяльнай камунікацыі лічыцца канадзец М. Маклюэн, які першы звярнуў увагу на тое, што радыё, друкаваныя СМІ, тэлебачанне ўздзейнічаюць на аўдыторыю па-рознаму.

***Масавая камунікацыя*** — працэс распаўсюджвання інфармацыі і ўплыву ў грамадстве з дапамогай спецыяльных сродкаў ***(медыя)***: друку, тэлебачання, радыё, кінематографа, інтэрнэту і г. д. Масавая камунікацыя перш за ўсё характарызуецца:

- *наяўнасцю тэхнічных спосабаў, якія забяспечваюць рэгулярнасць, масавасць, публічнасць паведамленняў;*
- *сацыяльнай значнасцю інфармацыі;*
- *масавасцю аўдыторыі;*
- *шматканальнасцю з магчымасцю выбару спосабу камунікацыі.*

У сярэдзіне XX ст. адзін з заснавальнікаў сацыялогіі масавай камунікацыі амерыканскі навуковец Г. Ласуэл распрацаваў мадэль камунікацыйнага працэсу (гл. мал. 3), якая з'яўляецца адначасова і мадэллю яго даследавання, аналізу структуры і асобных элементаў. Мадэль схематычна адлюстроўвае, як інфармацыя функцыянуе ў грамадстве — распаўсюджваецца праз розныя каналы медыя на вялікую аўдыторыю, якая знаходзіцца ў розных месцах [1, с. 10]. У працэсе камунікацыі важным з'яўляецца не толькі тое, што перадаецца і па якіх каналах праходзіць інфармацыя, але і выніковасць перадачы гэтай інфармацыі, бо паведамленне паступае адразу да вялікіх груп людзей.

Для лепшага разумення вучнямі асаблівасцяў электроннай камунікацыі на ўроках грамадазнаўства рэкамендуецца выканаць практыкаванне «Каналы камунікацыі».

## *«Каналы камунікацыі»*

***#медыяспажыванне #аўдыторыя_медыя #работа_ў_парах***

***Мэта****: удзельнікі зразумеюць, як працуюць розныя каналы камунікацыі ў залежнасці ад мэтавай аўдыторыі.*

***Ход практыкавання.*** *Настаўнік прапануе вучням прааналізаваць паводле формулы Г. Ласуэла некалькі паведамленняў для рознай аўдыторыі (можна скарыстацца скрыншотамі паведамленняў са старонак сайтаў, сацыяльных сетак, месенджараў) і вызначыць асаблівасці працэсу камунікацыі ў інтэрнэце сродкамі электроннай пошты, відэаканферэнцыі, форуму на сайце, чата ў камунікатары (месенджары), сацыяльнай сеткі (каментарый, пост, прыватнае паведамленне, чат) для рознай аўдыторыі.*

***Пытанні для абмеркавання***

- *Якія каналы і чаму выкарыстоўваюцца ў зносінах з аднагодкамі?*
- *Якія каналы і чаму выкарыстоўваюцца ў стасунках з настаўнікамі?*
- *Якія каналы неабходна выкарыстоўваць у звароце да арганізацый, ва ўстановы?*
- *Якое паведамленне, калі і чаму становіцца публічным? [2, с. 12].*




*Мал. 3. Мадэль камунікацыі (паводле Г. Ласуэла)*

Найважнейшую ролю ў масавай камунікацыі адыгрываюць медыя. ***Медыя*** — сродкі масавай камунікацыі (СМК), да якіх належаць друк, прэса, тэлебачанне, кінематограф, радыё, гуказапісы і інтэрнэт. Вельмі часта тэрміны «сродкі масавай камунікацыі» (СМК) і «сродкі масавай інфармацыі» (СМІ) ужываюцца як сінонімы, але паміж імі ёсць істотныя адрозненні. СМІ (газеты і часопісы, інфармацыйныя агенцтвы, радыёпраграмы і тэлеканалы) характарызуюцца арганізацыйным і структурным афармленнем, сістэматычнасцю і перыядычнасцю выдання. Максімальны ахоп аўдыторыі і цэнтралізаванае распаўсюджванне слоўнай, гукавой і візуальнай інфармацыі забяспечваюць прэса, кіно і тэлебачанне, таму іх часта называюць ***масмедыя***. У склад СМК акрамя СМІ ўваходзяць так званыя ***новыя медыя*** — у першую чаргу

гэта сацыяльныя сеткі і месенджары. Распаўсюджанне мабільных прылад, даступнасць інтэрнэту і папулярнасць сацыяльных сетак і месенджараў паспрыялі з'яўленню мультымедыйных або канвергентных рэдакцый, якія ствараюць ***кантэнт*** для розных відаў медыя: сайта газеты, інтэрнэт-ТБ, старонкі выдання ў сацыяльнай сетцы і г. д. Прадуктамі вытворчасці медыя з'яўляюцца ***медыятэксты*** — паведамленні, створаныя ў розных відах і жанрах медыя.

Адлюстраваннем у адукацыі працэсаў развіцця інфармацыйнага грамадства стала ***медыяадукацыя***, якая ўзнікла параўнальна нядаўна ў адказ на выклікі бурнага развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і сёння з'яўляецца важным інавацыйным складнікам педагогікі ва ўсіх развітых краінах свету. Мэта медыяадукацыі — фарміраванне ў вучняў крытычнага стаўлення да інфармацыі і медыя, ператварэнне іх у крэатыўных і адказных карыстальнікаў і стваральнікаў медыякантэнту. Яшчэ ў сярэдзіне 1980-х гг. брытанец Л. Мастэрман, адзін з вядучых тэарэтыкаў медыяадукацыі, вылучыў і абгрунтаваў сем прычын актуальнасці медыяадукацыі ў сучасным свеце.

***Прычыны актуальнасці медыяадукацыі***

- *Высокі ўзровень спажывання масмедыя і насычанасць сучаснага грамадства іх прадуктамі.*
- *Ідэалагічная важнасць медыя і іх уплыў на грамадства.*
- *Хуткі рост колькасці медыйнай інфармацыі, узмацненне механізмаў кіравання і распаўсюджвання інфармацыі.*
- *Інтэнсіўнасць пранікнення медыя ў асноўныя дэмакратычныя працэсы.*
- *Рост значнасці візуальнай камунікацыі і інфармацыі ва ўсіх галінах.*
- *Неабходнасць навучання школьнікаў і студэнтаў з арыентацыяй на адпаведнасць сучасным патрабаванням.*
- *Паскарэнне працэсаў манетызацыі інфармацыі на нацыянальным і міжнародным узроўнях [3, с. 73].*

Навукова-тэарэтычная база медыяадукацыі характарызуецца наяўнасцю мноства тэорый і іх пастаянным абнаўленнем, што звязана як з хуткім развіццём медыясферы, так і з асаблівасцямі ўкаранення медыяадукацыі ў нацыянальныя сістэмы адукацыі. Напачатку 2000-х гг. расійскі метадолаг медыяадукацыі А. В. Фёдараў згрупаваў тэорыі медыяадукацыі вакол двух асноўных падыходаў: ***пратэкцыянісцкага*** (абарона ад шкоднага ўплыву медыя) і ***аналітычнага*** (развіццё крытычнага мыслення) [4, с. 16]. На сённяшні дзень вядучай канцэпцыяй медыяадукацыі ў свеце з'яўляецца тэорыя развіцця крытычнага мыслення. Фінскі адукацыйны тэхнолаг Т. Варыс адзначае запатрабаванасць крытычнага мыслення ва ўмовах беспрэцэдэнтнага росту колькасці інфармацыі з розных крыніц: «Навыкі крытычнага мыслення і творчыя навыкі неабходныя, каб развіваць кагнітыўныя кампетэнцыі для асэнсавання інфармацыйных патокаў з пункту гледжання мэт, каштоўнасцяў і іншых культурных аспектаў. Медыяадукацыя павінна развіваць базавыя навыкі выкарыстання медыя і ўлік культурных асаблівасцяў для фарміравання шматкультурных камунікатыўных і цывілізацыйных кампетэнцый» [5]. Звяртаем увагу педагогаў на модуль «Крытычнае мысленне» на электронным адукацыйным рэсурсе — шматмоўным сайце аб глабальнай адукацыі monda.eu/be, які пераклалі на беларускую мову айчынныя педагогі. Там можна знайсці выдатныя кейсы і практыкаванні па развіцці крытычнага мыслення.

Сёння надзвычай важна разумець, што медыя і інфармацыя звязаны ў адзінае непарыўнае цэлае. Лідар распаўсюджвання медыяадукацыі ў свеце — ЮНЕСКА — аб'ядноўвае інфармацыйную і медыйную пісьменнасці *(Laws of Media and Information Literacy, MIL)*. Гэтыя дзве сферы падаюцца як камбінацыя кампетэнцый, неабходных для жыцця і працы ў сучасным свеце. Прынцыпы MIL датычаць усіх відаў СМІ і іншых крыніц інфармацыі (бібліятэкі, архівы, музеі, інтэрнэт) незалежна ад выкарыстаных тэхналогій [5]. Мноства крыніц інфармацыі

і відава-жанравая разнастайнасць медыя абумоўліваюць неабходнасць комплекснага падыходу да фарміравання медыяінфармацыйнай пісьменнасці.

Такім чынам, разглядаючы медыяадукацыю як працэс навучання і выхавання, можна вылучыць яе асноўныя мэты і запланаваны вынік — медыяінфармацыйную пісьменнасць (далей — МІП) (мал. 4).




*Мал. 4. Мэты і вынікі медыяадукацыі*

У медыяадукацыі вылучаюцца два асноўныя аспекты: спажыванне і вытворчасць інфармацыі і медыя. Першы аспект звязаны з уменнямі крытычнага ўспрымання, ацэнкі і выкарыстання інфармацыі, якая паступае з розных крыніц. Гэтыя ўменні спрыяюць развіццю крытычнага мыслення асобы і дапамагаюць чалавеку ў прыняцці адпаведных стратэгій паводзін і дзейнасці. Другі аспект прадугледжвае наяўнасць у індывіда ўменняў быць паспяховым і адказным аўтарам звычайных, аўдыя- і відэатэкстаў, якія ён размяшчае на сайтах, у блогах, на YouTube, на форумах і г. д.

Падчас рэалізацыі Праграмы ЮНЕСКА «Інфармацыя для ўсіх» у 2012 г. распрацаваны дапаможнік для педагогаў «Лічбавая будучыня. Каталог медыйных і інфармацыйных навыкаў», у якім у рэчышчы сістэмнага падыходу да канцэпцыі МІП асвятляюцца ключавыя навыкі і ўменні выкарыстання інфармацыі ва ўсіх яе формах для ўсіх узроставых груп (ад дашкольнікаў да дарослых) [6, с. 4–8]. У названым дапаможніку вылучаны восем тэматычных блокаў МІП: інфармацыя, бяспека, мова, этыка і каштоўнасці, адносіны, прававыя і эканамічныя аспекты, творчае выкарыстанне (гл. мал. 5). Для лепшага разумення мэт і вынікаў медыяадукацыі прапануем спіс медыяінфармацыйных кампетэнцый, распрацаваны айчыннымі педагогамі паводле міжнародных стандартаў ЮНЕСКА.

***Спіс медыяінфармацыйных кампетэнцый беларускага вучня***

**Веды:**

- *разуменне ролі сродкаў масавай камунікацыі, іх уплыву на асобу і грамадства;*
- *базавыя веды пра тэхналогіі інфармацыйнага грамадства, якія забяспечваюць доступ і інтэрактыўныя зносіны ў інфармацыйнай прасторы, магчымасці адбору інфармацыі, метады праверкі надзейнасці крыніц;*
- *веды пра бяспеку, магчымасці і патэнцыйныя рызыкі інтэрнэту для асабістага жыцця, камунікацыі, навучання, даследаванняў, працы і грамадскіх зносін;*
- *веданне прававых і этычных нормаў інтэрактыўнага карыстання інфармацыйнымі тэхналогіямі.*




*Мал. 5. Тэматычныя галіны навучання МІП*

**Уменні і навыкі:**

- *здольнасць да пошуку, праверкі надзейнасці, адбору і апрацоўкі інфармацыі;*
- *інтэрактыўнае ўзаемадзеянне з медыя;*
- *уменні аналізу медыяпаведамленняў, іх крытычнай ацэнкі, распазнавання няпраўды і маніпуляцыйных прыёмаў;*
- *навыкі карыстання паслугамі інтэрнэту, інструментамі для вытворчасці ўласных медыяпрадуктаў і іх прэзентацыі;*

**Каштоўнасная пазіцыя (стаўленне):**

- *крытычнае і рэфлексіўнае стаўленне да даступнай інфармацыі;*
- *адказнае і этычнае карыстанне інтэрактыўнымі сродкамі і інфармацыйнымі тэхналогіямі;*
- *павага да аўтарскіх правоў;*
- *трыманне трывалай каштоўнаснай пазіцыі, якая ўключае ў сябе асноўныя правы і свабоды чалавека, беларускую нацыянальна-моўную і цывілізацыйную ідэнтычнасць — як эфектыўны фільтр для нейтралізацыі шкодных і маніпуляцыйных уздзеянняў медыя;*
- *імкненне актыўна карыстацца і ствараць інфармацыйную прастору для культурных, сацыяльных, навучальных і / ці прафесійных мэт [7, с. 32].*

У 2012 г. ЮНЕСКА распрацавана праграма «Медыйная і інфармацыйная пісьменнасць: праграма навучання педагогаў» [8]. У ёй сістэматызаваны разнастайныя педагагічныя прыёмы, метады і стратэгіі фарміравання медыяінфармацыйнай пісьменнасці вучняў, сярод якіх — аналіз медыятэкстаў, ролевыя і дзелавыя гульні, метад праектаў і кейс-метад, кааператыўнае і праблемнае навучанне, стварэнне медыяпрадуктаў і інш. (гл. мал. 6).

Такім чынам, у рэчышчы кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі вучняў можна асобна вылучыць медыяадукацыйны падыход, скіраваны на фарміраванне і развіццё медыяінфармацыйных кампетэнцый навучэнцаў адпаведнымі метадамі і сродкамі навучання.

На сённяшні дзень найбольш сістэмна медыяадукацыя інтэгруецца ў вучэбна-метадычнае забеспячэнне вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства». Гэта цалкам зразумела, бо ў інфармацыйным грамадстве немагчыма ўявіць вывучэнне палітычных і эканамічных працэсаў, міжнародных падзей, узаемадзеяння розных этнасаў і культур па-за медыя. Як адзначаў выбітны нямецкі сацыёлаг Н. Луман, «усё, што мы ведаем пра наша грамадства, нават пра свет, у якім мы жывём, мы ведаем дзякуючы масмедыя» [9, с. 8].

У новых вучэбных праграмах па грамадазнаўстве для IX—XI класаў (2018) можна вылучыць асобны медыяадукацыйны блок у метапрадметных выніках вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў:

- *атрымліваць з разнастайных крыніц і крытычна асэнсоўваць інфармацыю, сістэматызаваць, аналізаваць, інтэрпрэтаваць атрыманыя даныя і выкарыстоўваць іх пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач;*
- *адрозніваць факты, аргументы, ацэначныя меркаванні, аддзяляць асноўную інфармацыю ад другараднай, перадаваць змест інфармацыі адэкватна пастаўленай мэце (сцісла, поўна, выбарачна);*
- *здабываць з крыніц, створаных у розных знакавых сістэмах (тэкст, табліца, графік, дыяграма і інш.), інфармацыю, пераўтвараць яе і выкарыстоўваць пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач;*
- *выкарыстоўваць сродкі інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій у вырашэнні кагнітыўных, камунікатыўных і арганізацыйных задач з захаваннем прававых і этычных нормаў, нормаў інфармацыйнай бяспекі [10].*




*Мал. 6. Метады фарміравання МІП*

Зазначым, што паўнавартасная інтэграцыя медыяадукацыі ў навучанне гісторыі і грамадазнаўству ўскладняецца тым, што многія настаўнікі памылкова атаясамліваюць медыякампетэнтнасць з узроўнем валодання інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі (ІКТ). З метапрадметных вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў бачна, што ІКТ-пісьменнасць з'яўляецца толькі важным складнікам медыяінфармацыйнай кампетэнтнасці. Вылучым медыяадукацыйныя аспекты новых вучэбных праграм па грамадазнаўстве для IX—XI класаў у прадметных выніках і змесце, на якім яны мусяць быць сфарміраваныя (табл. 1).

*Табліца 1*

**Медыяадукацыйныя аспекты грамадазнаўства**

| Клас | Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці | Змест вучэбнага прадмета |
|---|---|---|
| **IX** | **Ведаць**: азначэнні паняццяў «медыятэкст», «інфармацыйная культура»; правілы бяспечных інтэрнэт-зносін, правы чалавека ў інтэрнэце;<br>**умець**: характарызаваць жанры медыятэкстаў і спосабы ўздзеяння аўтараў медыятэкстаў на аўдыторыю;<br>тлумачыць і канкрэтызаваць прыкладамі верагоднасць інфармацыі ў масмедыя, прыватнасць і канфідэнцыяльнасць у віртуальным свеце, уплыў інфармацыйных рэвалюцый на жыццё чалавека і грамадства;<br>адэкватна ўспрымаць, аналізаваць і даваць ацэнку медыятэкстам | **Чалавек у прасторы медыякультуры.** Паняцце медыя і медыятэксту. Віды і жанры медыя. Успрыманне, аналіз і ацэнка медыятэксту. Уплыў медыя на фарміраванне грамадскай думкі і пазіцыю асобнага чалавека.<br>**Віртуальны свет сучаснага чалавека.** Паняцце віртуальнага свету. Спецыфіка адукацыйнай і гульнявой прасторы ў віртуальным свеце. Віды і культура віртуальных зносін. Каштоўнасці моладзі ў рэальным і віртуальным грамадствах.<br>**Інфармацыйная культура ў сучасным грамадстве.** Паняцце і прыкметы інфармацыйнай культуры. Уплыў інфармацыйных рэвалюцый на чалавека і грамадства. Роля інфармацыйнай пісьменнасці ў жыцці сучаснага чалавека |
| **X (базавы ўзровень)** | **Ведаць**: азначэнне паняцця «сацыяльная камунікацыя»;<br>**умець**: распазнаваць на аснове прыведзеных характарыстык факты, аргументы і ацэначныя меркаванні;<br>адрозніваць факты і меркаванні ў патоку палітычнай інфармацыі;<br>тлумачыць ролю і асаблівасці масавай камунікацыі ў грамадстве, значэнне СМІ і іх уздзеянне на грамадскую думку | **Сацыяльная камунікацыя.** Паняцце і віды сацыяльнай камунікацыі. Сродкі масавай камунікацыі. Асаблівасці масавай камунікацыі ў сучасным грамадстве.<br>**Сродкі масавай інфармацыі і палітыка.** Асноўныя функцыі СМІ. Месца і роля СМІ ў палітычным жыцці грамадства. Тэндэнцыі ўздзеяння СМІ на грамадскую думку |
| **XI (базавы ўзровень)** | **Ведаць**: азначэнне паняцця «інфармацыйнае грамадства»;<br>**умець**: характарызаваць перспектывы развіцця Беларусі ва ўмовах інфармацыйнага грамадства, выклікі і пагрозы чалавецтву | **Гарызонты інфармацыйнага грамадства.** Палітычныя і сацыяльныя адметнасці інфармацыйнага грамадства. Сусветная павуціна інфармацыі. Роля адукацыі ў інфармацыйным грамадстве. Лідарства ў інфармацыйную эпоху [5] |

Для эфектыўнага фарміравання медыяінфармацыйных кампетэнцый вучняў настаўнік гісторыі і грамадазнаўства павінен умець сам і ўмець вучыць гэтаму сваіх вучняў:

- *праводзіць пошук інфармацыі ў крыніцах рознага тыпу;*
- *крытычна аналізаваць крыніцу гістарычнай інфармацыі (характарызаваць аўтарства крыніцы, час, абставіны і мэты яе стварэння);*
- *аналізаваць інфармацыю, пададзеную ў розных знакавых сістэмах (тэкст, карту, табліцу, схему, аўдыявізуальны шэраг);*

- *адрозніваць факты і меркаванні, гістарычныя маніпуляцыі і гістарычныя тлумачэнні;*
- *удзельнічаць у дыскусіях па гістарычных праблемах, звязаных з асвятленнем іх у медыя, фармуляваць уласную пазіцыю па пытаннях, што абмяркоўваюцца, выкарыстоўваць для аргументацыі гістарычныя звесткі [11, с. 15].*

**Літаратура і электронныя рэсурсы**


1. *Lasswell, H.* The Structure and the Function of Communication in Society / H. Lasswell // The Process and Effects of Mass Communication. — Chicago, 1971. — P. 40 (цыт. па: *Адамьянц, Т. З.* Социальные коммуникации: учеб. пособие по дисциплине специализации специальности «Менеджмент организации» — 080507 / Т. З. Адамьянц. — М.: Дрофа, 2009).
2. В школу с медиа: разработки и сценарии уроков, мероприятий / В. Кашуба [и др.]. — Минск: МОИРО, 2015.
3. *Masterman, L.* Teaching the Media / L. Masterman. — London: Comedia, 1985 (цыт. па: *Жилавская, И. В.* Медиаобразование молодежной аудитории / И. В. Жилавская. — Томск: ТИИТ, 2009).
4. *Федоров, А. В.* Понятие об основных теориях медиаобразования / А. В. Федоров, А. А. Новикова // Медиаобразование: история, теория и методика / А. В. Федоров. — Ростов н/Д: ЦВВР, 2001.
5. *Варис, Т.* Цивилизации, технологии, грамотность / Т. Варис // Институт ЮНЕСКО по информационным технологиям в образовании [Электронный ресурс]. — 2017. — Режим доступа: http://iite.unesco.org/ru/news/639368-ru/. — Дата доступа: 08.09.2018.
6. Цифровое будущее: каталог навыков медиа- и информационной грамотности. — М.: МЦБС, 2013.
7. Медыяадукацыя ў школе: фарміраванне медыяграматнасці вучняў: дапам. для настаўнікаў / М. І. Запрудскі [і інш.]; пад рэд. М. І. Запрудскага. — Мінск, 2016.
8. Медийная и информационная грамотность: программа обучения педагогов / К. Уилсон [и др.]. — Париж: ЮНЕСКО, 2012. — 199 с.
9. *Луман, Н.* Реальность массмедиа / Н. Луман; пер. с нем. А. Ю. Антоновского. — М.: Праксис, 2005.
10. Учебные программы по учебному предмету «Обществоведение» (IX, X–XI базовый и повышенный уровень) классов учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения (проект). Конкурс на создание новых учебных пособий // Нацыянальны адукацыйны партал [Электронный ресурс]. — 2018. — Режим доступа: http://adu.by/ru/uchitelyu/konkurs-na-sozdanie-uchebnykh-posobij/dlya-uchrezhdenij-obshchego-srednego-obrazovaniya.html. — Дата доступа: 20.07.2018.
11. Медіаграмотність на уроках суспільних дисциплін: посіб. для вчителя / за ред. В. Іванова, О. Волошенюк, О. Мокрогуза. — К.: Центр віл. преси: Акад. укр. преси, 2016.


## 1.3. Метады і прыёмы работы з інфармацыяй на ўроках гісторыі і грамадазнаўства

Сучасны адукацыйны працэс скіраваны на станаўленне асобы з развітым крытычным мысленнем, якое грунтуецца на актыўным матываваным разглядзе інфармацыі і яе актыўнай ацэнцы праз задаванне пытанняў, уліку розных пунктаў гледжання, магчымага ўплыву стэрэатыпаў і забабонаў, а таксама патэнцыйнай зацікаўленасці вучняў. Некрытычны спажывец інфармацыі чытае артыкул у газеце ці глядзіць тэлевізійныя навіны, каб знайсці агульнапрынятае тлумачэнне падзей, а чалавек з развітым крытычным мысленнем чытае той жа артыкул ці глядзіць тэлевізар, каб даведацца, як аўтар тлумачыць пэўныя падзеі, і ацаніць, як у гэтых медыяпаведамленнях адабраны і апрацаваны факты, якія зроблены дапушчэнні і меркаванні. Крытычнае стаўленне да таго, што мы чытаем, магчымае толькі пры наяўнасці набору свядо-

мых дзеянняў і навыкаў, якія мы выкарыстоўваем для вызначэння, ці дакладная інфармацыя, якую мы атрымліваем або перадаём іншым людзям, ці ёсць у ёй маніпуляцыі і г. д. Неабходна разумець, што ляжыць у аснове медыяпаведамлення: факты, дапушчэнні ці толькі меркаванні. Можна вылучыць чатыры асноўныя этапы работы з медыяпаведамленнем: аддзяленне фактаў ад меркаванняў, праверка крыніцы інфармацыі, параўнанне крыніц інфармацыі, вызначэнне аўтарства (табл. 2).

*Табліца 2*

**Этапы работы з інфармацыяй**

| Этап | Рэкамендацыі |
|---|---|
| 1. Аддзяленне фактаў ад меркаванняў, пунктаў гледжання, ацэнак | • Меркаванне ў тэксце можна знайсці ў выглядзе каментарыя, інтэрпрэтацыі;<br>• ацэнка заўсёды выказвае суб'ектыўную пазіцыю, эмацыйнае стаўленне, заклік да нейкіх дзеянняў;<br>• факт не дае ацэнак, ні да чаго не заклікае;<br>• можна адрозніць меркаванне ад фактаў па словах-маркерах, якія дапамагаюць распазнаваць наяўнасць у тэксце ацэначнай інфармацыі |
| 2. Праверка крыніцы інфармацыі | • Неабходна насцярожана ставіцца да інфармацыі з ананімных крыніц, бо ананімнасць не прадугледжвае адказнасці за пададзеную інфармацыю;<br>• неабходна адрозніваць першасную і другасную крыніцы інфармацыі, бо праз інтэрпрэтацыю і пераказ могуць з'яўляцца недакладнасці;<br>• крыніца лічыцца тым больш надзейнай, чым больш нейтральным (непрадузятым) з'яўляецца яе стаўленне да тэмы або падзеі, пра якую гаворыцца ў навіне;<br>• істотнай з'яўляецца кампетэнтнасць крыніцы ў праблеме, яе блізкасць (але бесстароннасць) да падзеі, працэсу або з'явы, якія асвятляюцца. Калі крыніца мае дачыненне да падзей, што асвятляюцца, або ў яе спецыфічныя інтарэсы, тады яе нейтральнасць ставіцца пад сумнеў;<br>• якасныя медыя паважаюць сваю рэпутацыю і ніколі не стануць рызыкаваць, публікуючы тэндэнцыйную або наўмысна скажоную інфармацыю (варта пачытаць гісторыю рэдакцыі, даведацца імёны яе кіраўнікоў, азнаёміцца з водгукамі чытачоў і меркаваннямі экспертаў) |
| 3. Параўнанне крыніц інфармацыі | • Неабходна правяраць патрэбную інфармацыю з дапамогай некалькіх крыніц (чым большую колькасць крыніц мы даследуем, тым больш гарантыі дакладнасці інфармацыі);<br>• папулярнасць і аўтарытэтнасць крыніцы яшчэ не з'яўляюцца гарантыяй дакладнасці інфармацыі. Кожны факт павінен быць пацверджаны вынікамі незалежных даследаванняў. Незалежныя даследчыкі павінны прыйсці да адных і тых жа высноў;<br>• да выпадковых, адзінкавых звестак неабходна ставіцца з вялікай асцярогай. Чым больш аднолькавых звестак атрымана з розных крыніц, тым больш дакладныя гэтыя звесткі |
| 4. Аўтарства крыніцы інфармацыі | • Варта паставіцца да тэксту максімальна скептычна, калі аўтар не пазначаны;<br>• калі аўтар пакідае электронную пошту для сувязі або магчымасць каментавання, узровень даверу да тэксту расце;<br>• важна, ці спасылаецца аўтар на пэўныя публікацыі як крыніцы прыведзеных ім фактаў і наколькі аўтарытэтнымі з'яўляюцца аўтары гэтых публікацый. Таксама мае значэнне, ці спасылаюцца на дадзены матэрыял іншыя сайты, і калі так, то якія [1, с. 146] |

Адаптацыю работы з інфармацыяй для вучняў можна знайсці ў адпаведнай памятцы (гл. памятку 1 «Пытанні для аналізу медыяпаведамлення» на с. 91).

Уменне аддзяляць факты ад меркаванняў і ацэнак з'яўляецца адным з асноўных патрабаванняў гістарычнай адукацыі, бо без разумення важнай ролі інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў немагчыма глыбокае гістарычнае мысленне. Магістральным кірункам развіцця сучаснай

гістарычнай навукі і адпаведнай дыдактыкі з'яўляецца мультыперспектыўнасць, якая спрыяе здольнасці і гатоўнасці асобы ўспрымаць сацыяльна-гуманітарную інфармацыю з розных пунктаў гледжання і асэнсоўваць плюралізм думак, поглядаў і інтэрпрэтацый гісторыі. Асноўны метадалагічны ***прынцып мультыперспектыўнасці*** — выкарыстанне сведчанняў пра гістарычныя падзеі з розных крыніц — сфармуляваў вядомы брытанскі гісторык Р. Страдлінг: «Большасць гістарычных з'яў, калі не ўсе яны, могуць быць інтэрпрэтаваны і рэканструяваны з розных пунктаў гледжання, у розных перспектывах, зададзеных і абмежаванасцю сведчанняў, і суб'ектыўнымі інтарэсамі інтэрпрэтатараў, і зменлівымі культурнымі ўплывамі, якія ў пэўнай ступені таксама прадвызначаюць, што менавіта здаецца істотным у мінулым кожнаму новаму пакаленню» [2, с. 8].

У кантэксце медыяадукацыі крыніцы гістарычнай інфармацыі можна падзяліць на тры катэгорыі: першасныя, другасныя і трацічныя крыніцы (табл. 3).

*Табліца 3*

**Катэгорыі крыніц інфармацыі**

| Параметры | Першасныя крыніцы | Другасныя крыніцы | Трацічныя крыніцы |
|---|---|---|---|
| **1. Што сабой уяўляюць?** | Арыгінальныя крыніцы: летапісы, хронікі, дагаворы і пагадненні, партыйныя праграмы, адозвы, палітычныя прамовы, мемуары, дзённікі, лісты, фатаграфіі, чарцяжы, дакументальная хроніка, тэкставыя, аўдыя- і відэазапісы ўспамінаў сведкаў падзей, інтэрв'ю | Інтэрпрэтацыі, вынікі аналізу і абагульненняў арыгінальных крыніц: навуковыя артыкулы і манаграфіі, мастацкая літаратура, публіцыстыка, навукова-папулярныя выданні, дакументальнае і мастацкае кіно | Кампіляцыі, якія ўтрымліваюць інфармацыю з першасных і другасных крыніц: базы даных, паказальнікі, храналагічныя табліцы, энцыклапедыі, дапаможнікі, рэфераты, Вікіпедыя |
| **2. Дзе можна знайсці?** | Зборнікі дакументаў, хрэстаматыі, архіўныя, бібліятэчныя і музейныя сховішчы і парталы | Публікацыі ў навуковых, навукова-папулярных перыядычных выданнях, СМІ, кінапаказы | Парталы рэфератаў, энцыклапедычныя даведнікі, Вікіпедыя |
| **Прыклады** | «Мужыцкая праўда», «Лісты з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскага | Дакументальныя і мастацкія фільмы пра К. Каліноўскага | Артыкул у Вікіпедыі «Кастусь Каліноўскі» |

Р. Страдлінг адзначае, што ў вялікай ступені гістарычныя ацэнкі і высновы залежаць ад выбару сведчанняў і доказаў з масіву патэнцыйнай інфармацыі, і таму школьнікаў, якія навучаюцца працаваць з першаснымі і другаснымі крыніцамі, варта вучыць звяртаць увагу на наступнае.

- *Наколькі быў блізкі да падзеі стваральнік гэтай крыніцы? Гэта ўдзельнік, сведка, журналіст, які браў інтэрв'ю ва ўдзельнікаў і ў сведак, газетны фотакарэспандэнт, тэлерэпарцёр, афіцыйны следчы, гісторык-навуковец?*
- *Наколькі хутка пасля назірання падзеі былі зафіксаваныя? Вучні павінны зразумець, што блізкасць да падзеі ў часе і прасторы не служыць неабходнай і дастатковай гарантыяй больш дакладнай і вернай ацэнкі таго, што адбылося [2, с. 6].*

Большасць вучняў атрымлівае гістарычную інфармацыю з другасных і трацічных крыніц, таму настаўніку трэба ведаць асноўныя прынцыпы методыкі працы з інтэрпрэтацыямі, да якіх украінскія даследчыкі А. Памятун і Г. Фрэйман прылічваюць наступныя:

- *гістарычныя інтэрпрэтацыі заўсёды незакончаныя (бо аўтары засяроджваюцца толькі на тым, што ім цікава, прапускаючы ці замоўчваючы іншае);*
- *яны заўсёды аб'ядноўваюць доказы (адабраныя факты) і вынікі аўтарскага ўяўлення (гісторыю часткова знаходзім у крыніцах, а часткова ўяўляем);*

- *на інтэрпрэтацыю заўсёды ўплываюць турботы, патрэбы і пытанні сённяшняга дня, якія афарбоўваюць погляд аўтара на мінулае;*
- *на тлумачэнні, трактоўкі мінулага заўсёды ўплывае ўласны досвед, веды і погляды таго, хто яго апісвае [4, с. 51].*

**Важна**: падчас работы з інтэрпрэтацыямі неабходна засяродзіцца не на так званай слушнасці той ці іншай інтэрпрэтацыі, а на тым, якія факты і якім чынам выкарыстаў інтэрпрэтатар.

У адукацыйным працэсе вялікая роля належыць вучэбным дапаможнікам, і, каб у вучняў выпрацавалася крытычнае стаўленне да любой інфармацыі, неабходна рэгулярна выконваць практыкаванні па аддзяленні фактаў ад меркаванняў і інтэрпрэтацый, працуючы з асноўнымі крыніцамі інфармацыі — школьнымі падручнікамі па гісторыі і грамадазнаўстве.

## ***Практыкаванне «Факты і меркаванні»***

***#медыяспажыванне #факты_і_меркаванні #этыка #індывідуальная_работа***

***Мэта****: удзельнікі навучацца з дапамогай слоў-маркераў вылучаць меркаванні аўтара і аддзяляць іх ад фактаў.*

***Ход практыкавання.*** *Настаўнік раздае вучням матэрыялы з падручнікаў гісторыі ці грамадазнаўства розных гадоў выдання з тэкстамі пра адну падзею (перыяд, персону і інш.). Аўтарства і дата выдання падручнікаў не паведамляюцца. Можа быць арганізавана як індывідуальная, так і групавая работа з тэкстамі (удзельнікі атрымліваюць аднолькавыя матэрыялы).*

***Абсталяванне****: раздатачны матэрыял з фрагментамі тэкстаў пра адну падзею (перыяд, персону і інш.).*

***Заданні***

*1. Уважліва прачытайце тэксты.*

*2. Падкрэсліце прамой лініяй інфармацыю, якая з'яўляецца фактам.*

*3. Падкрэсліце хвалістай лініяй інфармацыю, якая адлюстроўвае меркаванні аўтара.*

***Альтэрнатыўнае выкананне задання.*** *Запоўніце табліцу.*

| № | Факты | Меркаванні / інтэрпрэтацыя | Словы-маркеры |
|---|---|---|---|
| | | | |

***Даведка. Словы-маркеры*** *дапамагаюць распазнаваць наяўнасць у тэксце ацэначнай інфармацыі.* ***Адкрытае меркаванне*** *— па-мойму..., здаецца..., я лічу, што...;* ***схаванае меркаванне*** *— гэта азначае..., кожнаму зразумела..., відавочна... Выкарыстанне якасных прыметнікаў таксама сведчыць аб ацэначнай інфармацыі ў тэксце: стары — малады, карысны — шкодны і г. д.*

***Пытанні да абмеркавання табліцы***

*1. Якая з калонак аказалася больш запоўненай: фактаў ці меркаванняў?*

*2. Што вы прылічылі да фактаў? (Настаўнік удакладняе паняцце «факт».)*

*3. Што вы лічыце меркаваннямі?*

*4. Навошта гэты тэкст быў напісаны? Кім і для каго?*

*5. Якая эмацыйная афарбоўка тэксту? Як, на думку аўтара, вы павінны на яго рэагаваць? Згодныя вы з гэтым?*

*6. Ці можна напісаць гэты тэкст па-іншаму?*

*7. Чые ідэі і перакананні адлюстраваны ў тэксце, а чые праігнараваны?*
*8. Ці не выказвае аўтар прадузятага стаўлення да пэўных груп людзей?* [1, с. 146]

### *Каментарый да практыкавання «Факты і меркаванні»*

Калі навучэнцы бачаць розную інтэрпрэтацыю аднолькавых фактаў ці заўважаюць іх адрозненні (напрыклад, у складзе і колькасці ўдзельнікаў падзей, паўнамоцтвах органаў, умовах іх стварэння і роспуску і г. д.), у іх развіваецца крытычнае стаўленне да інфармацыі і ўзнікае патрэба яе праверкі ў іншых крыніцах. У выніку выканання практыкавання вучні добра разумеюць, што гістарычны працэс можа падавацца па-рознаму (нейтральна або з выкарыстаннем ідэалагічных клішэ, з розных пунктаў гледжання ці выключна ў рэчышчы аднаго падыходу, збалансавана ці тэндэнцыйна).

На праблемна-тэарэтычным узроўні дзейнасці (у X і XI класах) для дасягнення максімальнага эфекту практыкавання — разумення гістарычнага, палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага кантэкстаў — разам з іншымі вучэбнымі дапаможнікамі можна выкарыстоўваць падручнік для вучняў сярэдняй школы «Гісторыя БССР» (аўтары Л. С. Абецэдарскі, М. П. Баранава, Н. Г. Паўлава; пад рэд. П. Т. Петрыкава, выдавецтва «Народная асвета», на рускай мове), які вытрымаў 12 перавыданняў (апошняе ў 1987 г.). Настаўнік можа пры вывучэнні пэўнай тэмы, якая выкладаецца ў сучасных вучэбных дапаможніках, знайсці адпаведны матэрыял для параўнання з гэтым падручнікам. Прапануем прыклад картачкі з выкананнем задання ў тэксце.

### *Факты і меркаванні ў падручніках*

Параўнайце інфармацыю пра Першы Усебеларускі з'езд з розных вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. У якім падручніку інфармацыя падаецца больш нейтральна? Чым адрозніваюцца інтэрпрэтацыі аднолькавых фактаў? У які час былі створаны падручнікі?


Установление Советской власти в Белоруссии происходило в условиях ожесточенной борьбы с эксплуататорскими классами и соглашательскими партиями. Они организовывали заговоры, вооруженные выступления, террористические акты. Против Советской власти выступили белорусские буржуазные националисты. В декабре 1917 г. они вместе с кадетами, меньшевиками и правыми эсерами созвали в Минске так называемый Всебелорусский съезд, который не признал органов Советской власти в Белоруссии. В интересах защиты Советской власти СНК Западной области и фронта 17 декабря 1917 г. объявил съезд распущенным и предложил его президиуму покинуть пределы Белоруссии. Трудящиеся Белоруссии с большим удовлетворением встретили роспуск контрреволюционного кулацко-помещичьего съезда.

***Крыніца**: фота фрагмента с. 156 падручніка для вучняў сярэдняй школы «История БССР» 1987 г. выдання.*

Аддзяленне фактаў ад меркаванняў у любых медыяпаведамленнях мусіць стаць адным з базавых уменняў навучэнцаў, як і пошук і праверка інфармацыі.

Большасць настаўнікаў сустракаліся з наступнай праблемай: падчас пошуку інфармацыі па тэме вучні часта выкарыстоўваюць першы матэрыял, які ім трапіўся ў інтэрнэце, і не клапоцяцца праверыць і прааналізаваць крыніцу. Па меркаванні расійскай даследчыцы К. Якушынай, «нягледзячы на бясспрэчныя станоўчыя моманты, інфармацыя ў інтэрнэце маладакладная і хаатычная, абгрунтаванне розных сцвярджэнняў можа быць некарэктным, інтэрпрэтацыя фактаў скажонай. Яна, у многіх выпадках, уяўляе сабой прадукт індустрыі свядомасці, дзейнасць якой накіравана на маніпуляванне спажыўцамі інфармацыі з палітычнымі, эканамічнымі або іншымі мэтамі» [5]. Таму нельга слепа давяраць інфармацыі, атрыманай з сусветнай сеткі, і найперш вучням неабходна навучыцца ажыццяўляць кантроль дакладнасці. Падчас падрыхтоўкі дамашняга задання — паведамлення па пэўнай тэме ці пра гістарычную асобу — вельмі эфектыўныя ў якасці крытэрыяў для праверкі дакладнасці і надзейнасці крыніцы інфармацыі пытанні для аналізу інфармацыйных паведамленняў (гл. памятку 2 «Праверка сапраўднасці і дакладнасці інфармацыі» на с. 91).

### *Работа з Вікіпедыяй*

Вынікі пошуку якой-небудзь інфармацыі ў інтэрнэце абавязкова ўключаюць адпаведную старонку з Вікіпедыі. Вядома, што пошукава-інфармацыйныя сістэмы адрозніваюцца сваімі алгарытмамі працы з інфармацыяй, але Вікіпедыя ўваходзіць у тройку лідараў вынікаў незалежна ад пошукавіка. На сённяшні дзень самы распаўсюджаны пошукавік у Беларусі — Google, другое месца займае Yandex. Спраўдзіць актуальнасць гэтай інфармацыі дазваляе сэрвіс internet live stats, які анлайн прадстаўляе статыстыку выкарыстання інтэрнэту [3].

«Wiki» ў перакладзе азначае «хуткі», таму Вікіпедыя — гэта «хуткая энцыклапедыя». Вікіпедыя ствараецца добраахвотнікамі з усяго свету на 302 сусветных мовах. Усяго ў ёй прадстаўлена ўжо каля 50 млн артыкулаў. Свабодная энцыклапедыя ўваходзіць у пяцёрку самых папулярных вэб-сайтаў у свеце, але з самага свайго заснавання ў студзені 2001 г. з'яўляецца аб'ектам крытыкі і нападкаў. Прычына ў тым, што практычна кожны чалавек можа зрабіць свой унёсак у энцыклапедычныя артыкулы.

### ***Практыкаванне «Вікіпедыя як крыніца інфармацыі»***

***#пошук_і_збор інфармацыі #медыяспажыванне***
***#стварэнне_медыяпрадукту #групавая_работа***

***Мэта***: *удзельнікі зразумеюць неабходнасць праверкі дакладнасці інфармацыі з розных крыніц і адказнасць стваральнікаў медыятэкстаў.*

***Ход практыкавання.*** *Настаўнік прапануе знайсці ў Вікіпедыі артыкулы, прысвечаныя біяграфіі гістарычнага дзеяча на розных мовах (беларускай, англійскай, рускай, польскай, украінскай і інш.), прачытаць іх, перакласці і абмеркаваць у групах наступныя пытанні.*

- *Ці істотна адрозніваецца змест артыкула пра дзеяча на розных мовах? Чаму?*
- *На якія крыніцы спасылаюцца на старонцы артыкула? Ці шмат сярод іх першакрыніц?*
- *Ці можна выкарыстоўваць Вікіпедыю ў якасці адзінай крыніцы інфармацыі? Чаму?*
- *Плюсам ці мінусам з'яўляецца захаванне Вікіпедыяй інфармацыі пра ўсіх аўтараў, якія ўносілі карэкціроўкі ў артыкул (гл. гісторыю правак артыкула)?*
- *Ці будуць істотна адрознівацца артыкулы пра дзеяча ў розных варыянтах беларускага правапісу (афіцыйны і так званая тарашкевіца)?*
- *Ці трэба вучням ствараць артыкулы ў Вікіпедыі? Чаму? [1, с. 48]*

### *Каментарый да практыкавання «Вікіпедыя як крыніца інфармацыі»*

Параўнанне нават невялікіх фрагментаў вікіартыкулаў пра адну і тую ж гістарычную персону на розных мовах выяўляе даволі значнае адрозненне ў гэтых матэрыялах і стымулюе да праверкі змешчанай інфармацыі, звароту да першакрыніц, зборнікаў дакументаў, энцыклапедычных даведнікаў і г. д. Вельмі карысным таксама з'яўляецца аналіз гісторыі правак артыкула і параўнанне спісаў выкарыстанай літаратуры: ці ёсць там першакрыніцы і навуковыя публікацыі, калі яны былі выдадзены, хто з'яўляецца іх аўтарамі і г. д.

Напрыклад, заданне параўнаць першыя сказы з біяграфічных звестак у артыкулах пра Адама Міцкевіча на розных мовах можа стаць выдатным праблемным полем для вывучэння розных пытанняў айчыннай гісторыі першай паловы XIX ст.

**Адам Міцкевіч у Вікіпедыі**

Чым адрозніваецца інфармацыя пра Адама Міцкевіча ў вікіартыкулах на розных мовах?
Што агульнага ў звестках пра Адама Міцкевіча?

| Мова | Уводная біяграфічная інфармацыя |
|---|---|
| Беларуская | польскі паэт беларускага паходжання, публіцыст (у тым ліку палітычны), асветнік, дзеяч нацыянальна-вызваленчага польскага руху, сябар Таварыства філаматаў |
| Польская | polski poeta, działacz polityczny, publicysta, tłumacz, filozof, działacz religijny, mistyk, organizator i dowódca wojskowy, nauczyciel akademicki |
| Літоўская | Lietuvos ir Lenkijos poetas |
| Руская | польский и белорусский поэт, политический публицист, деятель польского национального движения |

Для эфектыўнай работы з матэрыяламі свабоднай энцыклапедыі трэба ведаць асноўныя правілы Вікіпедыі, асаблівасці яе структуры і функцыянавання [6]. У навучанні рэкамендуецца выкарыстоўваць Вікіпедыю для першаснага азнаямлення з матэрыяламі па пэўнай тэме. Але не варта ўспрымаць яе ў ролі эксперта і спасылацца на Вікіпедыю як на крыніцу. Пасля таго як азнаёміліся з інфармацыяй у Вікіпедыі, неабходна пашукаць больш падрабязныя звесткі, для чаго варта выкарыстоўваць ключавыя словы з вікіартыкула. Настаўніку таксама неабходна звярнуць увагу вучняў на існаванне дзвюх беларускамоўных версій свабоднай энцыклапедыі: Вікіпедыі на афіцыйнай беларускай мове і Вікіпэдыі на «тарашкевіцы» (альтэрнатыўны варыянт правапісу літаратурнай беларускай мовы). Змест артыкулаў гэтых дзвюх версій часта істотна адрозніваецца.

Ігнараваць Вікіпедыю ў навучанні немэтазгодна — Вікіпедыя як глабальны сацыяльны праект з'яўляецца выдатным прыкладам самаарганізацыі грамадства ў медыяінфармацыйным асяроддзі. Адкрытасць свабоднай энцыклапедыі для ўсіх, хто мае доступ да інтэрнэту, і нескладанасць яе рэдагавання дазваляюць прыцягваць школьнікаў старэйшых класаў у якасці стваральнікаў вікіартыкулаў. Гэта дзейнасць спрыяе папулярызацыі навуковых ведаў і з'яўляецца інструментам пашырэння беларускай інфармацыйнай прасторы, выдатнай альтэрнатывай школьным рэфератам і эфектыўным спосабам падрыхтоўкі матываваных адораных навучэнцаў да навукова-практычных канферэнцый і алімпіяд.

Сёння напрацоўкі педагогаў па выкарыстанні Вікіпедыі ў навучанні аформіліся ў асобны кірунак медыяпедагогікі пад назвай «вікідыдактыка», які займаецца пытаннямі выкарыстання wiki ў навучальным працэсе, распрацоўкай і апрабацыяй новых дыдактычных матэрыялаў

з апорай на Вікіпедыю. Дасведчанасць у вікіасяроддзі падвышае ўзровень медыякампетэнтнасці педагога, спрыяе авалоданню навыкамі вывучэння, аналізу, інтэрпрэтацыі тэкстаў, уменнем ствараць самастойны вікіпрадукт [7, с. 208].

Выдатна развіваюць медыяінфармацыйную пісьменнасць навучэнцаў заданні на стварэнне варыянта тэксту (напрыклад, той жа біяграфіі гістарычнай асобы) на аснове некалькіх крыніц інфармацыі. У якасці крытэрыяў поспеху выканання задання разам з патрабаваннямі неабходна пазначыць:

- *стыль напісання артыкула (навуковы ці публіцыстычны);*
- *абмежаванне аб'ёму тэксту (напрыклад, каля 1000–1200 знакаў);*
- *абавязковую наяўнасць спасылак на крыніцы інфармацыі;*
- *унікальнасць тэксту — не менш за 80 %.*

Апошні крытэрый звязаны з тым, што вучні даволі часта «пазычаюць» з публікацый у інтэрнэце кавалкі з розных тэкстаў ці нават увесь тэкст цалкам. Калі настаўнік не звяртае на гэта ўвагі, адбываецца дэфармацыя каштоўнаснай пазіцыі асобы ў медыясферы: фарміруецца непавага да аўтарскіх правоў, парушэнне медыяінфармацыйнай этыкі робіцца паўсядзённай практыкай. Вырашыць гэту важную праблему дапамагае пастаяннае ўдасканальванне ўменняў вучняў працаваць з тэкстамі і выкарыстанне настаўнікам на сістэматычнай аснове сэрвісаў-антыплагіятараў. Праверка ў сістэме «Антыплагіят» паказвае наяўнасць супадзенняў у тэксце (аналагічныя або падобныя фрагменты), асобныя сэрвісы вызначаюць першакрыніцу інфармацыі і параўноўваюць даты публікацый.

Абавязкова трэба засяродзіць увагу вучняў на пытаннях медыяінфармацыйнай бяспекі і нагадваць ім, што інтэрнэт — гэта публічная прастора. Па-першае, любая закрытая інфармацыя можа стаць шырока вядомай. Па-другое, публікацыі ў многіх інтэрнэт-супольнасцях першапачаткова адкрыты для ўсіх карыстальнікаў. Большая частка інфармацыі, апублікаваная ў інтэрнэце:

- *можа быць знойдзена праз пошукавікі;*
- *можа стаць даступнай для вялікай колькасці людзей;*
- *можа быць скапіявана, даслана іншым людзям;*
- *практычна не можа быць выдалена, яна пачынае распаўсюджвацца ў той момант, калі яе ўпершыню публікуюць.*

Прыватнае паведамленне, дасланае звычайнай ці электроннай поштай, застаецца прыватным, пакуль яго не апублікавалі. Пасля яго публікацыі з пэўнай мэтай у газеце ці выкладання скрыншота паведамлення ў сацыяльнай сетцы яно становіцца медыятэкстам — даступным вялікаму мноству людзей.

Сёння існуе шмат публікацый і якасных адукацыйных рэсурсаў, адмыслова прысвечаных медыяінфармацыйнай бяспецы, таму ў дадзеным дапаможніку гэтая праблематыка закранаецца падчас вывучэння спецыфікі асобных медыятэкстаў і асяроддзяў.

**Літаратура і электронныя рэсурсы**


1. Медыяадукацыя ў школе: фарміраванне медыяграматнасці вучняў: дапам. для настаўнікаў / М. І. Запрудскі [і інш.]; пад рэд. М. І. Запрудскага. — Мінск: [б. в.], 2016.
2. *Страдлинг, Р.* Многоаспектный подход в преподавании истории: пособие для учителей / Р. Страдлинг // TANDIS [Электронный ресурс]. — 2015. — Режим доступа: http://tandis.odihr.pl/documents/hre-compendium/rus/CD%20SEC%202%20ENV/PR%20SEC%202/CoE%20Multiperspectivity%20RUS.pdf. — Дата доступа: 03.04.2018.
3. Internet live stats [Electronic resource]. — Mode of access: http://www.internetlivestats.com/. — Date of access: 25.09.2018.
4. *Мороз, П. В.* Дослідницька діяльність учнів в процесі навчання історії України: метод. посіб. / П. В. Мороз. — К.: Пед. думка, 2012.

5. *Якушина, Е. В.* Медиаобразование: как проверить достоверность информации в Интернете / Е. В. Якушина // Медиа. Информация. Коммуникация: междунар. журн. [Электронный ресурс]. — 2013. — № 6. — Режим доступа: http://mic.org.ru/6-nomer-2013/215-mediaobrazovanie-kak-proverit-dostove. — Дата доступа: 28.06.2018.
6. Вітаем у Вікіпедыі: галоўная старонка // Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. — 2018. — Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/. — Дата доступу: 20.08.2018.
7. *Онкович, Г. В.* Вікідидактика: формування і розвиток у системі професійної освіти / Г. В. Онкович, А. Д. Онкович // Вісн. Житом. держ. ун-ту ім. І. Франка. Пед. науки. — К., 2017. — Вип. 2 (88).

## 1.4. Асноўныя метады і прыёмы работы з медыятэкстамі на ўроках

Гісторыкі рэканструююць мінулае на падставе гістарычнай інфармацыі, якую для сучаснікаў захавалі розныя віды сродкаў масавай інфармацыі: газетныя артыкулы, фатаграфіі з месца падзей або кінахроніка. Таму гісторыю (як і грамадазнаўства) можна лічыць ідэальным па сваёй прыродзе вучэбным прадметам для ажыццяўлення мэт медыяадукацыі.

Адзіны спосаб навучыць уменню арыентавацца ў патоку супярэчлівай інфармацыі ў медыя — выпрацаваць звычку задаваць пытанні наконт таго, што мы чытаем, слухаем, глядзім. Рэкламны білборд і афіша меладрамы, дэтэктыў і публіцыстыка, аналітычны артыкул і тэленавіны, тэлесерыял і пост у сацыяльнай сетцы, рэаліці-шоу і відэаблог — гэта прадукты вытворчасці медыя, медыятэксты. Багатую відава-жанравую разнастайнасць медыятэкстаў можна ўсвядоміць дзякуючы схеме «Жанры медыя» (гл. мал. 7). Даследчыкамі распрацавана вялікая колькасць тыпалогій для класіфікацыі медыятэкстаў, але незалежна ад спосабу іх стварэння, відавой і жанравай прыналежнасці, асаблівасцяў уздзеяння на аўдыторыю ўсе медыятэксты аб'ядноўвае наступнае:

- *кожны медыятэкст уяўляе сабой канструкт, г. зн. створаны адмыслова для перадачы **меседжу** (асноўнага пасылу, ключавой ідэі) для пэўнай мэтавай аўдыторы;*
- *кожны меседж ствараецца чалавекам ці групай людзей (арганізацыяй) для дасягнення пэўнай мэты: утрымлівае пэўны пункт гледжання або сістэму каштоўнасцяў, выкарыстоўваецца для атрымання кантролю над думкамі, рашэннямі, выбарам медыяспажыўцоў;*
- *каб вылучыць і зразумець меседж, неабходна прааналізаваць медыятэкст.*

Адзінага падыходу да аналізу медыятэкстаў не выпрацавана, таму засяродзімся на найбольш запатрабаваных гісторыкамі падыходах і алгарытмах аналізу медыятэкстаў. Вяртанне да мадэлі камунікацыі Г. Ласуэла з адпаведнымі пытаннямі да кожнага яе складніка дазваляе лепш зразумець, якім чынам настаўніку трэба пачынаць выбудоўваць работу з медыятэкстамі (табл. 4).

*Табліца 4*

**Формула Г. Ласуэла для аналізу працэсу камунікацыі**

| | | |
|---|---|---|
| **Хто паведамляе?** | камунікатар | аналіз кіравання |
| **Што паведамляе?** | паведамленне | аналіз зместу |
| **Як паведамляе?** | канал перадачы | аналіз сродкаў і каналаў |
| **Каму паведамляе?** | аўдыторыя | аналіз аўдыторыі |
| **З якім эфектам?** | зваротная сувязь | аналіз вынікаў |

Аналіз медыяпаведамлення робіцца асноўным метадам, які выкарыстоўваецца педагогамі незалежна ад віду медыятэкстаў. На думку расійскага медыяпедагога А. В. Фёдарава, «медыяадукацыя — гэта сумесная дзейнасць настаўніка і навучэнца па фарміраванні ў апошняга




*Мал. 7. Жанры медыя*

ўменняў вычэрпваць сэнсы з медыятэксту і ствараць ўласныя сэнсы новых медыятэкстаў на аснове атрыманых ведаў» [1, с. 11]. Настаўнікам мэтазгодна падыходзіць да аналізу медыятэкстаў сістэмна, з веданнем ключавых паняццяў медыяадукацыі, якія вылучылі брытанскія даследчыкі К. Бэзэлгэт і Э. Харт [2, с. 15]. Як бачна з табл. 5, у адпаведнасці з асноўнымі паняццямі медыяадукацыі вылучаецца шэсць блокаў пытанняў для аналізу медыятэкстаў.

Выкарыстанне медыятэкстаў у навучанні гісторыі і грамадазнаўству патрабуе добрага разумення настаўнікамі, што такое медыярэпрэзентацыя. ***Медыярэпрэзентацыя*** — гэта фактычна стварэнне / канструяванне медыя «сваёй» рэальнасці пад свае ідэалогію, мэты, задачы, інтарэсы [4, с. 21]. Пададзенае ў медыя — гэта толькі канструкт рэальнасці, а не сама рэальнасць. Паводле меркавання расійскага даследчыка медыятэкстаў Т. Г. Дабрасклонскай, мадэляванне механізму адлюстравання рэальных падзей сродкамі масавай інфармацыі дазваляе вылучыць тры асноўныя тыпы медыяпрэзентацый, якія ўмоўна можна пазначыць як адлюстраванне, рэканструкцыю, міф. Тып «адлюстраванне» найбольш набліжаны да рэальнасці — гэта навінныя медыятэксты з прамым уключэннем з месца падзей, фрагменты прамоў палітыкаў з абавязковымі спасылкамі на крыніцу інфармацыі, тып «рэканструкцыя» дапускае большую свабоду інтэрпрэтацыі падзей медыя — наяўнасць аналітыкі, каментарыяў, ацэнкі падзей. Найменш набліжаны да рэальнасці, зразумела, тып «міф» — мэтанакіравана створаны вобраз падзеі, далёкі ад рэальнасці, скіраваны на пэўнае ідэалагічнае ўздзеянне [4, с. 20]. Для гісторыка даследаванне палітычных міфаў адкрывае перспектыўныя магчымасці вывучэння калектыўных уяўленняў пра мінулае. Асаблівае пазнавальнае значэнне можа мець не столькі змест, колькі матывы і спосабы іх стварэння, сродкі і формы пашырэння, механізмы дзеяння і значэнне. Вывучэнне сучасных міфаў як важных формаў калектыўнай памяці можа адкрываць шлях да лепшага разумення гістарычнай свядомасці грамадства і механізмаў канструявання яго ідэнтычнасцяў [5].

*Табліца 5*

**Асноўныя паняцці медыяадукацыі
і пытанні для аналізу медыятэкстаў**

| Базавыя паняцці медыяадукацыі | Ключавыя пытанні для аналізу |
|---|---|
| Катэгорыя медыя | • Да якога жанру належыць гэты медыятэкст?<br>• Якія ў яго адметныя асаблівасці? |
| Агенцтва медыя | • Хто аўтар гэтага медыятэксту?<br>• Якую пазіцыю абараняе ці даносіць агенцтва?<br>• Хто, на вашу думку, замовіў гэты медыятэкст? |
| Тэхналогіі медыя | • Якія тэхналогіі выкарыстаны?<br>• Ці з'яўляюцца гэтыя тэхналогіі эфектыўнымі? |
| Мова медыя | • Якія формы медыйнай мовы выкарыстаны?<br>• Якія візуальныя сімвалы і знакі выкарыстаны ў медыятэксце?<br>• Чаму менавіта так паказаны прадметы і галоўныя героі?<br>• Якія стэрэатыпы выкарыстаны ў медыятэксце? |
| Аўдыторыя медыя | • Для якой аўдыторыі створаны гэты медыятэкст?<br>• Якія пачуцці і чаму выклікаў у вас гэты медыятэкст? |
| Рэпрэзентацыя медыя | • Якія сацыяльныя групы або праблемы фігуруюць ў гэтым медыятэксце?<br>• Якія сацыяльныя тэндэнцыі адлюстраваны ў гэтым медыятэксце?<br>• Каму сімпатызуюць аўтары гэтага медыятэксту?<br>• Ці ўтрымлівае гэты медыятэкст схаваны падтэкст, непраўдзівую інфармацыю?<br>• Якія ключавыя эпізоды гэтага медыятэксту? [3, с. 186] |

Уменне «вычэрпваць сэнсы» з медыятэкстаў неабходна таксама для распазнавання і вылучэння сродкаў, якімі карыстаюцца медыя для ўплыву на людзей. Падчас работы з медыятэкстамі вучні зразумеюць магчымасці медыя ўздзейнічаць на людзей праз маніпуляванне інфармацыяй і эмоцыямі, навучацца распазнаваць стэрэатыпы і прадузятасць у медыяасяроддзі, выяўляць фэйкавыя навіны і прапаганду варожасці і шавінізму (табл. 6). Такім чынам, уключэнне работы з медыятэкстамі ў навучанне робіць адукацыйны працэс выключна практыка-арыентаваным.

*Табліца 6*

**Сродкі ўздзеяння і ўплыву медыяпаведамленняў на аўдыторыю**

| Сродкі (азначэнні паняццяў) | Характарыстыка |
|---|---|
| ***Маніпуляцыя*** — схаванае псіхалагічнае ўздзеянне, спосаб камунікацыі, мэта якога — змяніць успрыманне і стаўленне чалавека да пэўных падзей і паўплываць на паводзіны асобы | Выкарыстоўваюцца лагічныя памылкі ў разважаннях, убудаваныя моўныя каманды, няпоўная інфармацыя (выбіраецца толькі патрэбная, іншая замоўчваецца), параўноўваецца непараўнальнае, падмяняюцца паняцці. Пры маніпуляванні масавай свядомасцю найчасцей выкарыстоўваюць вядомы псіхалагічны «трохкрокавы» механізм:<br>• адключыць розум — *ratio* (знізіць крытычнасць мыслення);<br>• выклікаць страх (стварыць пагрозу);<br>• «падчапіць» чалавека на кручок выратавальніка (прапанаваць выйсце) [1, с. 20–22] |
| ***Стэрэатып*** (*шаблон, звычка*) — устойлівыя, спрошчаныя, нават схематычныя ўяўленні людзей пра штонебудзь (сацыяльную групу, падзеі) і адпаведнае стаўленне да гэтай групы, падзеі і г. д. Нярэдка стэрэатып — гэта сінонім састарэлых і прадузятых уяўленняў, звязаных з забабонамі | Магчымасці масмедыя спрыяць стэрэатыпізацыі мыслення амаль неабмежаваныя. Найбольш яскравым прыкладам з'яўляецца засваенне новай інфармацыі. Аўдыторыя атрымлівае хуткае, агульнае ўяўленне пра таго ці іншага чалавека або групу людзей, іх класавую, расавую ці этнічную прыналежнасць, гендар, сацыяльную ролю, прафесію і інш., пры гэтым ствараецца спрошчаная карціна, якая не адпавядае рэальнасці. У выніку адбываецца навешванне ярлыкоў, небяспечна падсілкоўваюцца сацыяльныя забабоны і няроўнасць у грамадстве |
| ***Фэйк*** — слэнгавы тэрмін, які абазначае падробку ці фальсіфікацыю | У дачыненні да сродкаў масавай камунікацыі пад фэйкам разумеюць навіну, якая не мае нічога агульнага з праўдай, падробку навіны, дэзынфармацыю. Фэйкі сталі вельмі распаўсюджанай з'явай сучаснасці. Уменні знаходзіць і выяўляць фэйкавыя навіны — найважнейшыя складнікі медыяінфармацыйнай кампетэнтнасці асобы |
| ***Прапаганда*** (*ад лац. propaganda — тое, што павінна быць распаўсюджана*) — мэтанакіраванае распаўсюджванне ідэй і мадэляў паводзін сярод шырокіх мас насельніцтва | Прапаганда ў сваім першапачатковым значэнні мела нейтральную ці нават станоўчую сэнсавую афарбоўку (распаўсюджванне прагрэсіўных ідэй, асветніцкіх каштоўнасцяў, здаровага ладу жыцця і г. д.). У сучасным грамадстве з характэрнымі для яго так званымі інфармацыйнымі войнамі тэрмін набыў негатыўную афарбоўку з прычыны частага спалучэння прапаганды з маніпуляцыямі і дэзынфармацыяй, дыскрымінацыяй і шавінізмам, стварэннем чорна-белай карціны рэчаіснасці |

Ключавыя пытанні для аналізу медыятэкстаў з максімальным улікам усіх медыяфактараў распрацавалі амерыканскія медыяпедагогі С. Шэйбэ і Ф. Рогаў. Гэтыя пытанні з'яўляюцца асновай сучаснай методыкі работы з медыятэкстамі (гл. табл. 7).

Звяртаем увагу настаўнікаў, што для выкарыстання ў адукацыйным працэсе пытанні неабходна адаптаваць ці змяняць з улікам віду і жанру медыя, узросту і ўзроўню развіцця вучняў і мэт навучання (гл. памятку 3 «Ключавыя пытанні для аналізу медыятэксту» на с. 91). Неабходна дапамагчы маладым людзям выпрацаваць звычку даваць адказы, заснаваныя на фактычных даных, і пастаянна ўдакладняць: «Чаму вы так лічыце? Што вымушае так думаць?» Пытанні дазваляюць прааналізаваць на ўроку ці дома любы медыятэкст: навіну,

*Табліца 7*

**Ключавыя пытанні для аналізу медыятэксту**

| | | |
|---|---|---|
| **Аўтарства & аўдыторыя** | **аўтары** | • Хто гэта зрабіў? |
| | **мэты** | • Навошта гэта было зроблена?<br>• Што хацелі ад чытача аўтары?<br>• Каму адрасавана пасланне і чаму я так думаю? |
| | **эканоміка** | • Хто за гэта заплаціў?<br>• Каму належыць выданне? |
| | **уздзеянне** | • Хто можа атрымаць карысць ад гэтага паслання?<br>• Каму можа быць прычыненая шкода?<br>• Ці карыснае гэта паведамленне для мяне і людзей, падобных да мяне?<br>• Што апавядальнік хоча, каб я запомніў? |
| | **адказ** | • Што я магу зрабіць у адказ на гэта паведамленне? |
| **Паведамленне & значэнне** | **змест** | • Пра што гэтае паведамленне (і што прымушае мяне так думаць)?<br>• Якіх высноў ад мяне хацелі?<br>• Якія ідэі, каштоўнасці, інфармацыя і / ці пункты гледжання даносяцца ці навязваюцца?<br>• Што важнае засталося недасказаным? |
| | **метады** | • Якія тэхнікі данясення інфармацыі выкарыстоўваюцца і чаму?<br>• Як гэтыя тэхнікі суадносяцца з мэтай? |
| | **інтэрпрэтацыя** | • Ці могуць розныя людзі зразумець гэтае паведамленне па-рознаму?<br>• Як я зразумеў(–ла) гэтае паведамленне і што я даведаў(–ла)ся пра сябе, зыходзячы з маёй рэакцыі або тлумачэння? |
| **Рэпрэзентатыўнасць & рэальнасць** | **кантэкст** | • Калі паведамленне было падрыхтавана? Пры якіх абставінах?<br>• Дзе і як распаўсюджана? |
| | **давер** | • Гэта факт, чыёсьці меркаванне, інтэрпрэтацыя ці нешта яшчэ?<br>• Наколькі праўдападобна гэта (і чаму я так думаю)?<br>• Якая крыніца інфармацыі, ідэй або сцвярджэнняў?<br>• Ці можна давяраць гэтай крыніцы? [6, с. 8] |

рэкламу, фільм, газетны артыкул, фота, плакат, гістарычны дакумент, тэкст школьнага падручніка, літаратурны твор. Вучні могуць выконваць аналіз індывідуальна, у форме пісьмовага задання, але калектыўнае «прачытанне», якое выконвае група, лічыцца значна больш эфектыўным. У сумеснай працы ў групе настаўнік накіроўвае працэс аналізу і абмеркавання з дапамогай удакладняльных пытанняў. Калі настаўнік не навязвае сваё бачанне, у групе падчас абмеркавання ключавых пытанняў адбываецца ўзаеманавучанне. Мэта групавога абмеркавання — не дасягненне кансэнсусу ў дачыненні чагосьці канкрэтнага, а, хутчэй, паглыбленне індывідуальнага разумення кожнага ўдзельніка. Суправаджэнне групы вучняў падчас аналізу пэўных медыятэкстаў дазваляе настаўніку ацаніць узровень разумення гістарычнага матэрыялу, стварыць умовы для выпраўлення фактычных памылак, прапанаваць дадатковую інфармацыю па тэме, калі ёсць такая неабходнасць, і выкарыстаць дыдактычны патэнцыял розных тлумачэнняў аднаго і таго ж меседжу. Вучні, якія маюць сталую практыку аналізу і абмеркавання меседжаў медыятэкстаў, добра падрыхтаваныя да сінтэзу інфармацыі з розных крыніц, самастойнага фармулявання вывадаў і абгрунтавання ўласнай пазіцыі.

Вядомы беларускі педагог і папулярызатар медыяадукацыі ў нашай краіне М. І. Запрудскі засяроджваецца на дзеяннях настаўніка па праектаванні вучэбных заняткаў у кантэксце медыяпісьменнасці. Педагогу найперш неабходна ацаніць магчымасці вучэбнага матэрыялу для фарміравання медыяінфармацыйнай пісьменнасці вучняў і з патрабаванняў да вынікаў

вучэбна-пазнавальнай дзейнасці выбраць тое ўменне, якім вучні не валодаюць зусім ці валодаюць недастаткова, але якое можа паспяхова развівацца ў працэсе работы менавіта над запланаваным вучэбным матэрыялам (табл. 8) [7, с. 61–62].

*Табліца 8*

**Праектаванне вучэбных заняткаў з медыя**

| Кампанент урока | Дзейнасць настаўніка |
|---|---|
| Пастаноўка мэты | • вызначэнне медыяінфармацыйных кампетэнцый вучняў |
| Адбор зместу ўрока | • уключэнне матэрыялаў з розных крыніц, магчыма / пажадана з альтэрнатыўнымі поглядамі і спосабамі падачы інфармацыі |
| Планаванне арганізацыі працэсу | • вучэбныя сітуацыі, у якіх вучні атрымліваюць інфармацыю, аналізуюць яе, крытэрыяльна ацэньваюць, выкарыстоўваюць для стварэння сваіх медыятэкстаў |
| Кантроль і ацэнка | • вымярэнне, наколькі павысілася медыякампетэнтнасць вучняў [7, с. 60] |

У педагагічнай літаратуры вылучаюцца наступныя спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці падчас работы з медыятэкстамі паводле таксаноміі Б. Блума (табл. 9).

*Табліца 9*

**Спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці з медыятэкстамі**

| Узровень | Дзейнасць |
|---|---|
| **Рэпрадуктыўны** | • пераказ медыятэксту вучнем непасрэдна пасля прачытання (прагляду) у аўдыторыі або самастойна з мэтай перадачы яго зместу |
| **Асацыятыўны** | • успрыманне медыятэксту праз асабістыя эмоцыі, успаміны, перажыванні |
| **Тлумачальны** | • засяроджанне ўвагі на складаных для разумення момантах медыятэксту, фарміраванне меркаванняў пра медыятэкст у цэлым або пра яго часткі |
| **Аналітычны** | • аналіз структуры медыятэксту, моўных і мастацкіх асаблівасцяў, пунктаў гледжання стваральнікаў і медыяспажыўцоў (крытыкаў, гледачоў), музычнага і гукавога суправаджэння медыятэксту |
| **Класіфікацыйны** | • вызначэнне месца твора ў гістарычным, эканамічным, сацыяльным, палітычным кантэкстах, яго жанру, этычных і эстэтычных нормаў і інш. |
| **Ацэначны** | • выяўленне вучнем вартасцяў медыятэксту на аснове ўласных або прапанаваных крытэрыяў [8, с. 99] |

Работа з медыятэкстамі можа ўключаць наступныя этапы.

1. Уступнае слова вядучага (настаўніка ці загадзя падрыхтаванага вучня). Вядучы дае кароткую інфармацыю пра стваральнікаў медыятэксту:
   - *экранізацыя мастацкага твора: неабходна назваць імёны рэжысёра, сцэнарыста, акцёраў, кампазітара і нацэліць вучняў на ўспрыманне літаратурнага твора аўтарамі фільма;*
   - *публіцыстычны медыятэкст: асвятліць гісторыка-палітычны ці сацыяльны кантэкст падзей (для больш прадуктыўнага паглыблення вучняў у закранутыя аўтарам праблемы);*
   - *інфармацыйны медыятэкст (тэле-, радыёвыпуск): неабходна звярнуць увагу на крыніцу інфармацыі, яе аргументаванасць (навучэнцы павінны вызначыць галоўную і другарадную інфармацыю, разабрацца ў яе «тыповасці», «аўтарытэтнасці», праўдзівасці і памылковасці).*
2. Калектыўнае абмеркаванне медыятэксту або яго фрагмента з мэтай паглыблення ў аўтарскае бачанне праз падзел медыятэксту на буйныя сюжэтныя блокі. Абмяркоўваецца тэма і ідэя медыятэксту, яго праблематыка, сістэма вобразаў, кампазіцыйныя асаблівасці медыятэксту: пейзаж, партрэт праз буйны план, інтэр’ер і г. д.).

3. Выяўленне ступені ўздзеяння медыятэксту на аўдыторыю праз аналіз эпізодаў, якія выклікалі яркі эмацыйны водгук.
4. Абгрунтаванне асабістага стаўлення кожнага вучня да той ці іншай пазіцыі стваральніка медыятэксту і адлюстраванне яго ў творчай працы (водгук, эсэ, рэцэнзія).
5. Абмеркаванне розных пунктаў гледжання прафесіяналаў на дадзены медыятэкст [8].

Напрыканцы звяртаем увагу на пытанні ацэньвання ўзроўню сфарміраванасці медыяінфармацыйных кампетэнцый вучняў. Планаваныя метапрадметныя і прадметныя вынікі засваення вучнямі зместу адукацыі па вучэбных прадметах «Гісторыя Беларусі», «Сусветная гісторыя» і «Грамадазнаўства» вызначаны вучэбнымі праграмамі ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту і з'яўляюцца крытэрыяльнай асновай для ацэнкі вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў. Ацэнка метапрадметных вынікаў (у тым ліку медыяінфармацыйных кампетэнцый) адбываецца ў ходзе вырашэння праблем і задач творчага і пошукавага характару, навучальнага праектавання, тэматычнага кантролю, маніторынгу сфарміраванасці асноўных навучальных дзеянняў. У якасці прыкладу заданняў з выкарыстаннем некалькіх крыніц інфармацыі і каментарыяў для настаўніка па ацэньванні ўзроўню сфарміраванасці медыяінфармацыйных кампетэнцый прапануем распрацоўку тэмы «Тэмперамент і характар чалавека» па грамадазнаўстве для 9 класа (гл. дадатак «Кампетэнтнасна арыентаваныя заданні» на с. 94).

**Літаратура і электронныя рэсурсы**


1. *Федоров, А. В.* Медиаобразование и медиаграмотность / А. В. Федоров. — Таганрог: Кучма, 2004.
2. Медіаосвіта та медіаграмотність: підруч. для студентів пед. коледжів / ред.-упор. В. Ф. Іванов, О. В. Волошенюк; за наук. ред. В. В. Різуна. — К.: Центр віл. преси, 2014.
3. Основи медіаграмостності: навч.-метод. посіб. для вчителя 8(9) клас. Плани-конспекти уроків / за ред. В. Ф. Іванова, О. В. Волошенюк, О. П. Мокрогуза. — К.: Акад. укр. преси: Центр віл. преси, 2014.
4. *Добросклонская, Т. Г.* Методология анализа медиатекстов в условиях конвергентных СМИ / Т. Г. Добросклонская // Развитие русскоязычного медиапространства: коммуникационные и этические проблемы: материалы науч.-практ. конф., 26–27 апр. 2013 г. — М.: АПК и ППРО, 2013.
5. *Сагановіч, Г.* Палітычны міф у гістарычнай памяці і гісторыяпісанні / Г. Сагановіч // Беларускі Гістарычны Агляд: навук. часоп.: інтэрнэт-версія [Электронны рэсурс]. — 2018. — Рэжым доступу: http://www.belhistory.eu/genadz-saganovich-palitychny-mif-u-gistarychnaj-pamyaci-i-gistoryyapisanni/. — Дата доступу: 16.09.2018.
6. *Шейбе, С.* Медіаграмотність: критичне мислення у мультимедійному світі: підруч. для вчителя / С. Шейбе, Ф. Рогоу; пер. з англ. С. Дьома; за загал. ред. В. Ф. Іванова, О. В. Волошенюк. — К.: Центр віл. преси, Акад. укр. преси, 2014.
7. *Запрудскі, М.* Аб праектаванні ўрока, скіраванага на фарміраванне медыйнай кампетэнтнасці вучняў / М. Запрудскі // Медыяадукацыя ў сучаснай школе: зб. навук.-метад. арт. / Т. Ваврава [і інш.]; пад навук. рэд. М. І. Запрудскага. — Мінск, 2016.
8. *Столбова, Я. Е.* Особенности работы с медиатекстами в школе // Научная электронная библиотека «Киберленинка» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/v/osobennosti-raboty-s-mediatekstom-v-shkole. — Дата доступа: 15.09.2018.

# Частка 2

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА РАБОЦЕ З МЕДЫЯТЭКСТАМІ НА ЎРОКАХ ГІСТОРЫІ І ГРАМАДАЗНАЎСТВА

У гэтым раздзеле дапаможніка мы засяродзімся на працы з запатрабаванымі на ўроках гісторыі і грамадазнаўства медыятэкстамі (гл. мал. 8). Пачнём з пытанняў для аналізу статычных візуальных медыятэкстаў (фатаграфіі, карыкатуры, плаката, інфаграфікі), потым засяродзімся не толькі на выявах, але і на гуках і руху — аўдыявізуальных медыятэкстах (фільмы, анімацыя, відэаролікі). Пасля гэтага мэтазгодна перайсці да аналізу навінных (тэленавіны, артыкул у газеце) і рэкламных (вірусны ролік, білборд, плакат, афіша, флаер) медыятэкстаў, якія фарміруюць інфармацыйны парадак дня і стымулююць медыяспажыванне. Напрыканцы разгледзім асаблівасці новых медыя і характарыстыкі асяроддзя сацыяльных сетак для навучання.

### 2.1. Візуальныя медыятэксты: фатаграфія, карыкатура, плакат, інфаграфіка

Успрыманне і аналіз статычных візуальных медыятэкстаў асабліва актуальныя з прычыны таго, што «візуал спажываецца і выпрацоўваецца хутка, дамінуе ў медыя, транслюецца паўсюль у эпоху глабалізацыі» [1]. Можна вылучыць два асноўныя этапы аналізу любых візуальных медыятэкстаў (табл. 10).

*Табліца 10*

**Аналіз візуальных медыятэкстаў**

| Этап | Характарыстыка |
|---|---|
| **Апісанне** (што, колькі, кампазіцыя, колер, план, ракурс) | Апісанне павінна быць вельмі падрабязным. Вучні адказваюць на наступныя пытанні.<br>• Што мы бачым на пярэднім плане, што на заднім?<br>• Што справа, што злева?<br>• Якія колеры, формы, лініі?<br>• Дэтальна апісваюцца выявы людзей (колькасць, узрост, адзенне, стаўленне адно да аднаго, рухаюцца ці стаяць і г. д.) |
| **Інтэрпрэтацыя** (сітуацыя, сюжэт, пазіцыя аўтара, кантэкст) | Вучні адказваюць на наступныя пытанні.<br>• Хто гэтыя людзі?<br>• Што адбываецца?<br>• Якая пазіцыя аўтара?<br>• Па якіх сімвалах і стэрэатыпах мы можам вызначыць сацыяльную ці нацыянальную прыналежнасць людзей на фота? Ці ёсць подпіс да выявы? Як суадносяцца выява і подпіс? [2, с. 121] |




*Мал. 8. Медыятэксты па гісторыі і грамадазнаўстве*

## *1 фота > 1000 слоў?*

Сёння з цяжкасцю можна ўявіць сабе свет без **фатаграфій**. Яны з'яўляюцца не толькі істотнай крыніцай інфармацыі, але і важным складнікам культуры. Карціны і фатаграфіі ў значнай ступені ўплываюць на нашу паўсядзённую рэальнасць, значыць, іх «чытанне» (аналіз) цяпер уяўляе сабой такую ж важную кампетэнцыю, як і чытанне звычайных тэкстаў. Таму мы павінны надаваць рабоце з фатаграфіяй асаблівую ўвагу і ў навучанні.

Фатаграфія — гэта форма мастацкага выказвання, якая патэнцыйна найбольш даступная навучэнцам: сёння стварэнне фатаграфіі не выклікае цяжкасцяў. Дзякуючы развіццю фотатэхнікі (фотакамеры сталі звычайным складнікам мабільных тэлефонаў) фатаграфаванне, па сутнасці, становіцца паўсядзённай з'явай. Напрыклад, фатаграфіі адыгрываюць важную ролю ў самапрэзентацыі ўва ўсіх сацыяльных сетках.

### *Мэты адукацыі ў галіне фатаграфіі*

- *Даць вучням зразумець, што фатаграфіі не з'яўляюцца сапраўднай выявай рэальнасці;*
- *важную ролю мае не толькі суб'ектыўны погляд фатографа, але і кантэкст, у якім мы разглядаем фатаграфіі;*
- *фатаграфія з'яўляецца лёгкай мішэнню для маніпуляцый — вядомыя прыклады рэтушы і апрацоўкі фотаздымкаў, для якіх сёння дастаткова мець толькі патрэбную камп'ютарную праграму ці адпаведны анлайн-сэрвіс;*
- *як і любы іншы медыятэкст, фатаграфія нясе пэўны пасыл, які трэба аналізаваць.*

Фатаграфія з'яўляецца вельмі важнай крыніцай і для гістарычнай навукі, і для адукацыі. Работа з фотаздымкамі пры навучанні гісторыі мусіць, у першую чаргу, развіваць крытычнае мысленне вучняў, а не проста ажыўляць урок ці трапна ілюстраваць лекцыю настаўніка. Настаўнік павінен падводзіць вучняў да пастаноўкі пытанняў, вучыць крытычна дыстанцыявацца ад матэрыялу, ісці ад простых выяў да фотаздымкаў, што адлюстроўваюць складаныя праблемы.

*Табліца 11*

**Аналіз фотаздымка**

| Этап аналізу | Пытанні і практыкаванні |
|---|---|
| *Апісанне*: дакладна апішыце, што вы бачыце (на гэтай стадыі не трэба імкнуцца будаваць здагадкі пра тое, што вы бачыце) | • Апішыце асоб, якіх вы бачыце на фота, а таксама іх дзеянні і / або аб'екты, паказаныя на здымку.<br>• Як згрупаваныя людзі і / або аб'екты?<br>• Апішыце, што вы бачыце на заднім плане, на пярэднім плане, у цэнтры, з левага і правага боку фатаграфіі |
| *Інтэрпрэтацыя, доказы* Чаму вы так думаеце? Якія сродкі выкарыстоўвае аўтар? | • Што, на вашу думку, адбываецца на гэтым фотаздымку?<br>• Хто гэтыя людзі? Чым яны займаюцца? Якія гэта аб'екты?<br>• Прыкладна адкажыце, калі, на вашу думку, быў зроблены здымак (год, перыяд, падзеі).<br>• Ці змяшчаецца на фота тэкставая інфармацыя: плакаты, рэклама, подпісы?<br>• Гэта пастановачнае фота? Людзі пазіравалі перад фотакамерай?<br>• Чаму менавіта ў гэтым месцы і менавіта ў гэты час з'явіўся чалавек з фотаапаратам?<br>• На якія пытанні фатаграфія не можа адказаць? Якая інфармацыя адсутнічае? |
| *Дадатковыя пытанні, рэфлексія* | • Ці дапамаглі вам пры выкананні практыкавання вашы веды па гісторыі?<br>• Што ў вас выклікала цяжкасці? Чаму? [3, с. 150] |

Адным са спосабаў уключэння фатаграфіі ў больш шырокі гістарычны кантэкст з'яўляецца ***работа з сямейным фотаальбомам***. Вучні могуць у якасці хатняга задання праглядзець сямейны фотаальбом, абмеркаваць фота з сям'ёй, задаўшы пытанні: хто сфатаграфаваны, калі і дзе было зроблена пэўнае фота. На аснове сямейных фотаздымкаў вучань атрымае ўяўленне аб змене сваёй сям'і ў часе, будзе развіваць сваю канцэпцыю мінулага. Фатаграфія становіцца важным сведкам так званай малой гісторыі, гісторыі сям'і і паўсядзённасці, якая ўключаецца ў кантэкст «вялікай» гісторыі.

Заданні па апрацоўцы і захаванні вучнямі старых папяровых фатаграфій сваёй сям'і ў лічбавым фармаце з'яўляюцца эфектыўным першым крокам для «ўцягвання» вучняў у даследчую працу з фатаграфіяй.

***Фота з сямейнага архіва***

*Як вы думаеце, калі зроблена гэта фота? Дзе зроблена фота? Хто на фота? Чаму вы так думаеце?*




***Каментарый для настаўніка**: на фота скрыншоты экрана смартфона, па якіх можна прасачыць стадыі апрацоўкі фота папяровай фатаграфіі з сямейнага альбома для захавання яе ў лічбавым фармаце. Арыгінальнае фота зроблена падчас дэманстрацыі 7 лістапада 1968 г. у Мінску каля кінатэатра «Зорка» (сёння «Кастрычнік»).*

***Крыніца фота**: архіў С. Кудраўцавай*

Мэтазгодна арганізоўваць працу з сямейным альбомам як праектную дзейнасць. Напрыклад, складанне фотарадаводу сям'і ўключае наступныя этапы:

- *пошук у сямейным альбоме — адбор і паспартызацыя фота (хто, калі, дзе сфатаграфаваны);*
- *апрацоўка і захаванне старых папяровых фота — перавод іх у лічбавы фармат з дапамогай розных фотасэрвісаў (выкарыстанне фотакамеры ў смартфоне, мабільных дадаткаў і воблачных сэрвісаў);*

- *сістэматызацыя — сарціроўка ў храналагічным парадку, вызначэнне сувязяў (каранёў і галінак сямейнага дрэва).*

Яшчэ адну магчымасць работы з фатаграфіяй у навучанні ўяўляюць так званыя ***пары фотаздымкаў***. Гаворка ідзе пра два здымкі, зробленыя ў адным і тым жа месцы, але ў розны час (часцей за ўсё выкананыя раней фатаграфіі гістарычных месцаў супрацьпастаўляюцца сучасным). Пары фотаздымкаў выдатна дэманструюць вучням змены месца (прасторы) у часе.

***Пара фотаздымкаў***

*Каму быў прысвечаны помнік, які прастаяў на мінскай плошчы з 1952 па 1961 г.? У сувязі з чым яго дэмантавалі? Як выглядае сучасная плошча?*





***Каментарый для настаўніка****: пара фатаграфій Кастрычніцкай (да 1948 г. Цэнтральнай) плошчы ў Мінску. На фота злева — помнік І. Сталіну.*
***Крыніца фота****: http://minsk-old-new.com*

Вучні могуць ствараць пары фатаграфій і самастойна. Гэта робіць відавочнымі магчымасці фатаграфіі ў працэсе пазнання. Навучэнец мусіць уважліва шукаць той жа пункт агляду, адлюстраваны на старым фота (але ўсё адно новы здымак ніколі не будзе аднолькавым з папярэднім). Акрамя змены прасторы ў часе гэтым практыкаваннем дэманструецца і суб’ектыўнасць пры фатаграфаванні.

Калаж з фота, якія ілюструюць змены аднаго і таго ж месца ў часе, можна выкарыстаць як гістарычную задачу ці ключавое пытанне да ўрока. Рашэнне задачы немагчымае без уважлівага вывучэння фота і працы з іншымі гістарычнымі крыніцамі (картамі, малюнкамі, карцінамі, архіўнымі матэрыяламі і інш.). Па сутнасці, тут патрабуецца работа са зрэзам прасторы ў часе — аналіз гістарычна-культурнага ландшафту, які адлюстроўвае дзейнасць чалавека і змены ў грамадстве. Звяртаць увагу трэба не столькі на архітэктурны стыль пэўнай забудовы, колькі на змены стаўлення грамадства да гэтага месца і яго функцый у грамадскай прасторы.

Добрыя вынікі для разумення навучэнцамі гістарычна-культурнага ландшафту і праблематыкі мемарыялізацыі як калектыўнай гістарычнай памяці дае работа з фота помніка. Здымак лепш адбіраць добрай якасці і вялікага памеру, каб мець магчымасць працаваць з надпісамі і разглядзець дэталі.

### Фотакалаж як гістарычная задача

*Паглядзіце на калаж з чатырох гістарычных фота аднаго і таго ж месца ў Мінску. Ці пазналі вы гэта месца і пабудову? Якое фота было зроблена першым, якое — сучаснае? Як і чаму змянілася аблічча горада?*




***Каментарый для настаўніка**: калаж з фатаграфій архікафедральнага касцёла імя Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мінску розных часоў. Працуючы з гэтымі фота, вучні не толькі адзначаць знікненне вежаў з будынка і са здзіўленнем прачытаюць надпіс над уваходам «TAEKWONDO», але асэнсуюць драматычныя падзеі ў гісторыі гэтага храма і ўсяго грамадства.*

***Крыніца фота**: http://minsk-old-new.com*

Працуючы з фота, неабходна мець на ўвазе яго ўключанасць у медыя: мы амаль ніколі не сустракаем фота паасобку — гэта ілюстрацыя ў газетным артыкуле, у выпуску тэленавін, у паведамленні ў сацыяльнай сетцы. Таму неабходна вучыць працаваць з фота з улікам гэтай акалічнасці, каб зразумець, як яно «працуе» ў медыя. Больш падрабязна на гэтых аспектах можна засяродзіцца, выконваючы практыкаванне «Помнік як навіна». Для распрацоўкі практыкавання выкарыстаны дыдактычныя матэрыялы чэшскіх медыяпедагогаў Т. Ваўравай і Ч. Пыхі па рабоце з помнікам [4, с. 29].

## *Практыкаванне «Помнік як навіна»*

***#аналіз_медыятэксту #мазгавы_штурм #праца_ў_парах #праца_ў_групах #медыяспажыванне #навінная_пісьменнасць***

***Мэта****: удзельнікі зразумеюць прычыны адрозненняў медыярэпрэзентацый адной падзеі.*

***Абсталяванне****: фатаграфія помніка, які нядаўна адкрылі, скрыншоты публікацый пра адкрыццё помніка ў розных выданнях (асобна толькі загалоўкі і публікацыя цалкам разам з загалоўкам).*

***Ход практыкавання.*** *Удзельнікі працуюць з помнікам як з актуальнай навіной: аналізуюць фота помніка па ключавых пытаннях, параўноўваюць загалоўкі публікацый пра адкрыццё помніка ў розных выданнях і тлумачаць асноўныя ідэі, пасылы гэтых загалоўкаў.*

***Этапы практыкавання***

***1. Мазгавы штурм.***

*Настаўнік паказвае фота новага помніка і прапануе вучням даць яму сваю назву. Асабліва цікава, калі ўдзельнікі бачаць манумент упершыню і нічога пра яго не ведаюць. Усе ідэі запісваюцца на дошцы.*

***2. Праца ў парах. Абмен меркаваннямі па наступных пытаннях.***

*1. Каму ўстаноўлены гэты помнік? Пра што нам сведчаць дэталі, сімвалы, адзенне?*

*2. Якую гісторыю распавядае помнік?*

*3. Хто і пра што павінен успамінаць на гэтым месцы?*

*4. Якія каштоўнасці транслюе помнік? Ці адпавядае гэта вашым каштоўнасцям і ўстаноўкам?*

*5. Якую функцыю мае помнік у грамадскай прасторы?*

*6. Ці дазволілі б вы ўсталяваць гэты помнік, каб былі мэрам горада? Чаму?*

***3. Кароткая інфармацыя настаўніка пра помнік (назва помніка, дзе і калі ён устаноўлены і хто з'яўляецца ініцыятарам мемарыялізацыі).***

***4. Групавая праца з загалоўкамі публікацый пра адкрыццё гэтага помніка.***

*Кожная група атрымлівае аднолькавыя наборы выразак загалоўкаў і назваў выданняў, у якіх матэрыялы былі апублікаваныя. Удзельнікі суадносяць загаловак і выданне, дзе апублікаваныя матэрыялы, тлумачаць сваё меркаванне. Вынікі працы групы афармляюцца на асобным аркушы як калаж.*

***5. Абмеркаванне вынікаў групавой працы.***

*Удзельнікі параўноўваюць калажы, вылучаюць супадзенні і адрозненні, выслухоўваюць каментары адно аднаго. Трэнер раздае групам пакеты скрыншотаў публікацый і праводзіць іх выніковае абмеркаванне.*

***Па якіх прычынах адрозніваліся асноўныя пасылы (меседжы) паведамленняў пра ўсталяванне помніка (аўдыторыя і ўласнік медыя, жанр і інш.)?***

*Напрыканцы ўдзельнікі выказваюць сваё меркаванне пра праведзеную работу, заканчваючы адзін з прапанаваных настаўнікам сказаў.*

- *Я сёння быў здзіўлены тым, што…*
- *Я быў усцешаны, бо…*
- *Я быў засмучаны…*
- *Я хачу сказаць…*

Пасля выканання гэтага практыкавання настаўнік карэктуе не толькі сваю дзейнасць па працы з фотаздымкамі як медыятэкстамі, але і свае захады па фарміраванні навіннай пісьменнасці вучняў.

### *Помнікі на фота*

*Ці можаце вы адразу назваць горад ці краіну, дзе стаіць той ці іншы помнік гэтаму чалавеку? Калі былі пастаўлены гэтыя помнікі? Чым помнікі адрозніваюцца і ў чым, наадварот, падобныя? Ці можна меркаваць праз іх пра асаблівасці лакальнай памяці?*



***Каментарый для настаўніка**: калаж з фота помнікаў Тадэвушу Касцюшку ў розных краінах (Беларусі, Польшчы, ЗША, Швейцарыі).*
***Крыніца фота**: інтэрнэт-рэсурсы*

Найноўшы час багаты на фатаграфіі, якія называюць культавымі. Такія здымкі ведаюць усе — многія з іх маюць насычаную гісторыю, узнагароджваюцца прэміямі, рэгулярна ўключаюцца ў якасці ілюстрацый у падручнікі.

Культавыя фатаграфіі не павінны выкарыстоўвацца пры навучанні ў якасці простай ілюстрацыі да апавядання. Грамадская значнасць гэтых здымкаў сведчыць пра стан соцыуму пэўнага часу.

**Пытанні да культавага фота**

- *Чаму гэты фотаздымак выклікаў такі водгук?*
- *Па якой прычыне ён выключны, чым адрозніваецца ад іншых, менш вядомых, фатаграфій?*
- *Ці ўтрымліваецца ў культавых фотаздымках нейкі адмысловы сімвалічны «код»?*
- *Ці стала фота вядомым у тым выглядзе, у якім было зроблена? Чаму?*
- *Варта звяртаць увагу на эмоцыі — культавыя фатаграфіі часцяком вельмі эмацыйна насычаныя. Мы мусім захоўваць крытычную дыстанцыю ад гэтых эмоцый і ў той жа час не павінны недаацэньваць іх значэнне.*

## *Культавае фота Эйнштэйна*

*На якім фота (арыгінале ці фрагменце) асоба Эйнштэйна больш адпавядае свайму звыкламу медыявобразу? У якіх абставінах магло быць зроблена гэта фота? Чаму быў апублікаваны менавіта фрагмент фота? Пад якім загалоўкам гэты здымак мог з'явіцца ў газетнай публікацыі? Якую рэакцыю выклікала гэта публікацыя ў грамадстве?*







SOOLS VESTONS PANTALONS

France-soir

Notre EUROPE

6e DERNIÈRE

# GRÈVE : TRANSPORTS AMELIORÉS

## Cars de remplacement : plus fréquents

METRO : 11 lignes en service réduit

BUS: aucun trafic

Une certaine agitation se manifeste dans divers autres services publics, où des débrayages de courte durée pourraient avoir lieu lundi

La "MARTINE CAROL" ESPAGNOLE A ÉTÉ PRÉSENTÉE HIER AU TOUT-PARIS

EINSTEIN TIRE LA LANGUE POUR SES 72 ANS

Cet après-midi COURSES A SAINT-CLOUD

Huguette et Andrée avaient préparé soigneusement leur fugue

FRANCO NOMME UN GÉNÉRAL COMME GOUVERNEUR CIVIL A BARCELONE

## J. B. Carlin qui traversa l'Atlantique en jeep, a rencontré Allcard, le navigateur solitaire à Casablanca

Les deux extraordinaires marins envisagent de faire route ensemble jusqu'à Gibraltar

LE 38e PARALLÈLE A L'ORDRE DU JOUR

Les U.S.A. vont annoncer que les troupes de l'O.N.U. n'entreront pas en Corée du Nord

ZOO CIRCUS

PARADE 1951

TEMPÉRATURE

Maximum : 15

AUTEUIL ET LE PRINTEMPS

LES POTINS DE LA COMMÈRE par Carmen TESSIER

il exige

PRIMIOR

c'est un vin souple

**Каментарый для настаўніка.** *Знакамітае фота Альберта Эйнштэйна разам з іншымі было зроблена 14 сакавіка 1951 г. журналістам А. Сасам амаль выпадкова. Здымак шырока распаўсюдзіўся ў прэсе пад рознымі загалоўкамі і выклікаў неадназначную рэакцыю грамадства.*

***Крыніца інфармацыі і фота**: https://www.nouvelobs.com/photo/20160804.OBS5841/mais-pourquoi-einstein-tire-t-il-la-langue.html*

## ***Фотарэтуш ці «карэкціроўка» рэальнасці?***










***Каментарый для настаўніка.*** Фота № 1 — арыгінал здымка 1929 г. На ім дзевяць пісьменнікаў і дзеячаў культуры.

У ніжнім шэрагу злева направа: Змітрок Бядуля, Ян Райніс, Янка Купала, Кандрат Крапіва.

У верхнім шэрагу злева направа: Язэп Пушча, Адам Бабарэка, Уладзімір Дубоўка, Пятро Глебка, Кузьма Чорны.

Пасля карэкцыі (гл. фота № 2) з фотаздымка «знік» Адам Бабарэка. На яго месца перасунулі Язэпа Пушчу. Адам Бабарэка быў сярод арыштаваных у ліпені 1930 г., асуджаны і высланы ў 1931 г., паўторна арыштаваны ў 1937 годзе (памёр у лагеры ў 1938 г., рэабілітаваны ў 1957 г.). У пазнейшых публікацыях на фота засталіся толькі шэсць пісьменнікаў (гл. фота № 3). Параўнанне з арыгіналам здымка паказвае, што на ім няма Адама Бабарэкі, Язэпа Пушчы і Уладзіміра Дубоўкі. Уладзімір Дубоўка і Язэп Пушча правялі ў ссылках некалькі дзесяцігоддзяў і дажылі да сваёй рэабілітацыі ў 1957 г.

Рэкамендуецца для работы на ўроку знайсці адрэтушаваныя здымкі без вылучэння зніклых з фота дзеячаў (пажадана, каб вучні працавалі самастойна).

***Крыніца фота***: *Инанец С. Остались шестеро из девяти. Как репрессированных писателей вычеркивали с групповых фотографий (https://news.tut.by/society/565347.html)*

Спецыялістам добра вядома, што фота даволі часта з'яўляюцца сродкам для маніпуляцыі грамадскай свядомасцю і інструментам прапаганды. На ўроках гісторыі можна прасачыць, як з фота для публікацыі іх у прэсе знікалі не толькі нейкія надпісы, дэталі, але і пэўныя асобы — непажаданыя ў пэўны час персоны, якія сталі апанентамі ўлады, «ворагамі народа».

Для арганізацыі працы па праблемным пытанні «Фотарэтуш або "карэкціроўка" рэальнасці?» настаўніку неабходна адабраць матэрыялы, якія маюць высокую значнасць для разумення гістарычнай эпохі і добры патэнцыял для работы з **фотаманіпуляцыямі**.

На ўроках па айчыннай гісторыі рэкамендуецца звярнуць увагу на матэрыялы выставы «Страчаныя абліччы» ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы і публікацыі пра гэты мемарыяльны праект, прысвечаны трагічным падзеям айчыннай гісторыі — палітычным рэпрэсіям 20–50-х гг. XX ст. [5]. Дапамогуць у гэтым фотаздымкі са слядамі фотаманіпуляцый з архіваў беларускіх музеяў. Выдатным фотакейсам могуць стаць наступныя матэрыялы са зменамі аднаго фота, якое зазнала віртуозныя рэтуш і мантаж.

Як бачна, на ўроках гісторыі мы шмат працуем з фота гістарычных дзеячаў, але настаўніку не трэба засяроджвацца толькі на вядомых персаналіях. Мэтазгодна працаваць і са «звычайнымі» фота і вучыць ставіць да іх пытанні. Падчас аналізу фотаздымкаў неабходна карыстацца наступнай формулай: «Апроч таго, **ШТО** паказана на здымку, трэба ўбачыць, **ЯК** гэта паказана, **ЧАМУ** менавіта так і што **НЕ** паказана».

Каб выпрацаваць у вучняў навыкі «прачытання» фота, настаўніку неабходна стварыць падборку не толькі адпаведных фота, але і практыкаванняў з неабходнымі пытаннямі. Прапануем заданне, распрацаванае на аснове матэрыялаў чэшскага настаўніка гісторыі П. Мартыноўскага [6].

***Матэрыялы для практыкавання «Роля ў канфлікце»***



**Пытанні да фота**

- *Хто гэтыя людзі?*
- *Як яны апранутыя і чаму?*
- *Якія рысы характару вы б ім прыпісалі?*
- *Якая роля дадзеных асоб на фота?*
- *Што б вы пра іх сказалі? Якія пачуцці яны ў вас выклікаюць?*
- *Хто з іх ахвяра, а хто агрэсар?*

***Крыніца фота і матэрыялаў**:*
*П. Мартыноўскі*

***Каментарый для настаўніка.*** *Сапраўдным шокам для навучэнцаў становіцца інфармацыя, што за прывабным абліччам дзяўчыны на фота хаваецца турэмная наглядчыца, якая вылучалася жорсткімі катаваннямі зняволеных у канцлагеры.*

## *Практыкаванне «Роля ў канфлікце»*

***#аналіз_медыятэксту #праца_ў_парах #медыяспажыванне #навінная_пісьменнасць #праблемная_сітуацыя***

***Мэта***: *удзельнікі ўсвядомяць, што нельга рабіць высновы на падставе недастатковай інфармацыі на фота — неабходна шукаць дадатковыя крыніцы, абавязкова правяраць інфармацыю.*

***Абсталяванне***: *раздрукаваныя фота ці фотаслайды на экране (праектар, камп'ютар). Мэтазгодна выкарыстоўваць незнаёмыя вучням фота.*

***Ход практыкавання.*** *Адказваючы на пытанні па персаналіях, адлюстраваных на фота, вучні робяць высновы адносна статусу, ролі людзей у падзеях ці сітуацыі на фота. Пасля адбываецца параўнанне з інфармацыяй настаўніка і яе абмеркаванне.*

***Этапы***

***1. Работа з фота ў парах.*** *Вучні разглядаюць здымкі, адказваюць на пытанні па персаналіях і вырашаюць, хто адлюстраваны на фота:*

- *ахвяра;*
- *агрэсар (злачынца, ліхадзей);*
- *абыякавыя асобы (маўклівая большасць);*
- *памочнік (што азначае дапамагаць; каму дапамагае; як дапамагае; чый гэта памочнік).*

*Абмяркоўваючы выразы твараў, позы, адзенне, рухі людзей на фота, вучні робяць высновы адносна іх ролі ў падзеях, статусу ў грамадстве і інш.*

***2. Інфармацыя настаўніка.*** *Настаўнік распавядае пра людзей на фота (інфармацыя, хутчэй за ўсё, супярэчыць высновам навучэнцаў).*

***3. Праца ў групах.*** *Абмеркаванне інфармацыі настаўніка пра персоны на фота і фармуляванне правілаў «чытання» фота. Групы параўноўваюць свае распрацаваныя правілы. Важным вынікам з'яўляецца ўсведамленне вучнямі таго, што нельга рабіць высновы па недастатковай інфармацыі, трэба абавязкова шукаць дадатковыя звесткі, удакладняць, параўноўваць інфармацыю з розных крыніц.*

У папярэдніх практыкаваннях падчас уважлівага разгляду фота мы звярнулі ўвагу на дэталі, якія могуць шмат што распавесці пра гістарычную эпоху ці сучасны стан развіцця грамадства. **Работа з дэталямі** можа быць вельмі прадуктыўнай, і таму варта вылучыць яе ў якасці асобнага напрамку работы з фота.

У якасці арыенціраў для аналізу адбіраюцца некалькі элементаў на здымку, якія пазначаюцца маркерамі. Далей з выкарыстаннем розных крыніц інфармацыі праводзіцца работа па вывучэнні адзення, аксесуараў, сімволікі, якія маюць дачыненне да фота.

Карыстаючыся гэтым прыёмам, можна прапанаваць вучням не столькі засяродзіцца на вывучэнні фота як гістарычнай крыніцы (напрыклад, параўнаць фотаздымкі перыядаў ваеннага камунізму і нэпа і вызначыць эпоху па дэталях на фота), сколькі сканцэнтравацца на параўнанні найбольш пашыраных у паўсядзённым жыцці навучэнцаў медыятэкстаў — фота і кіно.

Па фота розных гадоў (у тым ліку з сямейнага архіва) і папулярных кінастужках і відэакліпах можна арганізаваць захапляльнае вывучэнне маладзёжных субкультур. Мэтазгодна параўнаць дакументальныя здымкі і фота з сямейнага архіва з кадрамі фільмаў, знайсці аўтэнтычныя дэталі стылю субкультуры і тыя дэталі, якія былі выдуманы стваральнікамі кінастужкі ці запазычаны з іншай субкультуры. Для асновы можна выкарыстаць матэрыялы табл. 12.

*Табліца 12*

**Параўнанне медыявобразаў субкультур**

| Субкультуры (назва, перыяд) | Што шукаем (мода, адзенне, прычоскі, аксесуары, сімволіка) | Мастацкі фільм, відэакліп | Фота з сямейнага архіва вучня |
|---|---|---|---|
| **Стылягі** (канец 1940-х — пачатак 1960-х гг., СССР)<br>*Стылягі — ад назвы фельетона Д. Бяляева ў сатырычным часопісе «Крокодил» (№ 7, 1949)* | • *штаны-дудачкі;*<br>• *прычоска — начос «кок»;*<br>• *гальштук-дудачка;*<br>• *яркая сукенка з пышнай спадніцай* | «Стылягі» — расійскі мюзікл 2008 г. (рэж. В. Тадароўскі) | Работа з сямейнымі фотаальбомамі вучняў зробіць навучанне практыка-арыентаваным і можа даць цікавыя вынікі па вывучэнні субкультурнага зрэзу грамадства |
| **Хіпі** (канец 1960-х — пачатак 1970-х гг.; англ. *hippy* або *hippie* ад разм. *hip* або *hep* — які разумее, дасведчаны) | • *джынсы-клёш;*<br>• *доўгія валасы;*<br>• *тунікі ў стылі этна;*<br>• *стужка на галаве, руцэ* | «Хіпі Хіпі Шэйк» — брытана-амерыкана-французскі мюзікл 2016 г. (рэж. Б. Кідран) | |
| **Хіпстары** (пачатак 2000-х — 2010-я гг.; англ. *to be hip* — быць у тэме) | • *вялікія акуляры;*<br>• *барада, вусы;*<br>• *кеды;*<br>• *джынсы ў абцяжку;*<br>• *майкі з прынтамі* | *«#Хипстер»* — відэакліп расійскага рок-гурта «Би-2» (2014) | |

***Пазнай субкультуру***

*Ці можна сцвярджаць, што субкультура хіпі атрымала значнае пашырэнне сярод беларускай моладзі ў 1970-я гг.? Якое месца з'яўлялася пляцоўкай, дзе збіраліся мінскія хіпі? На адным з гэтых фота ёсць знакаміты беларускі мастак. Знайдзіце, хто гэта, пры дапамозе пошуку фота ў інтэрнэце.*







***Шукаем дэталі культуры хіпі:***

*1— джынсы клёш;*
*2 — яркія саколкі-тунікі ў этнастылі;*
*3 — боты, кеды;*
*4 — яркія спадніцы;*
*5 — камізэлькі, пінжакі з джынсы, замшы;*
*6 — прычоска — доўгія валасы;*

***Каментар для настаўніка**: на фота каля Палаца спорту, дзе збіраліся мінскія хіпі, крайні справа — вядомы беларускі мастак У. Цэслер.*

***Крыніца матэрыялаў**: Чарнова А. Фотаздымак як медыятэкст (http://www.nastaunik.info/node/15523)*

Фатаграфіі адыгрываюць важную ролю ў медыярэпрэзентацыі падзей, на што мы ўжо звярталі ўвагу — адно і тое ж фота па-рознаму можа «працаваць» у розных медыяпаведамленнях. Асабліва яскрава і небяспечна гэта выяўляецца, калі фота выкарыстоўваецца для стварэння фэйкавай навіны. Настаўніку неабходна звяртаць увагу вучняў на тое, што **фотафэйкі** можна паспяхова выяўляць.

***Ці можа фота стаць інфармацыйнай зброяй?***




***Каментарый для настаўнікаў.*** *«Фота з месца падзей», якое шырока разышлося ў прэсе і сацыяльных сетках у 2014 г. і выклікала вялікі грамадскі рэзананс, насамрэч не мае ніякага дачынення да гэтых падзей — яно было зроблена значна раней, у 2009 г., на здымках мастацкага фільма «Брэсцкая крэпасць».*

***Крыніцы фотаматэрыялаў***: *http://uainfo.org/, http://virtualbrest.by/news27055.php*

Для выяўлення фэйкаў можна карыстацца агульнадаступнымі вэб-сэрвісамі для пошуку і апрацоўкі фота. Гэтыя навыкі з'яўляюцца вельмі запатрабаванымі ў нашым сённяшнім жыцці, таму вучням неабходна прапаноўваць адпаведныя заданні па пошуку і праверцы фотаматэрыялаў (табл. 13).

*Табліца 13*

**Вэб-сэрвісы для праверкі фота**

| Сэрвісы | Магчымасці |
|---|---|
| | **Пошук** |
| Google Search by Image<br>Pipl.com<br>People.yandex.ru<br>TinEye | • Пошук па выявах — зваротны пошук выяў. Сюды можна запампаваць фота, каб знайсці яго арыгінальную крыніцу і паглядзець, дзе яно яшчэ публікавалася.<br>• Пошук «інтэрнэт-слядоў» карыстальніка. Дапамагае ідэнтыфікаваць яго і знайсці фотаздымкі (у першую чаргу з сацыяльных сетак) — для гэтага трэба ўвесці імя і прозвішча.<br>• Дазваляе рабіць зваротны пошук выявы і знайсці яе арыгінальную крыніцу |
| Webmii.com | • Шукае спасылку з імем чалавека, дае рэйтынг яго «вэб-бачнасці». З дапамогай сэрвісу можна знайсці фэйкавыя акаўнты |
| | **Праверка фота** |
| Findexif.com<br>Fotoforensics.com | • Бясплатны сэрвіс, на які можна запампаваць фатаграфію ці даць спасылку на яе — ён вызначыць EXIF-даныя (звесткі, калі было зроблена фота, якой прыладай, параметры выявы, часам можна вызначыць і месца здымкаў).<br>• Шукае «дамаляваныя» або ўстаўленыя ў фатаграфію пры рэдагаванні фрагменты. Пасля апрацоўкі праграма выдае здымак, дзе змененыя вобласці будуць вылучацца на фоне іншых. Акрамя таго, праграма таксама падае EXIF-даныя |

Больш кейсаў і прыёмаў працы з фота можна знайсці ў прэзентацыі аўтара «Работа з фота на ўроках гісторыі і грамадазнаўства».

***Палітычны плакат — дзейсная прапаганда?***

Плакат — кідкі, зазвычай буйнафарматны малюнак з кароткім тэкстам, зроблены ў агітацыйных, рэкламных, інфармацыйных або навучальных мэтах. Да асаблівасцяў жанру можна прылічыць наступнае: плакат павінен быць бачным на адлегласці, быць зразумелым і добра ўспрымацца гледачом. У плакаце часта выкарыстоўваюцца мастацкая метафара, рознамаштабныя фігуры, ілюстрацыі падзей, якія адбываюцца ў розны час і ў розных месцах, контурнае абазначэнне прадметаў.

Лічыцца, што плакат узнік у выніку эвалюцыі тэатральных афіш і аб'яў у Заходняй Еўропе ў 2-й палове XIX ст. Рост папулярнасці плаката звязаны з развіццём відовішчных устаноў, павелічэннем колькасці прамысловых і мастацкіх выстаў, са з'яўленнем мітынгаў і маніфестацый.

***Якога плаката тут не хапае?***

*Паглядзіце на гэтыя плакаты з розных краін. Да чаго ўсе яны заклікаюць? Якія сродкі мастацкай выразнасці выкарысталі іх стваральнікі? Што яны «запазычылі» адзін у аднаго? Якога плаката тут не хапае?*













***Каментарый для настаўніка**: брытанскія, італьянскія, амерыканскія плакаты заклікаюць уступіць ці падтрымаць армію сваёй краіны ў Першай сусветнай вайне. На вядомым плакаце «Ты запісаўся добраахвотнікам?» у час Грамадзянскай вайны ў Расіі выкарыстаны тыя ж прыёмы.*

***Крыніца матэрыялаў**: http://ria.ru/infografika/20141006/1027076432.html*

Для таго каб эфектыўна працаваць з плакатамі, неабходна ведаць творчыя прыёмы іх праектавання.

***Прыёмы праектавання плаката***

1. **Адназначнасць**: ідэя плаката павінна быць выказана выразна — адназначнае тлумачэнне створанага вобраза.
2. **Лаканічнасць**: ясныя і яркія вобразы, кароткія і нянудныя фразы, якія людзі гатовыя ўспрыняць літаральна на хаду.
3. **Рыфма, прымаўка**: лозунг з рыфмай, прымаўка лёгка запамінаюцца.
4. **Заклік**: часта ўжываецца зварот на «ты», непасрэдна да аўдыторыі (моладзь, працоўныя, армія і інш.).

## *Практыкаванне «Як працуе прапаганда?»*

***#аналіз_медыятэкстаў #медыяспажыванне #групавая_работа #прапаганда***

***Мэта**: удзельнікі, прааналізаваўшы ў групах плакаты часу Першай ці Другой сусветных войнаў, халоднай вайны, вылучаць асноўныя прыёмы аўтараў.*
***Рэсурсы**: История пропаганды (http://propagandahistory.ru/ww2).*
***Задача груп**: адказаць на пытанні.*

- *Плакаты якіх краін намаляваны? Што неабходна ведаць, каб гэта вызначыць?*
- *Ці можна па гэтых плакатах вызначыць перыяд іх стварэння? Чаму для адных плакатаў гэта можна зрабіць, а для іншых цяжка? Што можа дапамагчы ў вашым вызначэнні?*
- *Якая мэтавая аўдыторыя гэтых плакатаў? Якія з гэтых плакатаў часоў вайны разлічаны на насельніцтва акупаваных тэрыторый, а якія — на насельніцтва сваёй краіны? Чаму вы так вырашылі?*
- *Якія мастацкія асаблівасці аднаго з плакатаў (на выбар групы) можна вылучыць? На якую рэакцыю разлічвалі аўтары гэтага плаката?*
- *Якія агульныя рысы, ідэі нямецкіх, савецкіх, амерыканскіх плакатаў вы маглі б вылучыць? (Можна назваць групы такіх рысаў.)*
- *Якія маніпуляцыі вы заўважылі?*

Высокі медыяадукацыйны патэнцыял маюць заданні, арыентаваныя на самастойнае вылучэнне вучнямі меседжаў плакатаў. Мэтазгодна схаваць (заклеіць стыкерам, закрыць паперай) на адабраных плакатах лозунгі — звароты да аўдыторыі і прапанаваць вучням самастойна сканструяваць іх ці выбраць з прапанаваных настаўнікам варыянтаў. Пасля выканання практыкавання неабходна сказаць, які з лозунгаў правільны, паказаць плакат цалкам і правесці выніковае абмеркаванне з вучнямі.

## *Матэрыялы для практыкавання «Выберыце правільны лозунг»*



***Каментарый для настаўніка.** Поспехі ў асваенні космасу выклікалі з'яўленне агітацыйных плакатаў з антырэлігійнымі меседжамі. Дата стварэння гэтага плаката — 1962 г.*

***Варыянты лозунгаў на выбар***

- *З дапамогай Бога заваюем космас!*
- *Божачка, выходзь, я пазнаў цябе!*
- *Бога няма! (правільны варыянт)*

***Крыніца матэрыялаў**: http://mythdetector.ge/en/quizz/quiz-soviet-propaganda*

Аналізам плакатаў можна займацца на ўроках як гісторыі, так і грамадазнаўства (напрыклад, можна эфектыўна выкарыстаць спецпраекты БЕЛТА — плакаты серыі «Сэрцам адданыя роднай зямлі», «Цветы великой Победы», «Победа, вдохновляющая поколения», «Краіна майго шчасця», «Вместе мы Беларусь», «Наша перамога», «Мы беларусы!», «Беларусь — государство для народа»). Выдатныя магчымасці для работы з плакатам адкрывае электронны рэсурс «Беларускі плакат» (https://plakat.unid.by/), дзе сабрана калекцыя з больш чым 4000 айчынных плакатаў (як гістарычных, так і сучасных).

### *Карыкатура — адзін з самых старажытных відаў малюнка?*

Карыкатура — сатырычны ці гумарыстычны малюнак, у якім камічны эфект ствараецца шляхам перабольшвання і завастрэння характэрных рыс, нечаканых супастаўленняў і прыпадабненняў. Росквіт карыкатуры звычайна звязаны з перыядам буйных грамадскіх канфліктаў, палітычнай нестабільнасці, войнаў. Яна адлюстроўвае праблемы грамадства і з ранніх часоў служыла метадам самасцвярджэння за кошт крыўдзіцеля: кпілі з ворагаў, сваіх уладароў або прыгнятальнікаў. Карыкатура таго часу ўяўляла сабой малюнак з грубымі скажэннямі рысаў крыўдзіцеляў або з прымаляванымі рагамі, хвастом і г. д.

Вылучаюць розныя тыпы карыкатур: карыкатуры-партрэты, карыкатуры-характарыстыкі, карыкатуры-ілюстрацыі, карыкатуры-сімвалы. Незалежна ад тыпу карыкатуры можна вылучыць асноўныя пытанні для работы з ёй на ўроку (табл. 14).

*Табліца 14*

**Аналіз карыкатуры**

| Этап | Пытанні |
|---|---|
| **Апісанне** | Апішыце вобразы, персанажаў, пярэдні і задні планы.<br>З дапамогай якіх мастацкіх сродкаў створаны гэтыя вобразы і персанажы? |
| **Інтэрпрэтацыя** | 1. Паглядзіце на час стварэння карыкатуры. Якой падзеі яна прысвечана?<br>2. Ці пазналі вы персанажаў? Чаму вы так думаеце? Калі гэта рэальныя фігуры — назавіце іх і тую ролю, якую яны адыгрывалі ў той час і ў тых падзеях, якія суправаджалі з'яўленне карыкатуры.<br>3. Вызначце, якія сімвалы выкарыстаў мастак. Чаму ён да іх звярнуўся?<br>4. Якое стаўленне да персанажаў — станоўчае ці адмоўнае — выказвае карыкатура?<br>5. Як інтэрпрэтуе карыкатура персанажаў? Ці згодныя вы з ёй?<br>6. Якія ідэі і палітычная пазіцыя аўтара? Як бы вы іх вызначылі?<br>7. Што вам вядома з іншых крыніц пра падзеі, якім прысвечана карыкатура? Як гэта суадносіцца з тым, што вы даведаліся дзякуючы карыкатуры? [3, с. 160] |

У сістэме работы з карыкатурай можна вылучыць розныя падыходы і ўзроўні, але вельмі перспектыўнай з пункту гледжання матывавання вучняў да аналізу медыятэкстаў з'яўляецца магчымасць самастойнай пастаноўкі пытанняў школьнікамі да карыкатуры (гл. табл. 15).

Таблiца 15

**Пытанні да карыкатуры**

| Прыкладныя пытанні | Планаваныя вынікі |
|---|---|
| Якія пытанні вы б хацелі задаць аўтару карыкатуры? (2–3 пытанні) | Могуць спытаць пра:<br>• матывы стварэння карыкатуры;<br>• месца і час з'яўлення карыкатуры;<br>• важнасць сімвалаў і знакаў;<br>• мэты аўтара карыкатуры;<br>• уздзеянне на гледача |
| Якія думкі ўзнікаюць у вас, калі вы разглядаеце карыкатуру? (2–3 сказы) | Змогуць даць адзін ці некалькі варыянтаў адказу |
| Што, на ваш погляд, карыкатура павінна перадаць свайму адрасату? | Змогуць прапанаваць некалькі варыянтаў адказу |
| Якія пачуцці (жах, туга, асцярога, надзея) пэўных сацыяльных груп ці асоб вызначаюцца праз карыкатуру? | Змогуць вызначыць 2–3 пачуцці і абгрунтаваць сваю думку |
| Супраць каго, на ваш погляд, накіравана карыкатура? | Змогуць вызначыць, супраць каго накіравана карыкатура, і растлумачыць свой пункт гледжання |
| Якім чынам магла б выглядаць карыкатура, створаная процілеглым бокам? | Для адказу на гэтае пытанне некаторыя навучэнцы нават могуць самі намаляваць такую карыкатуру [7] |

Вельмі эфектыўным прыёмам з'яўляецца параўнанне карыкатур рознага часу.

***Што аб'ядноўвае гэтыя карыкатуры?***

*Якім падзеям прысвечаны гэтыя карыкатуры? Як вы гэта вызначылі? Што аб'ядноўвае гэтыя карыкатуры? Чым яны адрозніваюцца? У якіх выданнях яны маглі быць апублікаваныя?*







***Каментарый для настаўніка***: *агульная тэма карыкатур — падзелы (падзел Рэчы Паспалітай, падзел Беларусі паводле Рыжскага міру).*

Прадуктыўнай з'яўляецца дзейнасць па стварэнні ўласнай карыкатуры (вучні з задавальненнем удзельнічаюць, калі разумеюць, што ўменне маляваць для карыкатурыста — не галоўнае). Можна прапанаваць вучням напісаць невялікія сатырычныя нататкі да карыкатуры і параўнаць іх потым з арыгінальнымі тэкстамі.

### *Сатырычная замалёўка да карыкатуры*

*Напішыце тэкст невялікай сатырычнай замалёўкі для заходнебеларускага выдання ў міжваенны перыяд, дзе магла быць апублікавана гэта карыкатура. Выкарыстайце наступныя канструкцыі.*

- *Жыццё рэдакцыі — не з простых.*
- *Нястача грошай, канфіскацыя нумароў, вобшукі паліцыі.*
- *Газеты то растуць як грыбы пасля дажджу, то зачыняюцца.*




***Каментарый для настаўніка**. Сёння даступны якасныя матэрыялы для работы з карыкатурай з заходнебеларускіх выданняў міжваеннага перыяду «Асва», «Авадзень», «Маланка».*
***Крыніца матэрыялаў**: https://novychas.by/poviaz/z-czaho-smjajalisja-u-zahodnjaj-belarusi*

### *Карты-карыкатуры*

Асаблівай разнавіднасцю палітычнай карыкатуры з’яўляецца так званая карта-карыкатура, росквіт якой адбыўся напярэдадні і падчас Першай сусветнай вайны. Шматлікія карты, якія выдаваліся ў той час у розных краінах, навязвалі пэўнае ўспрыняцце асобных удзельнікаў канфлікту. Вучні звычайна называюць прычынай Першай сусветнай вайны забойства эрцгерцага Франца Фердынанда ў Сараеве, але разгляд гэтых створаных у розны час у розных краінах сатырычных картаў дае магчымасць лепш зразумець прычыны і характар трагічных падзей 1914–1918 гг. [6]

Вызначэнне аўтарства карты-карыкатуры і высвятленне пазіцыі яе стваральніка дазваляюць вучням убачыць падзеі з розных бакоў, улічваць розныя пункты гледжання, паглыбіцца ў адпаведны кантэкст гістарычнай эпохі.

### Карты-карыкатуры?

*У якіх краінах у 1914 г. былі створаны і апублікаваны гэтыя карты? На што трэба звярнуць увагу, каб адказаць на гэта пытанне?*







***Каментарый для настаўніка.*** *Працуючы з сатырычнымі картамі, неабходна ў першую чаргу звяртаць увагу на мову карты (нямецкая і брытанская карты).*

***Крыніца****: https://ru-history.livejournal.com/2030338.html*

### *Інфаграфіка як медыятэкст*

Інфаграфікай называюць графічны спосаб падачы інфармацыі, даных і ведаў. Яна стала папулярнай больш за 30 гадоў таму, калі з'явілася на старонках замежных масавых перыядычных выданняў. Ва ўмовах інфармацыйнай перанасычанасці ўзнікла патрэба максімальна лаканічна і хутка выкладаць вялікі масіў звестак, бо гэтаму спрыяе дамінаванне «экраннай» культуры.

Інфаграфікай можна назваць любое спалучэнне тэксту і графікі, створанае з намерам выкласці тую ці іншую гісторыю, данесці той ці іншы факт. Інфаграфіка працуе там, дзе трэба паказаць алгарытм працы чаго-небудзь, суадносіны прадметаў і фактаў у часе і прасторы, прадэманстраваць тэндэнцыю, паказаць, як што выглядае, арганізаваць вялікія аб'ёмы інфармацыі.

Калі прааналізаваць інфаграфіку, то мы ўбачым, што добра прадуманая інфаграфіка:

- *часта пабудавана на нейкай метафары (уяўленне, унутрыасобасны тып інтэлекту);*
- *змяшчае статыстычныя звесткі і дыяграмы (логіка-матэматычны інтэлект);*

- *акрамя ілюстрацый (візуальна-прасторавы) забяспечана апісаннямі (вербальна-лінгвістычны);*
- *пры працы ў супрацоўніцтве патрабуе добрых камунікатыўных навыкаў (уцягванне і міжасобасны тып інтэлекту).*

Інфаграфіка — гэта не проста графічная падача інфармацыі, а спецыфічны медыятэкст. Інфаграфіка выкарыстоўваецца там, дзе аб'ёмную і складаную інфармацыю трэба прэзентаваць кампактна і выразна.

Настаўнікам неабходна разумець, што дзеці эпохі інтэрнэту — так званае пакаленне Z — па-іншаму глядзяць на свет і ўспрымаюць інфармацыю па прынцыпе кліпа. Таму «неабходна вырашыць практычную праблему для педагогаў — як змяніць тэхналогіі "падачы" вучэбнага матэрыялу, каб сучасным навучэнцам было камфортна, не парушыўшы пры гэтым вядучых дыдактычных прынцыпаў. Адным з такіх інструментаў з'яўляецца інфаграфіка, якая больш адпавядае нашаму лічбаваму свету і дазваляе лягчэй запомніць неабходную інфармацыю пакаленню дзяцей-візуалаў» [8].

У першую чаргу неабходна навучыць «чытаць інфаграфіку» — для гэтага трэба сістэматычна прапаноўваць практыкаванні па «перакладзе» інфармацыі з адной знакавай сістэмы на іншую (схема, табліца, графік, тэкст).

Інфаграфіка вельмі дзейсная для арганізацыі праблемных сітуацый на ўроках і эфектыўнай пошукавай дзейнасці. Таму мэтазгодна часцей прапаноўваць вучням стварэнне інфаграфікі замест традыцыйнага канспектавання ці падрыхтоўкі рэферата. Перад тым як прапанаваць вучням заданне па стварэнні інфаграфікі, настаўніку неабходна вызначыцца, якія навучальныя мэты і задачы можна эфектыўна дасягнуць на пэўным прадметным змесце ў працэсе візуалізацыі інфармацыі (гл. табл. 16).

***Прачытайце інфаграфіку — «перакладзіце» інфармацыю***

*1. Сфармулюйце пытанні анкеты, па якіх збіраліся даныя для гэтай інфаграфікі.*

*2. Складзіце тэксты-каментары да гэтай інфаграфікі для выданняў, якія працуюць на розныя аўдыторыі (напрыклад, часопіс для моладзі і сайт для бацькоў школьнікаў). Ці будуць яны адрозніваецца? Чым?*




***Каментарый для настаўніка.*** *Статыстычныя даныя па выкарыстанні інтэрнэту хутка мяняюцца — гэта сфера вельмі дынамічна развіваецца.*

***Крыніца матэрыялаў**: Парахня А. Беларусы ў сацыяльных сетках: хто і з якіх прылад праводзіць у іх час (Інфаграфіка) (http://www.rh.by/2018/01/27/belarusy-u-satsyyalnyh-setkah-hto-i-z-yakih-prylad-pravodzits-u-ih-chas-infagrafika/)*

*Табліца 16*

**Этапы работы па стварэнні інфаграфікі**

| Этап | Дзейнасць |
|---|---|
| **Мэтавызначэнне** | Вызначэнне мэт і задачы інфаграфікі (навошта візуалізаваць гэту інфармацыю) |
| **Аналіз і перапрацоўка інфармацыі** | • Разбор і падзел інфармацыі на часткі, пункты;<br>• падаванне кожнай часткі як асобнага малюнка, дыяграмы, графіка;<br>• падбор візуальных вобразаў, якія добра знаёмыя аўдыторыі |
| **Стварэнне гісторыі** | Стварэнне фокуса, гісторыі, асноўнай ідэі (візуальнай метафары) інфаграфікі (яна павінна быць зразумелая аўдыторыі) [8] |

У працэсе стварэння інфаграфікі ў асноўным спатрэбяцца малюнкі і фота з інтэрнэту. Неабходна нагадаць вучням, што выкарыстоўваць чужую графіку або фатаграфіі без дазволу — гэта парушэнне закона аб аўтарскім праве. Фотаздымкі можна браць з так званых сцёкаў (сховішчы платных і бясплатных малюнкаў) — гэта спосаб вырашыць праблему ілюстравання сваёй працы без крадзяжу. Спецыялісты рэкамендуюць самыя вядомыя рэсурсы: Shutterstock, Gettyimage, Freeimages і інш.

Будзе карысная таксама прэзентацыя аўтара па выкарыстанні інфаграфікі на ўроках грамадазнаўства.

**Літаратура і электронныя рэсурсы**


1. *Savchits, V.* Візуальны паварот: як фатаграфія мяняе рэальнасць? / V. Savchits // 34mag.net [Электронны рэсурс]. — 2017. — Рэжым доступу: https://34mag.net/post/vizualny-pavarot-yak-fatagrafiya-myanyae-rehalnasc. — Дата доступу: 20.04.2018.
2. *Мокрогуз, О. П.* Аналіз візуальних історичних текстів / О. П. Мокрогуз // Практична медіаосвіта: авторські уроки: збірка / ред.-упоряд. В. Ф. Іванов, О. В. Волошенюк; за наук. ред. В. В. Різуна. — К.: Акад. укр. преси: Центр віл. преси, 2013.
3. Медыяадукацыя ў школе: фарміраванне медыяграматнасці вучняў: дапам. для настаўнікаў / М. І. Запрудскі [і інш.]; пад рэд. М. І. Запрудскага. — Мінск, 2016.
4. *Ваврова, Т.* Краткое пособие по преподаванию новейшей истории / Т. Ваврова, Ч. Пыха. — Прага, 2015.
5. *Инанец, С.* Остались шестеро из девяти. Как репрессированных писателей вычеркивали с групповых фотографий / С. Инанец // TUT.BY [Электронный ресурс]. — 2018. — Режим доступа: https://news.tut.by/society/565347.html. — Дата доступа: 20.04.2018.
6. *Мартыноўскі, П.* Медыяадукацыя на ўроках гісторыі ў Чэхіі / П. Мартыноўскі // настаўнік.info [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.nastaunik.info/node/15457. — Дата доступу: 20.04.2018.
7. *Давідоўская, Г.* Медыятэксты: плакат і карыкатура ў навучанні гісторыі / Г. Давідоўская // настаўнік.info [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.nastaunik.info/node/15993. — Дата доступу: 20.04.2018.
8. *Якубоўскі, А.* Праца з інфаграфікай на ўроках фізікі / А. Якубоўскі // настаўнік.info [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.nastaunik.info/node/15999. — Дата доступу: 20.04.2018.

## 2.2. Аўдыявізуальныя медыятэксты

*Кіно павінна прымусіць гледача*
*забыцца на тое,*
*што ён сядзіць у кіно.*

*Раман Паланскі*

Як вядома, медыяадукацыя звязана з усімі відамі медыя (друкаванымі і графічнымі, гукавымі, экраннымі і г. д.) і разнастайнымі тэхналогіямі іх стварэння і распаўсюджвання. Кінафільмы, анімацыя і відэа з'яўляюцца аўдыявізуальнымі медыятэкстамі, г. зн. спалучаюць выяву, гук, рух, і іх успрыманне і ўздзеянне на гледача адрозніваюцца ад статычных (нерухомых) візуальных тэкстаў: фота, плакатаў і інш. Прапануем разгледзець асаблівасці аўдыявізуальных медыятэкстаў і пытанні для іх аналізу, каб уключыць іх у навучанне гісторыі і грамадазнаўству ў школе.

Кіно з'яўляецца найстарэйшай формай экраннай культуры. Гісторыя кіно пачалася з дэманстрацыі 28 снежня 1895 г. у «Гранд Кафэ» на бульвары Капуцынак у Парыжы шэрагу дакументальных фільмаў. Сеанс меў сенсацыйны поспех у публікі і прынёс добры прыбытак (кошт білета складаў 1 франк). Прапануем даведацца пра першы беларускі фільм.

***З чаго пачалося беларускае кіно?***

*Як вы думаеце, дзе знаходзяцца героі? Хто яны? Якую сцэну мы назіраем? Паспрабуйце агучыць гэты эпізод. Прапануйце магчымую назву для гэтага фільма.*




***Каментарый для настаўніка***: *скрыншот кадра з першага беларускага фільма «Лясная быль» (іншыя назвы — «Свінапас», «Грышка-свінапас») на 27-й хвіліне дэманстрацыі кінастужкі. Жанр твора — героіка-прыгодніцкі фільм. Экранізацыя аповесці Міхася Чарота «Свінапас» выйшла на экраны 25 снежня 1926 г. Чорна-белая нямая стужка «Лясная быль» складалася з 8 частак (3-я не захавалася).*

Гледзячы фільм, мы павінны разумець самі і данесці да вучняў, што кіно і тэлебачанне маюць сваю спецыфіку: як сродак аўдыявізуальнай камунікацыі яны здольны ствараць ілюзію рэальнасці. Кіно гэтак жа моцна і непасрэдна ўплывае на пачуцці чалавека, як і ўласна рэчаіснасць. А часта, узмоцненае разнастайнымі спецэфектамі, якія немагчыма перажыць у сапраўдным жыцці, уплывае на асобу болей за рэальнасць.

***Прычыны выкарыстання фільмаў у навучанні гісторыі і грамадазнаўству:***
- *гісторыя чалавецтва кінафікаваная — ёсць шмат фільмаў, у якіх паказаны гістарычныя падзеі;*
- *кіно моцна ўздзейнічае на свядомасць і эмоцыі чалавека, бо спалучае выяву, гук, рух, форму і колер;*
- *вучні любяць кіно, а фільмы складаюць значную частку іх медыяспажывання.*

Вучні прызвычаіліся да фільмаў у штодзённай практыцы, але работа з кінатэкстамі на ўроках адточвае іх аналітычныя здольнасці. Школьнікі вучацца дыстанцыявацца ад матэрыялу, задаваць пытанні. Гэтыя навыкі не толькі могуць быць перанесены на прагляд іншых гістарычных фільмаў, але і ў цэлым выпрацоўваюць крытычны погляд на аўдыявізуальныя матэрыялы (у тым ліку тэлебачанне).

Плануючы работу з кінаматэрыялам, настаўніку трэба:
- *абгрунтаваць, навошта ён выбірае менавіта гэты фільм, і добра ўсвядоміць, якіх вынікаў ён чакае (як мінімум дыскусіі);*
- *сабраць усю інфармацыю пра фільм (рэжысёр, сцэнар, дзе працавала кінагрупа, ацэнкі крытыкаў, узнагароды і г. д.);*
- *паглядзець афішы і трэйлеры фільма;*
- *вызначыцца, ці трэба глядзець увесь фільм, ці абмежавацца нейкім урыўкам;*
- *прадумаць, як абмеркаваць фільм і як актывізаваць навучэнцаў пасля яго прагляду.*

Кіно належыць да экранных ці візуальных медыя. Трэба адзначыць, што кожны від медыя мае свае «мову» і «граматыку», якія працуюць на перадачу зместу. Пад «мовай» у гэтым сэнсе разумеюцца тэхнічныя складнікі — знакі ці коды ды абазначэнні, якія прафесіяналы ў галіне медыя і інфармацыі ўмеюць адбіраць і выкарыстоўваць для трансляцыі пэўных ідэй, інфармацыі і ведаў (табл. 17).

*Табліца 17*

**Коды ў кіно**

| Коды і прыклады іх выкарыстання | |
|---|---|
| **Тэхнічныя** | **Сімвалічныя** |
| • **Гук**: трывожная музыка перадае небяспеку;<br>• **асвятленне**: схаванае ў ценю інтрыгуе;<br>• **фокус**: глыбокі надае рэалістычнасць;<br>• **кадр**: закрытая кампазіцыя стварае адчуванне пасткі;<br>• **план**: акцэнт на дэталі і галоўнага героя робіцца пры дапамозе буйнога плана | • **Жэсты і паводзіны**: узняты кулак — гнеў, сціснутыя вусны — крыўда, усмешка — радасць, рука на сэрцы — шчырасць;<br>• **колеры адзення**: чорны — хвароба, жалоба, смерць, чырвоны — разбэшчанасць, белы — цнатлівасць, нявіннасць;<br>• **выявы**: дым — пагроза, небяспека |

Напрыклад, складнікам элементарнай адзінкі кінамовы з'яўляецца кадр. Гэта нерухомы фатаграфічны малюнак, які змяшчае фрагмент нейкага дзеяння. Хуткая змена кадраў стварае эфект руху. У кінематографе за секунду змяняецца 24 кадры. Кадры аб'ядноўваюцца ў эпізоды (сказы), а са злучэння эпізодаў ствараецца (манціруецца) фільм (аповед). Мантаж у кіно —

гэта спосаб выкладання сюжэта: паралельны — дзеянні адбываюцца адначасова, але ў розных месцах, паслядоўны — падзеі развіваюцца ў храналагічным парадку [3, с. 313].

Важным паняццем візуальнай камунікацыі з'яўляецца вобраз. Яго можна ахарактарызаваць як пэўную камбінацыю знакаў і сімвалаў, якія мы бачым не толькі ў кіно, але і на фотаздымках, у рэкламе і інш. Вобразы перадаюцца праз каналы медыя, яны звязаныя з інфармацыяй, каштоўнасцямі, верай, устаноўкамі і ідэаламі людзей. Вобраз — гэта набор знакаў, кожны з якіх мае асаблівае значэнне.

***Вобраз гістарычнай асобы ў кіно***

*Які вобраз галоўнай гераіні больш адпавядае зместу анатацыі фільма: «Пачатак XVI ст. Бясстрашная княгіня Анастасія Слуцкая ўстае на абарону беларускай зямлі ад незлічоных полчышчаў татараў, якія нясуць з поўдня спусташэнне і смерць»?*





***Каментар для настаўніка**: кадры з фільма «Анастасія Слуцкая» (рэж. Ю. Ялхоў, у галоўнай ролі С. Зелянкоўская, «Беларусьфільм», 2003).*

Набор кодаў і сімвалаў у кінатэкстах працуе разам, каб прымусіць нас адчуваць сябе шчаслівымі, раз'юшанымі ці ўзбуджанымі, выклікаць спачуванне да героя ці нянавісць да антыгероя, схіліць да думкі выглядаць, як гераіня, і паводзіць сябе, як герой.

Музыка, маўленне, фонавыя шумы валодаюць выразнымі магчымасцямі, дапамагаючы стварыць эмацыйную атмасферу, дакладней ахарактарызаваць мастацкі вобраз, зрабіць дзеянне дынамічным. Для разумення важнай сэнсавай функцыі гукавой прасторы фільма прапануем выканаць наступнае практыкаванне.

## ***Практыкаванне «Мова кіно — не толькі словы»***

***#медыяспажыванне #аналіз_медыятэксту***
***#групавая_дзейнасць #дыскусія***

***Мэты**: удзельнікі зразумеюць магчымасці медыятэксту ў перадачы зместу, эмацыйнай афарбоўкі і стварэння настрою ў гледача.*

***Ход практыкавання.** Настаўнік прапануе ўдзельнікам прааналізаваць абраны фільм, выкарыстоўваючы метад «стоп-кадр»: пасля прагляду пэўнага фрагмента націскаецца кнопка*

*«паўза», каб падрабязна абмеркаваць з удзельнікамі пытанні кампазіцыі, асвятлення, колеру, ракурсу, значэння дадзенага кадра ў кантэксце ўсяго відэа.*

***Магчымыя пытанні***

- *Ці паверылі вы персанажам фільма?*
- *Ці падобныя яны да рэальных людзей?*
- *Ці спадабалася вам, як у фільме адлюстравалі персанажаў? Ці ацанілі вы акцёрскае выкананне?*
- *Якія сродкі выкарысталі аўтары для стварэння настрою? Для перадачы эмоцый?*
- *Ці важныя кампазіцыя і асвятленне?*
- *Якое значэнне колеру і ракурсу ў кадры?*

*Пасля аналізу настаўнік прапануе перайсці да гуку і выяў. Для гэтага ён закрывае экран, уключае гук і працягвае абмеркаванне зместу, жанру і стылю пачутага. Далей магчымы паўторны прагляд матэрыялу з гукавой дарожкай, каб абмеркаваць іх спалучальнасць і магчымыя варыянты гукарада. Таксама можна пагутарыць з удзельнікамі пра адрозненні ва ўспрыманні аўдыя- і відэасюжэтаў. Як варыянт для ўскладнення практыкавання можна прапанаваць агучванне нямога відэафрагмента [1].*

***Прыклад 1****: прагляд бязгучнага ўрыўка (першыя 7 хвілін) з фільма «Брэсцкая крэпасць» («Беларусьфільм», «Цэнтрал Партнершып», 2010).*

***Прыклад 2****: агучванне заключных кадраў нямой стужкі «Кастусь Каліноўскі» («Белдзяржкіно», 1927, рэж. У. Гардзін), прагледжаных без цітраў, потым прагляд гэтага фрагмента з цітрамі і абмеркаванне адрозненняў медыяўспрымання.*

Фільмы падзяляюцца на дакументальныя, мастацкія і анімацыйныя. Першыя паказваюць рэальныя гісторыі. Але трэба памятаць, што яны таксама суб’ектыўныя, бо дэманструюць погляд свайго стваральніка на дадзеную праблему. Адзначым, што львіную долю медыяспажывання нашых вучняў складаюць ігра≠ыя фільмы для масавага прагляду, а не дакументалістыка ці артхаўснае кіно. Працуючы з мастацкімі фільмамі, школьнікі разумеюць, што гэта вымысел, і могуць ад яго неяк дыстанцыявацца. Але гэта складана зрабіць, калі фільм эмацыйна «чапляе» і захапляе відовішчнасцю, што асабліва выяўляецца падчас працы з гістарычнымі кінастужкамі і серыяламі.

Калі мы працуем з гістарычным фільмам, важна звярнуць увагу на тое, што ў фільме адлюстраваны грамадскі і культурны кантэкст, у якім ён быў зняты. Калі фільм быў створаны і калі адбываецца яго дзеянне — такімі павінны быць першыя пытанні, якія нам варта задаць. Рэкамендуецца выкарыстоўваць розныя гістарычныя фільмы (як сучасныя фільмы, дзеянне якіх адбываецца ў мінулым, так і фільмы мінулых гадоў пра іншыя гістарычныя эпохі). Мэтазгодна прапанаваць вучням выканаць заданне на параўнанне старога мастацкага і сучаснага дакументальнага фільмаў пра гістарычнага дзеяча.

Гісторыкаў заўсёды цікавяць фільмы, якія захоўваюць пэўную аўтэнтычную аснову гістарычных ведаў і спрыяюць больш шырокаму распаўсюджванню ўяўленняў пра мінулае, дэмакратызуючы гісторыю. Неабходна выкарыстоўваць гэтыя фільмы, бо яны маюць высокую мастацкую вартасць і вялікі патэнцыял у фарміраванні не толькі медыяінфармацыйных, але і сацыяльна-грамадзянскіх кампетэнцый. Найбольш эфектыўным у гэтым плане з’яўляецца параўнанне фільмаў, створаных у розныя гады і прысвечаных адной і той жа падзеі. Таксама мэтазгодна прапанаваць вучням стварэнне трэйлераў і пастараў да фільмаў. Прапануем спачатку паглядзець, што дае параўнанне розных пастараў да аднаго фільма.

### *Навошта сёння ісці і глядзець?*

Параўнайце розныя постары аднаго фільма. Чым яны адрозніваюцца, што ў іх агульнага? Да якой памятнай даты зняты гэты фільм? Які постар вы б выбралі для прагляду фільма сёння?







***Каментарый для настаўніка***: *постары мастацкага фільма «Ідзі і глядзі» (рэж. Э. Клімаў, «Беларусьфільм», «Масфільм», 1985), які быў зняты да 40-годдзя Перамогі.*

### *Кастусь Каліноўскі ў кіно*

*Паспрабуйце па фрагментах постараў і інфармацыі пра фільмы сфармуляваць магчымыя меседжы гэтых кінатвораў. У чым адрозніваецца ацэнка дзейнасці Кастуся Каліноўскага як кіраўніка паўстання 1863–1864 гг. у гэтых стужках?*

Фільм «Кастусь Каліноўскі»
(1927, рэж. У. Гардзін)
Нямая мастацкая стужка,
героіка-прыгодніцкі фільм, баявік



Фрагмент постара фільма
***Крыніца***: Вікіпедыя

Фільм «Кастусь Каліноўскі. Апошнія дні»
(2016, рэж. В. Мазынскі)
Дакументальны фільм



Фрагмент постара фільма
***Крыніца***: *http://bramaby.com/ls/blog/history/4185.html*

### *Практыкаванне «Ствараем постар ці трэйлер фільма»*

***#аналіз_медыятэксту #стварэнне_медыяпрадукту #медыярынак #індывідуальная_работа #дыскусія***

***Мэта***: *удзельнікі мусяць мастацкімі сродкамі данесці галоўны пасыл фільма да шырокай аўдыторыі.*

***Ход практыкавання.*** *Настаўнік прапануе вучням дамашняе заданне — стварыць постар (ці трэйлер) мастацкай карціны, якая, па іх меркаванні, найлепш адлюстроўвае гістарычную эпоху, што вывучаецца. У класе пасля прэзентацыі постараў і трэйлераў адбываецца абмеркаванне, чаму школьнікі адабралі менавіта гэтыя фільмы.*

***Галоўныя характарыстыкі постара (трэйлера), якія мусіць:***
- *даць разуменне жанру;*
- *зацікавіць гледачоў, але не распавесці ўсю гісторыю цалкам;*
- *трансляваць асноўную ідэю карціны;*
- *пазнаёміць з галоўнымі акцёрамі;*
- *прадэманстраваць аўтарскае выказванне.*

***Абавязковая інфармацыя на постары:***
- *назва карціны (таксама можна выкарыстоўваць слоган, калі ён ёсць);*
- *імя рэжысёра і назва студыі-вытворцы;*
- *дата прэм'еры;*
- *узроставыя абмежаванні (неабходны параметр у айчынным пракаце);*
- *прызы і ўзнагароды (фактар, які заахвочвае да прагляду).*

***Патрабаванне да трэйлера — не больш за 1–1,5 хв.***

Прапануем абмеркаваць праблемнае поле стварэння вучнямі ўласных медыяпрадуктаў на прыкладзе посту А. Пазняковай у настаўніцкай суполцы Web Κλειώ ў сацыяльнай сетцы Google+.

### *Як працуюць трэйлеры гістарычных фільмаў?*

***Пост настаўніцы пра выкананне вучнямі задання на стварэнне трэйлера да гістарычнага фільма***

*На ўроку па тэме «Наш край» у 10 класе вывучалі падзеі 1917–1921 гг. на тэрыторыі Бабруйшчыны. Марына Пахомава прапанавала нам трэйлер да фільма «Рудабельская рэспубліка». Канешне, не ўсё атрымалася як след, але вучні ацанілі высока. Галоўнае — захацелася паглядзець фільм. А гэта значыць, і па-іншаму паглядзець на падзеі тых гадоў. Зразумець, што Бабруйск хоць і не быў вялікім горадам, але знаходзіўся амаль у цэнтры гістарычных падзей.*

***Каментарыі настаўнікаў***
- *…Толькі практыка — шлях да дасканаласці. Трэйлер атрымаўся насамрэч класны. Стваральнікам можна даць яго прааналізаваць, каб самі вылучылі асноўны пасыл гэтага медыятэксту. Як яго могуць зразумець розныя людзі? Чаму яны так думаюць? Гэта нашмат лепш, чым адразу паставіць «правільную» задачу. Супер!*
- *…самі падзеі адбываліся ў 1918–1920 гг., кіно пра іх знята ў 1972 г., а трэйлер да кіно ствараецца ў 2018 г. Для каго? Для тых, хто яшчэ жыве ў 70-х гг. XX ст.? Гісторыя — гэта канструкт (праца па стварэнні трэйлераў да гістарычных фільмаў выдатна гэта ілюструе). Выдатны кейс!*

### *Чаму серыялы называюць «мыльнымі операмі»?*

У адрозненне ад аўтарскага кіно серыялы ствараюцца на замову тэлеканала, які яго транслюе. Таму іх галоўная мэта — утрымліваць увагу гледача для продажу рэкламы, якая прыносіць даход тэлеканалу. Раней дэманстрацыя рэкламы (часта гэта былі мыйныя сродкі, касметыка, таму і замацавалася адпаведная назва серыялаў — «мыльныя оперы») перапыняла сюжэт на самым цікавым месцы, што выклікала раздражненне гледачоў. Сёння спосабы падачы рэкламы ў серыялах змяніліся — яна «схавалася» ў рэчах, якімі карыстаюцца і якія спажываюць героі (тэхніка, адзенне, напоі і г. д.). Глядач не толькі сочыць за сюжэтам і перажывае за герояў, але і праграмуецца на спажыванне знаёмых з серыялаў брэндаў. Акрамя продажу рэкламы серыялы могуць выконваць і іншыя фунцыі, у тым ліку адукацыйныя. Менавіта праз серыялы ў розныя гады адбывалася павышэнне інфармаванасці насельніцтва ЗША пра сімптомы захворванняў і першую дапамогу (вядомыя медыцынскія серыялы «Хуткая дапамога», «Клініка», «Анатомія Грэй») [2].

Адзначым таксама, што вялікая колькасць серыялаў ствараецца на палітычную замову, што часта адлюстроўваецца ў вельмі далёкіх ад гісторыі і гістарычных ведаў прапагандысцкіх эпапеях. Таму праца з серыяламі можа быць надзвычай карысная для развіцця крытычнага стаўлення да гістарычнай інфармацыі ў медыя і ўменняў яе аналізаваць і ацэньваць. Прадуктыўнай мусіць быць даследчая праца, падчас якой вучні правядуць апытанне сваіх бацькоў і равеснікаў пра іх серыяльныя перавагі, знойдуць інфармацыю пра гэтыя серыялы (стваральнікі, рэйтынгі, рэцэнзіі крытыкаў, касавыя зборы).

Аналіз серыялаў дае разуменне, што некаторыя даступныя для шырокай аўдыторыі вобразы з'яўляюцца інструментам палітычнага ўздзеяння і прапаганды. Карыснае навучальнае відэа «Што трэба ведаць пра серыялы» рэкамендуем паглядзець на канале YouTube Nastaunikinfo (гл. плэйліст «Медыяадукацыя»).

На ўроку нестае магчымасцяў глядзець працяглыя фільмы цалкам. Таму настаўнік можа прапанаваць вучням азнаёміцца з кінастужкай дома, а абмеркаваць яе ў класе, на ўроку. Добрым варыянтам будзе праца з урыўкам фільма. Гэта пабуджае да аналізу і інтэрпрэтацый значна мацней, чым фільм цалкам.

Калі настаўнік вырашыць выкарыстаць фрагмент фільма, ён можа сюжэт стужкі адсунуць на задні план і працаваць толькі з асобнай сцэнай. Тут можна засяродзіцца на дэталях: напрыклад, апісаць персанажаў, іх узаемаадносіны, асяроддзе. У гэтым выпадку не настолькі важнае дзеянне фільма, як асобныя гістарычныя элементы (напрыклад, канкрэтныя рысы гістарычнай эпохі).

### *Практыкаванне «Аналіз фрагмента фільма»*

***#аналіз_медыятэксту #медыяспажыванне***
***#работа_ў_парах #групавая_дзейнасць***

***Мэта**: удзельнікі зразумеюць, якім чынам фільм рэпрэзентуе пэўную гістарычную эпоху ці падзею.*

***Ход практыкавання.** Пасля прагляду фрагмента фільма вучні адказваюць на пытанні ў парах ці групах, потым адбываецца калектыўнае абмеркаванне. Пытанні вучням можа задаваць настаўнік, а вучні могуць самастойна працаваць з рабочымі аркушамі; магчымая і праца*

*ў групах, а найлепшым будзе калектыўнае абмеркаванне. У выпадку канфрантацыі поглядаў аднакласнікаў навучэнцы ўмацоўваюць свае навыкі аргументацыі.*

***Пытанні***

- *Якая галоўная тэма фрагмента? Прыдумайце для яго назву.*
- *Дзе адбываецца дзеянне ўрыўка? Апішыце сцэну.*
- *Апішыце асобных персанажаў, паказаных у фрагменце. Назавіце іх і дайце ім ацэнку: якія з іх з'яўляюцца станоўчымі, а якія — адмоўнымі.*
- *Якія кінематаграфічныя прыёмы былі выкарыстаны (праца аператара, мантаж, музычнае суправаджэнне)?*
- *Ацаніце, як суадносіцца фрагмент з гістарычнай рэчаіснасцю.*

***Важна**, што пры працы з фільмам не існуе дрэнных адказаў: яны адрозніваюцца ў першую чаргу глыбінёй аналітычнага погляду і ўстойлівасцю інтэрпрэтацыйных канструкцый [4, с. 153].*

Настаўнік ні ў якім разе не павінен спадзявацца на тое, што выкарыстанне фільма стане панацэяй. Наадварот, перад і пасля прагляду стужкі павінны прапаноўвацца іншыя віды дзейнасці. Неабходна супрацьпаставіць матэрыял іншым крыніцам гістарычнай інфармацыі. У выпадку з найноўшай гісторыяй гаворка можа ісці, напрыклад, пра гутарку са сведкам. Прапануючы паглядзець гістарычны фільм, можна даць вучням заданне вызначыць дакладнасць ці недакладнасць паказу гістарычных падзей у папулярных фільмах (праверыць факты, якія яны ўбачылі ў серыяле, параўнаць іх са сведчаннямі родных або супаставіць з дакументальным фільмам).

Адзначым, што, працуючы з любымі кінатэкстамі, настаўніку найперш трэба думаць не пра тое, якую гістарычную інфармацыю атрымаюць навучэнцы, а пра тое, якія навыкі і ўменні яны ўдасканаляць. Вучні павінны ведаць, як ствараецца кіно, разумець яго мову, выяўляць, якімі сродкамі перакanання дасягаецца эфект праўдзівасці, як ствараецца ілюзія рэальнасці.

### *Як можна расказаць гісторыю краіны за 5 хвілін?*

**Анімацыя** — від кінамастацтва, творы якога ствараюцца шляхам здымання паслядоўных фаз рухаў намаляваных або аб'ёмных аб'ектаў (графічная або аб'ёмная мультыплікацыя). Існуе шмат анімацый на гістарычную тэматыку, якія маюць высокі дыдактычны патэнцыял.

Большасць анімацыйных ролікаў невялікія, таму ёсць выдатныя магчымасці паглядзець іх на ўроку цалкам. Шмат мультфільмаў створана паводле міфаў, тэксты якіх ёсць у вучэбных дапаможніках (Старажытная Грэцыя, Рым, Індыя і інш.). Такім чынам, на ўроках існуюць выдатныя ўмовы для навучання параўнальнаму аналізу медыятэкстаў. Прапануем практыкаванне, распрацаванае па матэрыялах настаўніцы з Глыбокага І. Шымко.

### *Практыкаванне «Параўноўваем тэкст і экранізацыю»*

***#аналіз_медыятэксту #медыяспажыванне***
***#стварэнне_медыяпрадукту #групавая_дзейнасць***

***Мэты**: удзельнікі ўдасканаляць свае аналітычныя навыкі шляхам параўнання розных медыятэкстаў: мультфільма «Праметэй» і тэксту міфа з вучэбнага дапаможніка.*

***Ход практыкавання.** У якасці дамашняга задання навучэнцам было прапанавана паглядзець мультфільм «Праметэй» (рэжысёр А. Сняжко-Блоцкая, «Саюзмультфільм», 1974), прачытаць міф пра Праметэя і выканаць заданні ў групах:*

***сцэнарысты**: напісаць кароткі сцэнар трэйлера (кароткі анонс) мультфільма пра Праметэя;*

***афарміцелі***: *стварыць постар (афішу) да мультфільма;*
***стваральнікі комікса***: *намаляваць кароткі комікс паводле міфа.*
***Крыніца відэа***: *мультфільм «Праметэй» на канале «Саюзмультфільм» на YouTube.*
***Ключавое пытанне для абмеркавання.*** *Што агульнага паміж багамі Грэцыі і людзьмі?*

***Пытанні для абмеркавання мультфільма і міфа ў класе***

- *Якую ідэю хацелі данесці да гледачоў аўтары мультфільма?*
- *Якія для гэтага былі выкарыстаны сродкі (свет, колер, музыка, сімвалы)?*
- *Якія моманты ў мультфільме выклікалі ў вас спачуванне, асуджэнне? Чаму?*
- *Якія словы Праметэя, на ваш погляд, адлюстроўваюць ідэю мультфільма або маглі б стаць яго дэвізам?*
- *Ці ўтрымліваюцца ў міфе думкі, якіх няма ў мультфільме, і наадварот?*
- *Ці супадае ідэя мультфільма з ідэяй міфа?*

***Прэзентацыі групавых работ і іх абмеркаванне***

- *Які ўрок даў нам Праметэй?*
- *Які ўрок нам далі аўтары мультфільма?*

*Пасля абмеркавання настаўнік звяртае ўвагу на ключавое пытанне, пастаўленае ў пачатку ўрока, і прапануе адказаць на яго [5].*

Вялікую цікавасць выклікаюць анімаваныя гісторыі Літвы, Беларусі, Польшчы і Латвіі (невялікія ролікі працягам ад 5 да 7 хвілін вельмі зручна параўноўваць). Менавіта на іх прыкладзе мы разгледзім асноўныя аспекты работы з анімацыйнымі ролікамі.

У табл. 18 адлюстраваны асноўныя этапы падрыхтоўчай работы настаўніка і змешчаны сістэматызаваныя звесткі пра анімацыйныя ролікі, якія будуць карысныя падчас распрацоўкі ўрокаў па гэтым матэрыяле.

Ключавое пытанне ***«Як можна расказаць гісторыю краіны за 5 хвілін?»*** дазваляе засяродзіцца не толькі на сродках анімацыі, якія робяць гэта магчымым (з акцэнтам на мову і тэхналогіі медыя ў аўдыявізуальным тэксце). Каб адказаць на гэта пытанне, неабходна ведаць ці даведацца пра гістарычныя факты, даты падзей, імёны персаналій, асноўныя паняцці. Падчас працы з ролікамі ўзнікае патрэба адказаць на наступныя пытанні, якія паспрыяюць дасягненню навучальнай мэты па засваенні зместу вучэбнага прадмета.

- *Чаму ў роліку ўзгадваюцца менавіта гэтыя падзеі (асобы, даты і інш.)?*
- *Як візуалізуюцца выбраныя падзеі і персаналіі?*
- *Што з пералічанага я не ведаў?*
- *Што ёсць у школьным вучэбным дапаможніку, а чаго няма? Чаму?*

*Табліца 18*

**Інфармацыя па анімацыйных роліках для настаўніка**

| Пытанні для аналізу | Анімаваная гісторыя Літвы | Анімаваная гісторыя Польшчы | Анімаваная гісторыя Латвіі | Анімаваная гісторыя Беларусі |
|---|---|---|---|---|
| Калі і як ролік быў створаны? | У 2016 г. з’явіўся анімацыйны ролік на трэк рэп-выканаўцы Šventinis bankuchenas | У 2010 г. створаны па замове Польскага агенцтва развіцця прадпрымальніцтва для міжнароднай выставы ў Шанхаі EXPO 2010 | Ролік «Латыш» зняты ў 2007 г. студыяй анімацыйных фільмаў «Animācijas Brigāde» | У 2011 г. грамадская культурніцкая кампанія «Будзьма беларусамі!» прэзентавала фільм «Будзьма беларусамі!» |

| Пытанні для аналізу | Анімаваная гісторыя Літвы | Анімаваная гісторыя Польшчы | Анімаваная гісторыя Латвіі | Анімаваная гісторыя Беларусі |
|---|---|---|---|---|
| Хто яго аўтары? | Ілюстратар А. Папартытэ, мультыплікатар А. Альчаўскас | Мультыплікатар Т. Багінскі, гісторык Х. Самсановіч | Рэжысёр Я. Цымерманіс, мультыплікатар М. Путніньш | Ідэя Ю. Ляшкевіч, мультыплікатар Ю. Рудзіцкая, тэкст песні і музыка Л. Вольскага, вакал — А. Памідораў |
| Што гавораць стваральнікі пра свой прадукт | Рэп-перадача стэрэатыпаў у гістарычным кантэксце падзей у Літве была даволі пацешнай ідэяй | Важныя моманты ў нашай гісторыі праз асацыяцыі, сімвалы. Чаму мы ведаем тое, што мы еўрапейскі народ — палякі? | З анатацыі: гісторыя Латвіі падаецца праз гісторыю селяніна, які жыве на сваім хутары | Праект мае на мэце зацікавіць беларускай гісторыяй і культурай шырокае кола людзей, таму што менавіта гэтыя каштоўнасці сёння могуць аб'яднаць такіх розных беларусаў |
| Спасылка на ролік на YouTube | https://youtu.be/V4veBuE_QA0 | https://youtu.be/qr6Q0BpmyG0 | https://youtu.be/4AVWtxGdoD4 | https://youtu.be/jGEM5qtZxaw?list=RDoDvx3E2_kOc |

Працаваць з анімацыйнымі ролікамі гістарычнага зместу можна як з вучнямі 6-га класа на падзейна-храналагічным узроўні, так і з дзесяцікласнікамі — на праблемна-тэарэтычным. Пытанні па асаблівасцях медыятэкстаў таксама будуць адрознівацца. Перад праглядам ролікаў трэба звярнуць увагу вучняў, што на адну і тую ж тэму можна зняць як жартаўлівы анімацыйны фільм, так і сур'ёзны, нават трагічны. Пры неабходнасці варта патлумачыць галоўныя адрозненні гумару, іроніі і сатыры як відаў камічнага (вучні старэйшых класаў павінны гэта вызначыць самастойна) і засяродзіць увагу на музычных жанрах.

Для таго каб матываваць вучняў на прагляд і параўнанне ролікаў, можна прапанаваць ім праблемнае пытанне — скрыншот кадра ці невялікі фрагмент роліка.

Мэтазгодна правесці параўнанне ролікаў: адказаць на пытанні і запоўніць табліцу.

### ***Параўноўваем анімацыйныя ролікі***

*Якая падзея агульнай гісторыі нашых краін адлюстравана на гэтых скрыншотах? Праз якія асацыяцыі (метафары) паказаны прычыны і наступствы гэтай падзеі? З ролікаў якіх краін узятыя скрыншоты?*







***Каментарый для настаўніка.*** *У польскім і беларускім ролікаў паказаны прычыны, падзеі і наступствы падзелаў Рэчы Паспалітай. Асноўныя асацыяцыі — гульня ў казіно і адрэзаныя кавалкі пірага.*

***Пытанні для параўнання ролікаў***

1. Якія даты пералічаны ў фільме? Чаму менавіта гэтыя даты лічацца важнымі?

2. Каго з гістарычных дзеячаў вы пазналі? Па якіх прыкметах?

3. Якія сімвалы выкарыстоўваюцца стваральнікамі ролікаў?

4. Якія падзеі агульнай гісторыі паказваюцца ў роліках? Чым яны адрозніваюцца ў розных роліках? Чаму вы так лічыце?

На ўроках грамадазнаўства існуюць выдатныя магчымасці ўмацоўваць міжпрадметныя сувязі, выкарыстоўваючы анімацыйныя ролікі цалкам падчас вывучэння тэмы «Чалавек і гісторыя». З дапамогай гэтых медыятэкстаў магчыма не толькі featуразнабакова разглядаць пытанні ролі асобы ў гістарычным працэсе, але і вызначаць прычыннавыніковую абумоўленасць ходу гістарычных падзей (эвалюцыйны ці рэвалюцыйны шлях).

Для дасягнення пастаўленай навучальнай мэты неабходна прааналізаваць паказаныя ў анімаваных гісторыях Літвы, Латвіі, Польшчы і Беларусі персаналіі. Вынікам працы можа быць калаж са скрыншотаў выяў персаналій у роліках (візуальныя сродкі). Акрамя візуалізацыі трэба ўважліва разгледзець музычнае суправаджэнне. Напрыклад, словы песні «Францыск Скарына — канкрэтны мажор» — гэта станоўчая ці адмоўная характарыстыка дзеяча? Чаму вы так лічыце? Вельмі важным складнікам працы з ролікамі з’яўляецца разуменне таго, што адна і тая ж гістарычная асоба ў розныя перыяды і ў розных краінах можа ацэньвацца як герой і як антыгерой.

***Герой ці антыгерой?***

*Як (станоўча ці адмоўна) паказаны гістарычныя персоны на скрыншотах? Чаму вы так лічыце? Якімі сродкамі гэта дасягнута? Што гэта за гістарычныя персоны? Чаму іх так паказалі?*







***Каментарый для настаўніка****: на скрыншотах М. Мураўёў, Гедзімін (анімаваная гісторыя Літвы), П. Машэраў (анімаваная гісторыя Беларусі). Звярніце ўвагу на тое, як у роліках «працуюць» семкі, грошы і кветкі.*

Вынікі работы над медыявобразамі гістарычных асоб неабходна занесці ў параўнальную табліцу для іх эфектыўнага абмеркавання.

*Параметры для параўнальнай табліцы*

1. Гістарычныя асобы, роля якіх ацэньваецца станоўча (сродкі).
2. Гістарычныя асобы, роля якіх ацэньваецца адмоўна (сродкі).
3. Гістарычныя асобы, роля якіх ацэньваецца няпэўна, нейтральна (сродкі).

Старшакласнікі могуць прааналізаваць і параўнаць ролікі, адказаўшы на ўсе пытанні для аналізу медыятэксту (значна эфектыўней папрацаваць у групах, аформіць адказы пісьмова, скарыстацца метадам узаемаправеркі з дапамогай настаўніка-кансультанта). Асабліва важна паспрабаваць вызначыць і абмеркаваць галоўныя ідэі (ці меседжы) медыятэкстаў. Мэтазгодна таксама прагледзець каментарыі на YouTube пад апублікаванымі ролікамі.

## *Ці можа відэа быць сведчаннем гістарычнай падзеі?*

Нашы вучні часта ствараюць уласны медыякантэнт — здымаюць і публікуюць у сацыяльных сетках, на ўласным YouTube-канале рознае відэа, як правіла, побытавай тэматыкі і забаўляльнага характару. Настаўнік у якасці альтэрнатывы можа прапанаваць вучням паўдзельнічаць у запісе інтэрв'ю з відавочцам гістарычных падзей, што можа стаць для навучэнцаў не толькі пачаткам сур'ёзнай даследчыцкай дзейнасці па вуснагістарычным метадзе, але і магчымасцю істотна павысіць узровень іх медыяінфармацыйнай пісьменнасці.

Перад пачаткам дзейнасці карысна растлумачыць вучням, якую ролю сярод гістарычных крыніц адыгрывае вусная гісторыя (яе плюсы і мінусы). Зрабіць гэта можна праз наступныя пытанні.

- *Што мы можам даведацца пра чалавека і гісторыю з апавяданняў асобных людзей?*
- *Што можа адсутнічаць у такім апавяданні, а што, наадварот, мы нідзе больш не знойдзем?*
- *Што і якім чынам мы памятаем з таго, што мы перажылі? Якія фактары на гэта ўплываюць?*
- *Што з таго, што мы памятаем, мы расказваем?*
- *Як на нашы апавяданні пра мінулае ўплывае сучаснасць і падзеі, што адбыліся пасля таго моманту, пра які мы апавядаем?*
- *Як на іх уплывае тое, хто слухае апавяданне і хто задае пытанні?*

Дзякуючы аповеду сведкі прыходзіць разуменне неадназначнасці гісторыі, у працэс навучання пранікаюць эмоцыі, гісторыя набывае аблічча. Аповед сведкі, зразумела, мае і свае недахопы. Чалавек распавядае пра гістарычныя падзеі з уласнага пункту гледжання, скрозь прызму сваёй палітычнай, рэлігійнай або маральнай арыентацыі. Да таго ж характар чалавечай памяці зменлівы, і сведкі не заўсёды бываюць здольныя ўспомніць канкрэтныя абставіны, таму гэту інфармацыю трэба правяраць у іншых крыніцах. Роля настаўніка заключаецца ў актывізацыі крытычнай рэфлексіі вучняў, якія заўсёды павінны задумвацца над тым, хто — з якой пазіцыі і чаму — распавядае ім пра дадзеныя падзеі (гл. табл. 19).

**Мэты працы з аповедам сведкі:**

- *вучань развівае крытычнае мысленне, вучыцца аддзяляць факты ад меркаванняў, правяраць інфармацыю ў розных крыніцах;*
- *навучэнец успрымае гісторыю ў кантэксце і ўсведамляе плюралізм меркаванняў, поглядаў і інтэрпрэтацый;*
- *школьнік навучаецца дыялогу пакаленняў, стварае ўласную сістэму каштоўнасцяў.*

*Табліца 19*

**Паслядоўнасць работы са сведкам або аўдыявізуальным сведчаннем**

| Этапы | Змест дзейнасці |
|---|---|
| **1. Кантэкст** | Неабходна растлумачыць вучням, з кім яны сустрэнуцца (хто гэта, якім было яго жыццё, калі ён нарадзіўся і чаму мы прывялі яго на ўрок) |
| **2. Ход сустрэчы** | Дазвольце сведку распавядаць, а затым дайце вучням магчымасць задаць свае пытанні. У выпадку працы з аўдыявізуальным сведчаннем прагледзьце запіс двойчы. У першы раз заданнем кожнага вучня будзе адзначыць наступнае.<br>• Мяне здзівіла, што…<br>• Я не зразумеў…<br>• Былі згаданыя паняцці, якіх я не ведаю…<br>У другі раз кожны вучань павінен засярodзіцца на сваёй тэме. Дазвольце ім абраць з паведамлення сведкі адну фразу або групу слоў, якая, на іх думку, характарызуе ўвесь аповед, ці выбраць ключавыя / цікавыя словы |
| **3. Рэфлексія** | Пасля размовы са сведкам або прагляду відэасведчання трэба правесці сумесны аналіз, пры якім вы з вучнямі абмяркуеце падобныя або розныя інтэрпрэтацыі, якія вы пачулі, і падкрэсліце неадназначнасць гісторыі.<br>***Пытанні, якія можна задаваць пры рэфлексіі сведчання***<br>• Якая тэма ўрыўка / гутаркі?<br>• Як распавядае сведка? Якія эмоцыі вы адчулі?<br>• Што паўплывала на яго апісанне і ацэнку эпохі?<br>• Ці ёсць супярэчнасці ў яго расповедзе?<br>• Дзе мы можам праверыць праўдзівасць расказанага?<br>• Чым адрозніваецца аповед сведкі ад гістарычнай рэальнасці? У якой ступені яго сцвярджэнні адпавядаюць таму, што вы ведалі раней? [6, с.10] |

Існуюць тры асноўныя магчымасці ўключэння работы з вуснымі гістарычнымі крыніцамі ў навучанне:

- *запрашэнне на размову сведкі — відавочцы падзей (вядомага мясцовага жыхара ці члена яго сям'і, удзельніка канкрэтнай падзеі). У гэтым выпадку варта папярэдне звязацца з ім і дэталёва абмеркаваць ход і, што важней за ўсё, мэты і чаканні, якія павінна апраўдаць гэта сустрэча;*
- *арганізацыя дзейнасці ў класе з запісам пісьмовага ці аўдыявізуальнага сведчання з архіваў. Зніжэнне аўтэнтычнасці кампенсуецца магчымасцю настаўніка загадзя падрыхтавацца да таго, як ён хоча працаваць з матэрыялам і якія ўрыўкі выкарыстае ў навучанні;*
- *заданне (напрыклад, даведацца, як у сям'і раней адзначалі Вялікдзень ці Каляды), для выканання якога вучням трэба распытаць членаў сваёй сям'і (і зрабіць запіс на аўдыя ці відэа). На ўроку можна засяродзіцца на рабоце з вынікамі — параўноўваць успаміны і больш дэталёва разбіраць розныя пункты гледжання.*

У працэсе падрыхтоўкі вучні не толькі даведаюцца пра арганізацыю, правядзенне і тэхнічнае забеспячэнне інтэрв'ю, але і навучацца задаваць пытанні і слухаць адказы, карыстацца апытальнікам, праводзіць расшыфроўку (транскрыбаванне — перавод аўдыясведчання ў пісьмовую форму) і публікацыю інтэрв'ю [7].

Звяртаем увагу на ўнікальны рэсурс — Беларускі архіў вуснай гісторыі (http://www.nashapamiac.org/archive/home). Гэта анлайн-сховішча электронных дакументаў па вуснай гісторыі Беларусі XX ст., да якіх арганізаваны доступ з мэтай захавання і спрыяння іх шырокаму выкарыстанню ў даследчыцкіх і адукацыйных мэтах. Гісторыя Беларусі XX ст. фіксуецца ва ўспамінах сведкаў часу, дапамагаючы захаванню памяці пра найноўшы перыяд гісторыі,

у тым ліку па маладаследаваных і актуальных тэмах. На сайце праекта Беларускага архіва вуснай гісторыі можна спампаваць метадычныя матэрыялы па арганізацыі і правядзенні інтэрв'ю, запісе ўспамінаў, іх расшыфроўцы [7], [8].

Для павышэння медыяадукацыйнай эфектыўнасці вынікі работы са сведкамі падзей можна параўнаць з медыявобразамі падзей у СМІ (газеты, у тым ліку «Правда», «СБ. Беларусь сегодня», «Звязда» і інш., інфармацыйныя парталы, беларускае тэлебачанне, прэса), з успамінамі іншых відавочцаў.

Неабходна зрабіць аналіз і параўнанне таго, што і як пісалі СМІ пра падзею ў час, калі яна адбывалася, з тым, што пішуць цяпер, і як гэта суадносіцца з успамінамі відавочцаў падзей (напрыклад, што сведкі памятаюць пра пэўныя ваенныя падзеі і першыя пасляваенныя гады, правядзенне меліярацыі, пуск першай лініі метро ў Мінску, як даведаліся пра аварыю на Чарнобыльскай АЭС і інш.). Звяртаем увагу на выдатныя электронныя рэсурсы, на якіх можна знайсці старыя газеты:

- *электронны архіў нацыянальнай перыёдыкі на сайце Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь (http://per.nlb.by/gazety);*
- *сайт «Старые газеты» (https://www.oldgazette.ru).*

Для арганізацыі на ўроках эфектыўнай работы з відэазапісамі ўспамінаў сведкаў у комплексе з рознымі медыятэкстамі настаўнікам рэкамендуецца пазнаёміцца з дыдактычным дапаможнікам «Мінскае гета» (2018) [9]. Электронны варыянт дапаможніка размешчаны ў дадатковых матэрыялах па гісторыі Беларусі на нацыянальным адукацыйным партале adu.by.

### *Тэхнікі работы з відэа*

Можна вылучыць некалькі самых распаўсюджаных тэхнік работы з відэа. Разгледзім іх на прыкладзе параўнання скрыншотаў двух невялікіх ролікаў з сусветна вядомага дызайнерскага праекта «100 гадоў прыгажосці» («100 Years of Beauty», відэа даступныя на YouTube). У роліках на жанчынах-мадэлях з розных краін (Сабрына з Ірана і Ніна з ЗША) за 1 хвіліну дэманструюцца змены моды, стылю адзення, іміджу, якія адбыліся за стагоддзе. Гэтыя відэа мэтазгодна выкарыстаць на ўроках сусветнай гісторыі для вывучэння асноўных тэндэнцый развіцця краін Азіі і Афрыкі пасля Другой сусветнай вайны і параўнання іх з Заходняй Еўропай і Амерыкай (фокус — праблематызацыя ўзнікнення фундаменталісцкіх рухаў як адказ на выклікі глабалізацыі). Асноўныя тэхнікі работы з відэа прапануюцца ў табліцы са скрыншотамі відэа (гл. табл. 20).

**Што неабходна абавязкова ўлічыць, працуючы з відэа**

- *Пры планаванні заняткаў неабходна ўлічыць, што прагляд ролікаў на ўроках непасрэдна з YouTube у большасці школ абмежаваны (доступ да інтэрнэту ў пэўны час, невысокая хуткасць і г. д.).*
- *Варта разгледзець магчымасці «перакуленага ўрока»: загадзя даць навучэнцам неабходныя спасылкі на ролікі для іх дамашняга прагляду з пытаннямі для аналізу, а на ўроку паўнавартасна абмяркаваць хатнія напрацоўкі.*
- *Заданні вучням пры неабходнасці можна сфармуляваць з улікам часу на прагляд (з якой па якую хвіліну глядзець).*
- *Неабходна звярнуць увагу вучняў на магчымасць прагляду з субцітрамі (у наладках можна выбраць мову субцітраў) і карыстацца сэрвісамі анлайн-перакладу.*
- *Пры адсутнасці магчымасці дэманстрацыі ролікаў у класе зручна карыстацца скрыншотамі відэа.*

Табліца 20

**Тэхнікі работы з відэа**

<table>
<tr><th colspan="3">1. Стоп-кадр (на пэўнай хвіліне)</th></tr>
<tr><td colspan="2">Што мы бачым?<br>Што азначаюць гэтыя колеры, жэсты, сімвалы?</td><td>
</td></tr>
<tr><th colspan="3">2. Параўнанне кадраў</th></tr>
<tr><td>Дзе жанчына з ЗША, а дзе з Ірана?<br>Чым яны адрозніваюцца?<br>Што іх аб’ядноўвае?</td><td>
</td><td>
</td></tr>
<tr><th colspan="3">3. Прапануйце свой працяг пасля паўзы</th></tr>
<tr><td>
</td><td>ПАЎЗА<br>Што будзе далей?<br>Чаму ты так лічыш?</td><td>
</td></tr>
</table>

## *Навошта настаўніку ствараць відэаўрокі*

Выкарыстанне аўдыявізуальных матэрыялаў на ўроках патрабуе ад настаўніка стварэння адпаведнага банка ролікаў (напрыклад, магчыма стварэнне плэйліста ролікаў на YouTube ці захоўванне неабходных для працы фрагментаў у воблаку) і распрацоўкі да іх сцэнараў правядзення ўрокаў. Настаўнікамі сёння запатрабаваны метадычныя комплексы, якія павінны ўтрымліваць:

- *відэаўрокі (відэалекцыі);*
- *сцэнары правядзення ўрокаў да іх;*
- *неабходныя матэрыялы: картасхемы, табліцы і схемы, якія прапаноўваецца запоўніць вучням, тэксты з пропускамі, падборкі тэкстаў для арганізацыі практычнай работы і інш.*

Сёння многія педагогі актыўна займаюцца стварэннем відэакантэнту для ўрокаў і дзеляцца ім з калегамі. Звяртаем увагу на «Метадычны комплекс для вывучэння раздзела „Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці“» па гісторыі Беларусі з 8 відэаўрокаў (аўтар — С. Сяргеева), якія знаходзіцца ў свабодным доступе на адукацыйным партале *настаўнік.інфо* (http://www.nastaunik.info/node/15396).

**Літаратура і электронныя рэсурсы**

1. Міжнародная лабараторыя медыяпісьменнасці [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://medianavigator.org/. — Дата доступу: 20.04.2018.
2. *Почепцов, Г.* Как телесериалы превращают виртуальность в реальность / Г. Почепцов // Хвиля [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://hvylya.net/analytics/society/georgiy-pocheptsov-kak-teleserialyi-prevrashhayut-virtualnost-v-realnost.html. — Дата доступа: 20.04.2018.
3. *Дегтярьова, Г.А.* Граматика кіномови — 1 / Г.А. Дегтярьова, Л.М. Кульчинська, О.В. Волошенюк // Практична медіаосвіта: авт. уроки: збірка / ред.-упоряд. В.Ф. Іванов, О.В. Волошенюк; за наук. ред. В.В. Різуна. — К.: Акад. укр. преси: Центр віл. преси, 2013. — 447 с.
4. Медыяадукацыя ў школе: фарміраванне медыяграматнасці вучняў: дапам. для настаўнікаў / М.І. Запрудскі [і інш.]; пад рэд. М.І. Запрудскага. — Мінск, 2016.
5. *Шымко, І.* Рэлігія старажытных грэкаў, 5 клас // настаўнік.info [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.nastaunik.info/node/14876. — Дата доступу: 20.04.2018.
6. *Ваврова, Т.* Краткое пособие по преподаванию новейшей истории / Т. Ваврова, Ч. Пыха. — Прага, 2015.
7. *Раманава, І.* Уводзіны ў вусную гісторыю / І. Раманава // Беларускі архіў вуснай гісторыі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.nashapamiac.org/archive/home.html. — Дата доступу: 20.04.2018.
8. *Белановіч, А.* Метад «вусная гісторыя»: асноўныя падыходы і рэкамендацыі для правядзення інтэрв'ю / А. Белановіч // Беларускі архіў вуснай гісторыі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.nashapamiac.org/docs/BAVH%20-%20Oral%20History.%20A.%20Bielanovicz.pdf. — Дата доступу: 08.11.2018.
9. Минское гетто: дидакт. пособие / И. Бернат [и др.]. — Минск, 2018.

## 2.3. Навінныя і рэкламныя медыятэксты

*Сапраўдныя навіны —*
*дрэнныя навіны?*
*М. Маклюэн*

Выкарыстанне актуальных медыятэкстаў — навін і рэкламы (на радыё, па тэлебачанні, у прэсе і сацыяльных сетках) на ўроках гісторыі і грамадазнаўства і ў пазаўрочнай дзейнасці робіць выкладанне больш складаным для настаўніка (неабходна аператыўна прапрацоўваць актуальныя медыятэксты), але навучанне становіцца выключна практыка-арыентаваным і дынамічным.

Для таго каб навучыцца працаваць з навінамі, у першую чаргу трэба ведаць асноўныя правілы стварэння навін, а таксама жанры і стандарты **журналістыкі**. Адны журналісты працуюць з адкрытымі (даступнымі) крыніцамі інфармацыі, другія робяць сапраўдныя расследаванні, здабываючы інфармацыю з закрытых крыніц. У залежнасці ад віду медыя традыцыйна вылучаюцца друкаваная прэса, тэлежурналістыка, радыёжурналістыка [1, с. 61].

Перш за ўсё неабходна высветліць, што такое навіна і як яна ствараецца. Не кожная падзея становіцца навіной, а толькі тая, якая ўяўляе сабой актуальны факт, выклікае грамадскі інтарэс і можа зацікавіць шырокую аўдыторыю, г. зн. тыповага спажыўца канкрэтнага медыя.

Навіна мае загаловак, падводку да яе (на журналісцкай мове — лід) і адказвае на наступныя пытанні (формула **5W+1H**):

- *Што? (**W**hat?)*
- *Калі? (**W**hen?)*
- *Дзе? (**W**here?)*
- *Хто? (**W**ho?)*
- *Як? (**H**ow?)*
- *Чаму? (**W**hy?) (пашыраная навіна) [3].*

Структура навіны ўяўляе сабой перакуленую піраміду (мал. 9).




*Мал. 9. Структура навіны*

Настаўнік можа арганізаваць сістэму работы з навінамі — запаўненне табліцы па асноўных пытаннях і параўнанне, як адна і тая навіна падаецца ў розных медыятэкстах.

| Медыятэкст | Што? | Калі? | Дзе? | Хто? | Як? | Чаму? |
|---|---|---|---|---|---|---|

Падкрэслім, што на ўроках грамадазнаўства асноўнай практыкай становіцца аналіз актуальнай навіны, а на ўроках гісторыі мэтазгодна прааналізаваць, як напісалі (ці не напісалі) газеты пра гістарычную падзею.

## *Пытанні для абмеркавання*

- *Якія падабенствы і адрозненні вы заўважылі ў мове і змесце навін? Чым яны абумоўлены?*
- *Ці аднолькавыя паведамленні па аб'ёме?*
- *Ці ёсць адрозненні ў тоне загалоўкаў?*
- *Якія выявы выкарыстаны і які іх памер?*
- *Які тон паведамлення: нейтральны або эмацыйны?*
- *Якія ёсць адрозненні ў стылі паведамленняў?*
- *Чые галасы можна пачуць у паведамленнях (калі гэта аўдыявізуальныя паведамленні)?*
- *Аднолькавыя ці розныя крыніцы і меркаванні экспертаў выкарыстаны ў навінах?*

Жанры журналістыкі падзяляюцца на інфармацыйныя, аналітычныя і публіцыстычныя (гл. табл. 21).

Галоўная прыкмета якаснага журналісцкага матэрыялу — баланс думак, прадстаўленасць не менш чым двух поглядаў на падзею, каб чытач меў поўную інфармацыйную карціну [1, с. 61–64]. Часта пад выглядам журналісцкага матэрыялу хаваецца рэклама. Надзвычай важна навучыцца адрозніваць рэпартаж і публіцыстычныя жанры (гл. табл. 22).

*Табліца 21*

**Жанры журналістыкі**

| | Інфармацыйныя | Аналітычныя | Публіцыстычныя |
|---|---|---|---|
| Прыклады жанраў | • Нататка<br>• інтэрв'ю<br>• рэпартаж | • Артыкул<br>• рэцэнзія<br>• журналісцкае расследаванне | • Нарыс<br>• фельетон<br>• памфлет |
| Што перадаецца | • Факты і звесткі | • Аналіз і ацэнка | • Вобраз і эмоцыя |
| Асноўная задача | • Фарміраванне ў чытача дакладнай карціны падзей | • Тлумачэнне чытачу прычын падзей, іх ацэнка | • Перадача настрою, пачуццяў, стварэнне атмасферы, стаўлення |

*Табліца 22*

**Рэпартаж і публіцыстыка**

| Рэпартаж | Публіцыстычныя жанры |
|---|---|
| Пазбаўлены эмоцый — лаканічна, дакладна асвятляе актуальныя і / або невядомыя падзеі | Скіраваны на кантакт з чытачом, на асэнсаванне рэчаіснасці шляхам спалучэння лагічнага і пачуццёва-вобразнага спосабаў даследавання і адлюстравання |
| Што? Дзе? Калі? | Чаму? Як? Навошта? |
| Факты, факты, факты | Факты, дапушчэнні, аргументы, высновы |
| Рэпартаж у газеце,<br>тэлерэпартаж,<br>радыёрэпартаж | Нарыс, эсэ, фельетон, замалёўка,<br>дакументальная драма, ток-шоу,<br>радыёнарыс, радыёзамалёўка |

Навінны рэпартаж павінен быць аб'ектыўным, у той час як публіцыстыка перадае меркаванне аўтара (ці пагаджацца з ім — залежыць ужо ад чытача). Вельмі важную ролю тут адыгрывае загаловак артыкула, які мае тры функцыі: прыцягнуць увагу, інфармаваць аб тэме і абудзіць цікавасць. Медыя часта выкарыстоўваюць ***клікбэйт*** — кідкі загаловак, які прываблівае чытача, але не дае яму патрэбную інфармацыю.

**Прыёмы стварэння загалоўка, які псіхалагічна «чапляе» ўвагу чытача:**

- *сфармуляваць яго ў выглядзе пытання;*
- *змясціць сенсацыю, сакрэт, інтрыгу;*
- *прапанаваць у загалоўку вырашэнне нейкай праблемы;*
- *дадаць лічбы;*
- *выклікаць страх;*
- *уступіць у дыялог з чытачом [3].*

## *Практыкаванне «Як працуюць загалоўкі»*

***#аналіз_медыятэксту #медыяспажыванне #навінная_пісьменнасць #індывідуальная_работа #дыскусія***

***Мэты***: *усведамленне функцыі загалоўкаў у медыя і прыёмаў, якія выкарыстоўваюцца для прыцягнення ўвагі аўдыторыі; вывучэнне структуры артыкула.*

***Абсталяванне***: *старыя газеты або часопісы, з якіх можна выразаць артыкул.*

***Ход практыкавання***. *Настаўнік выбірае артыкулы, якія адпавядаюць мэтам навучання і ўзроставай катэгорыі вучняў, рыхтуе нарэзку загалоўкаў, раздае ўдзельнікам і просіць іх напісаць невялікія артыкулы, якія б адпавядалі прапанаваным назвам (10–15 хвілін).*

*Пасля заканчэння працы настаўнік раздае арыгіналы артыкулаў і просіць удзельнікаў параўнаць іх са сваімі тэкстамі: наколькі падобнымі або непадобнымі атрымаліся артыкулы па змесце, стылі.*

***Абмеркаванне пытанняў у парах***

- *Для чаго служыць загаловак?*
- *Які загаловак можна лічыць удалым?*

*Настаўнік прапануе некальким удзельнікам выказаць свае меркаванні пра функцыі добрага загалоўка, астатнія дапаўняюць. Пасля невялікай дыскусіі настаўнік распавядае аб структуры артыкула: загаловак, лід, змест. Удзельнікі знаёмяцца з правіламі, якімі карыстаюцца журналісты пры напісанні артыкулаў, і разумеюць, што ўсе медыятэксты — канструкты. Кожная частка канструкцыі мае сваю мэту. Загаловак дапамагае чытачам хутка вызначыць, ці трэба ім артыкул і чаму яны павінны адкрыць старонку або купіць газету з гэтым кантэнтам.*

***Пытанні для абмеркавання***

- *Ці раскрывае загаловак тэму або галоўную думку вашага артыкула?*
- *Ці ўтрымлівае ён прыёмы, якія прыцягваюць увагу чытача?*

*Настаўнік просіць удзельнікаў прыдумаць новыя загалоўкі да сваіх артыкулаў, каб яны адначасова былі і «клікабельнымі», і інфарматыўнымі. Артыкулы з новымі загалоўкамі размяшчаюцца на стэндзе для агульнага азнаямлення [4].*

## *Фактчэкінг — запатрабаваны від вучэбна-пазнавальнай дзейнасці?*

Галоўная праблема сёння — перагружанасць навінамі, разнастайным кантэнтам з агрэгатараў і сацыяльных сетак. Вельмі небяспечнай з’яўляецца тэндэнцыя фарміравання навіннай карціны асобы толькі са стужкі ў сацыяльнай сетцы (напрыклад, Facebook ці «ВКонтакте»): сеткавыя алгарытмы не дазваляюць нам бачыць альтэрнатыўную, больш шырокую інфармацыю, таму што сацыяльная сетка ведае нашы густы і перавагі і паказвае дакладна тое, што нам будзе падабацца.

Звычайна самыя важныя навіны ідуць у інфармацыйным блоку на тэлебачанні першымі, а ў газетах для іх адводзіцца першая паласа. У сацыяльных сетках на першы план выходзіць тое паведамленне, якое часцей за ўсё перапошчваецца. Сярод такіх паведамленняў шмат плётак, неправеранай і хлуслівай інфармацыі.

***Постпраўда*** стала словам 2016 г. паводле версіі Оксфардскага слоўніка. Яно апісвае абставіны, у якіх аб’ектыўныя факты менш важныя для фарміравання грамадскай думкі, чым зварот да эмоцый і асабістых пераканання ў. Лічыцца, што ў эпоху постпраўды людзі вераць у тое, у што жадаюць верыць, і ідуць за аўтарытэтамі, замест таго каб кіравацца фактамі [5]. Настаўніку неабходна гэта ведаць і ўлічваць гэтыя вельмі важныя медыяаспекты ў сваёй працы.

Умець знаходзіць фэйкавыя навіны — адно з асноўных уменняў медыяпісьменнага чалавека, які ведае, як спажываць інфармацыю і правяраць інфармацыйныя крыніцы, і здольны меркаваць, якім навінам і рэсурсам можна давяраць. Такая дзейнасць атрымала назву ***фактчэкінг*** (гл. табл. 23 і памяткі 7 і 8 для вучняў на с. 92–93).

*Табліца 23*

**Чэкліст: на што трэба звярнуць увагу пры чытанні навін?**

| Правілы | Дзеянні |
|---|---|
| 1. Задавайце сабе пытанні пра эмоцыі | • Якія эмоцыі выклікае навіна: ці спрабуе раззлаваць, выклікаць абурэнне?<br>• Ці спрабуе гэта навіна нешта прадаць?<br>• Ці ёсць у тэксце занадта эмацыйныя сцвярджэнні, адмысловая пунктуацыя (накшталт «!!!!!») або сказы, НАПІСАНЫЯ ВЯЛІКІМІ ЛІТАРАМІ? |
| 2. Знайдзіце першакрыніцу | • Калі артыкул трапіўся вам у сацсетках, ці ведаеце вы, дзе ён быў апублікаваны ўпершыню?<br>• Ці ведаеце вы, хто чалавек, са старонкі якога вы даведаліся пра навіну? |
| 3. Уважлівей да фотаздымкаў | • Ці праілюстраваны тэкст малюнкамі, фота?<br>• Што хацеў сказаць карэспандэнт?<br>• З якога ракурсу зроблена фота?<br>• Пашукайце малюнак у сеціве праз images.google.com: магчыма, ён быў зроблены ў іншым месцы і не мае рэальнага дачынення да гэтай навіны? |
| 4. Не давярайце загалоўкам | • Сфарміраваць сваё меркаванне пра тэкст можна, толькі прачытаўшы яго цалкам |
| 5. Праверце медыя, якое апублікавала тэкст | • Ці вядомы гэты рэсурс?<br>• Ці падпісаны аўтар тэксту?<br>• Як пазіцыянуе гэты сайт сам сябе ў раздзеле «Пра нас» — можа, гэта сайт сатырычных навін?<br>• Ці ёсць рэальны e-mail рэдакцыі, які базуецца на дамене сайта, а не на паштовым сэрвісе (не editor@gmail.com альбо editor@yahoo.com)? |
| 6. Праверце дату публікацыі | • Якая дата публікацыі тэксту? Ці актуальны месяц, год? |
| 7. Якія крыніцы інфармацыі пазначаны ў артыкуле? | • Ці ёсць спасылкі на афіцыйныя рэсурсы, экспертнае меркаванне?<br>• Ці адпавядаюць цытаты тэме размовы? (Іншымі словамі, ці не ўзятыя яны з іншага кантэксту?) [6] |

Звяртаем увагу на навучальнае відэа «Як знайсці праўду ў навінах» (TED).

## *Рэклама — гэта добрыя навіны?*

У сучасным свеце з рэкламнымі медыятэкстамі мы сустракаемся кожны дзень: яны гучаць па радыё і з тэлеэкранаў, адкрываюцца на сайтах, заклікаюць з білбордаў, прапануюць тавар ці паслугу ў SMS-паведамленнях і г. д. Рэклама «хаваецца» пад выглядам аналітычнага артыкула ў газеце, у брэндах і таварах, якія выкарыстоўваюць героі нашых улюбёных серыялаў, і інш.

Вылучаюць тры асноўныя разнавіднасці рэкламы — камерцыйную, сацыяльную і палітычную.

**Камерцыйная (эканамічная) рэклама.** Адрасатам эканамічнай рэкламы з'яўляецца спажывец (патэнцыйны пакупнік), прапанаваўшы тавар якому, можна атрымаць ад яго наўзамен прыбытак.

**Сацыяльная рэклама** выходзіць за рамкі эканамічных задач, накіравана на дасягненне дабрачынных і іншых грамадска карысных мэт: папулярызацыю здаровага ладу жыцця сярод насельніцтва, падтрымку неабароненых пластоў насельніцтва, барацьбу з забруджваннем навакольнага асяроддзя, папулярызацыю грамадскіх арганізацый і фондаў, мэтай якіх з'яўляецца дапамога неабароненым групам людзей.

**Палітычная рэклама** (у тым ліку перадвыбарчая). У наш час яна ўсё часцей выступае як сродак барацьбы за выбаршчыкаў, за іх галасы. Менавіта з яе дапамогай некаторыя партыі і палітыкі спрабуюць заваяваць сабе месца ва ўладзе.

Рэклама як медыятэкст мае шырокі дыяпазон магчымасцяў выкарыстання на ўроках гісторыі і грамадазнаўства падчас вывучэння асноўных сфер жыцця грамадства, сацыяльных і палітычных працэсаў, культуры.

***Што рэкламуюць на этыкетках запалак?***

*Чаму ў СССР на этыкетках пачкаў запалак часта можна было ўбачыць рэкламу паслуг і агітацыйныя матэрыялы? Якую рэкламу можна сёння сустрэць на этыкетках запалак?*










***Каментарый для настаўніка.*** *Этыкеткі ад запалак нярэдка ўжываліся ў якасці агітацыйнага матэрыялу: прапаганды здаровага ладу жыцця, захавання супрацьпажарнай бяспекі, беражлівасці, аховы прыроды, прадухілення парушэнняў правілаў дарожнага руху і інш. На запалках часта можна было ўбачыць рэкламу паслуг страхавання, пошты, пасажырскіх перавозак і падпіскі. Запалкі належалі да тавараў першай неабходнасці і былі ў кожнай хаце.*

Разглядаючы рэкламныя ролікі, неабходна разумець, як у іх «працуюць» сюжэт, дзейныя асобы (героі), слоган. Асноўныя асаблівасці тут такія:

- *кожны з элементаў мэтанакіравана ўздзейнічае на гледача;*
- *сучасная рэклама рэкламуе нешта большае, чым проста прадукт, — тое, што на самай справе можа быць цікава чалавеку;*
- *надзейны спосаб выклікаць цікавасць да прадукту — гэта ўздзейнічаць на патрэбы і выгадна прэзентаваць звязаныя з гэтымі патрэбамі каштоўнасці.*

Напрыклад:

- *патрэбы ў прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы і ў пазітыўных міжасобасных кантактах звязаны з такімі каштоўнасцямі, як сям'я, каханне, сяброўства;*
- *патрэбы ў павазе і прызнанні звязаны з такімі каштоўнасцямі, як поспех, прэстыж;*
- *патрэбы ў самаактуалізацыі звязаны з такімі каштоўнасцямі, як свабода, імідж, здароўе, прыгажосць, дасведчанасць.*

### *Як рэклама ўздзейнічае на спажыўца?*

*Параўнайце асноўныя прыёмы ўздзеяння рэкламы Coca-Cola. Чым адрозніваецца рэклама пачатку XX ст. ад рэкламы пачатку XXI? Што засталося нязменным?*










***Крыніца**: Coca-Cola в модных журналах и постеры (http://steampunker.ru/blog/history/1539.html)*

Адзначым, што рэклама ўтрымлівае вялікую колькасць маніпуляцый для схаванага ўздзеяння на спажыўца і транслюе стэрэатыпы (часцей за ўсё выкарыстоўваюцца гендарныя, узроставыя і прафесійныя стэрэатыпы). Можна прапанаваць вучням паназіраць і занесці ў табліцу, як у рэкламе паказаны дзяўчынкі / дзяўчаты / жанчыны і хлопчыкі / юнакі / мужчыны. Потым абмеркаваць наступныя пытанні.

1. Якія характэрныя рысы можна вылучыць у тыповых жаночага і мужчынскага вобразаў у рэкламе?
2. Як вы лічыце, ці адпавядаюць гэтыя вобразы рэальнасці? Ці сустракаюцца яны ў вашым жыцці, асяроддзі, сям'і?
3. Ці ўплывае рэклама на наш светапогляд? [7, с. 26]

### *Якімі медыя паказваюць мужчын і жанчын?*

*Што і як прадае гэта рэклама? Хто ў рэкламе з'яўляецца суб'ектам дзеяння, а хто паказаны як аб'ект? Якімі сродкамі гэта дасягнута?*







**Каментарый для настаўніка.** Людзі ў рэкламе могуць быць паказаны як суб'екты і як аб'екты.
***Крыніца фота**: Ёран Андэрсан. Інтэрнэт — гэта не сметніца, а інструмент фарміравання крытычнага мыслення (http://www.nastaunik.info/node/15218)*

Па меркаванні шведскага медыяэксперта Ё. Андэрсана, дзейсны спосаб знайсці гендарныя стэрэатыпы ў медыя — задаць сабе пытанні: хто, дзе і як? (табл. 24).

*Табліца 24*

**Пытанні для выяўлення гендарных стэрэатыпаў у рэкламе**

| | |
|---|---|
| **Хто?** | У якой ролі выступае асоба, якую прэзентуюць медыя: у якасці эксперта або спікера? Прыватнай асобы або прафесіянала? Хатняй гаспадыні ці спартыўнай зоркі? |
| **Дзе?** | У якім асяроддзі знаходзіцца чалавек, якога фатаграфуюць ці пра якога пішуць: на працы, дома на канапе, на кухні, у трэнажорнай зале? |
| **Як?** | Як чалавек паказаны: як актыўны або пасіўны? Як ахвяра падзей або як стваральнік падзей? Усміхаецца або турбуецца? Ці падаюцца яго / яе поўнае імя і пасада? Ці змяняецца назва пасады па родах або ўжываецца мужчынскі род (дырэктар, паэт, настаўнік)? [8] |

Для разумення вучнямі механізмаў стымулявання масавага спажывання ў сучасным грамадстве трэба разабрацца, як рэклама навязвае стандарты прыгажосці. Мэтазгодна выканаць практыкаванне «Штучная прыгажосць».

## *Практыкаванне «Штучная прыгажосць»*

***#медыяспажыванне #аналіз_медыятэксту #рэклама #мазгавы_штурм #праца_ў_групах***

***Мэта**: навучыцца распазнаваць маніпуляцыі ў рэкламе, разумець тэхналогію стварэння рэкламнага прадукту.*

***Абсталяванне**: камп'ютар і праектар, з дапамогай якога можна паказаць відэаролік; папера для працы груп, аркуш для спісу топ-10; чатыры аркушы каляровай паперы розных колераў.*

***Ход практыкавання.** Настаўнік задае некалькі пытанняў, якія маюць па 4 варыянты адказаў. Кожнаму варыянту адпавядае таблічка з колерам, змешчаная на дошцы або фліпчарце, а ў кожным куце пакоя прымацаваны аркуш аднаго з прапанаваных колераў (метад «4 куты»). Удзельнікі стаяць у цэнтры памяшкання; калі настаўнік зачытвае пытанне з варыянтамі адказаў, яны ідуць у кут, які адпавядае іх выбару.*

*Для ўвядзення ў тэму «Што такое прыгажосць?» пытанні могуць быць наступнымі.*

*1. Прыгожы чалавек — гэта той, хто…*

*а) мае добрую прычоску і якасны макіяж (чырвоны колер);*

*б) модна апранаецца (жоўты);*

*в) мае правільныя рысы твару (сіні);*

*г) сочыць за сваёй знешнасцю і здароўем (зялёны).*

*2. Прыгожых людзей я часцей за ўсё бачу…*

*а) на тэлебачанні;*

*б) у глянцавых часопісах;*

*в) у інтэрнэце;*

*г) у паўсядзённым жыцці.*

*3. Чалавек, які рэкламуе тавар, павінен быць…*

*а) фотамадэллю;*

*б) акцёрам;*

*в) экспертам у дадзенай галіне;*

*г) звычайным чалавекам.*

*Настаўнік прапануе вучням скласці топ-10 прыгожых людзей, запісвае прапанаваныя адказы на дошцы або паперы і звяртае ўвагу ўдзельнікаў на тое, што да гэтага спісу яны вернуцца.*

*Пасля вучні праглядаюць відэаролік, які паказвае тэхналогію стварэння рэкламы, і абмяркоўваюць яго. Настаўнік прапануе правесці мазгавы штурм на тэму «Якая галоўная ідэя роліка?» і аб'ядноўвае ўдзельнікаў у 4 групы. Кожная з іх павінна даць адказ на адно з пытанняў, запісаць або намаляваць свае адказы на вялікім аркушы паперы і зрабіць прэзентацыю па выніках працы групы.*

***Пытанні для абмеркавання***

1. *Якія існуюць стэрэатыпы прыгажосці?*
2. *Якую ролю ў трансляцыі «ідэальнага вобразу» адыгрываюць медыя?*
3. *Складнікі сапраўднай прыгажосці — гэта…*
4. *Прывядзіце прыклады маніпуляцый медыя свядомасцю людзей.*

*На працу групам даецца 10 хвілін. Прэзентацыя вынікаў прадстаўнікамі груп таксама цягнецца 10 хвілін. Астатнія ўдзельнікі могуць задаваць пытанні і выказваць свае меркаванні па тэме.*

*Пасля гэтага настаўнік вяртаецца да спісу, зробленага ў пачатку практыкавання (з вялікай верагоднасцю там будуць зоркі кіно і эстрады), і задае аўдыторыі наступныя пытанні.*

1. *Ці ўплываюць на нас масмедыя?*
2. *Ці не навязаны нам гэтыя вобразы?*
3. *Што яшчэ нам прапануюць любіць, есці, купляць?*
4. *Ці заўсёды тое, што нам прапануюць, — сапраўды найлепшы варыянт? [4]*

Працуючы з рэкламай і ўвогуле медыя, неабходна сачыць за апошнімі трэндамі — гэтая сфера вельмі хутка развіваецца. Напрыклад, цяпер для атрымання звестак аб спажыўцах актыўна выкарыстоўваюцца сацыяльныя сеткі, якія прадаюць інфармацыю аб сваіх кліентах розным карпарацыям. Гэта інфармацыя, якую ўладальнікі ўліковых запісаў расказваюць пра сябе, — пол, узрост, сямейнае становішча, месца пражывання, адукацыя, а таксама інтарэсы, упадабанні-лайкі, рэпосты карыстальніка, якія запісваюцца ў яго сацыяльны профіль. У апошні час вялікае пашырэнне атрымала **таргет-рэклама**, калі спажыўцу на аснове сабраных пра яго звестак прапануюцца пэўныя тавары і паслугі.

**Літаратура і электронныя рэсурсы**


1. Основи медіаграмотності: навч.-метод. посіб. для вчителя 8 (9) клас: плани-конспекти уроків / за ред. В. Ф. Іванова, О. В. Волошенюк, О. П. Мокрогуза. — К.: Акад. укр. преси, 2016.
2. Медіаграмотність на уроках суспільних дисциплін: посіб. для вчителя / за ред. В. Іванова, О. Волошенюк, О. Мокрогуза. — К.: Центр віл. преси, Акад. укр. преси, 2016.
3. Онлайн-курс «Новинна грамотність» // Детектор медіа [Электронний ресурс]. — Режим доступу: http://www.video.detector.media/special-projects/novynna-gramotnist-i22. — Дата доступу: 20.04.2018.
4. Международная лаборатория медиаграмотности [Электронный ресурс]. — Режим доступа. https://medianavigator.org/. — Дата доступа: 20.04.2018.
5. Як выжыць у эпоху постпраўды? // 34mag.net [Электронны рэсурс]. — 2017. — Рэжым доступу: https://34mag.net/post/yak-vyzhyc-u-ehpokhu-postpraydy. — Дата доступу: 20.04.2018.
6. Чэкліст: як знайсці фэйкавую навіну ў СМІ? // настаўнік.info [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.nastaunik.info/node/15846. — Дата доступу: 20.04.2018.
7. Медиакод: инструкция по выживанию в медийно насыщенной среде [Электронный ресурс]. — 2013. — Режим доступа: http://www.nastaunik.info/sites/default/files/page/files/teachers_guide_final_for_print2.pdf. — Дата доступа: 20.04.2018.
8. *Андэрсэн, Ё.* Інтэрнэт — гэта не сметніца, а інструмент фармавання крытычнага мыслення / Ё. Андерсэн // настаўнік.info [Электронны рэсурс]. — 2017. — Рэжым доступу: http://www.nastaunik.info/node/15218. — Дата доступу: 20.04.2018.

## 2.4. Новыя медыя ў навучанні: гаджэты і сацыяльныя сеткі

Медыясфера вельмі хутка мяняецца пад уплывам імклівага развіцця інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій. Адзначым, што **новыя медыя** працуюць па мадэлі кругласутачнага стварэння і спажывання інфармацыі, якая стала больш даступнай і зручнай дзякуючы распаўсюджанню смартфонаў і планшэтаў.

### *Ці трэба карыстацца гаджэтамі на ўроках?*

У развітых краінах свету ўжо больш за 50 % пяцігадовых дзяцей самастойна заходзяць у інтэрнэт. Рэакцыя грамадства і дзяржавы на гэтыя тэндэнцыі неадназначная: у некаторых краінах уводзяцца забароны на выкарыстанне смартфонаў у школах, у іншых набірае моц адукацыйны трэнд BYOD (*bring your own device* — «Прынясі свой дэвайс»). Навучанне паводле прынцыпу BYOD дазваляе вучням карыстацца звыклымі праграмамі, новымі магчымасцямі сваіх смартфонаў, ноўтбукаў і планшэтаў і эфектыўна працаваць ва ўласным асяроддзі сеткавага навучання. Медыяадукатары акцэнтуюць увагу не на адмаўленні ад гаджэтаў у навучанні, а на збалансаваным падыходзе да іх выкарыстання ў адукацыйным працэсе. Можна сказаць, што ў асноўным дыскусія адбываецца наконт правілаў выкарыстання дэвайсаў у школе. Мэтазгодна абмеркаваць гэтыя правілы з самымі зацікаўленымі людзьмі — нашымі вучнямі. Звяртаем увагу на тое, што прыняцце рашэнняў шляхам шырокага абмеркавання па праблемным пытанні з'яўляецца дзейсным спосабам навучання дэмакратыі і павышае зацікаўленасць удзельнікаў дыскусіі ў выкананні правілаў.

### *Практыкаванне «„За“ і „супраць“ гаджэтаў на ўроках»*

***#медыяспажыванне #мазгавы_штурм***
***#праца_ў_групах #этыка #правы_і_свабоды***

***Мэта**: ацаніць адукацыйны патэнцыял гаджэтаў і супольна выпрацаваць правілы іх выкарыстання на ўроках.*

***Ход практыкавання.** Папярэдне трэба даць вучням магчымасць падрыхтавацца па наступных пытаннях.*

1. *Калі б вам дазволілі карыстацца гаджэтамі на ўроках, для чаго вы б іх выкарыстоўвалі?*
2. *Якую працу і на якіх уроках можна зрабіць хутчэй, больш якасна з дапамогай гаджэта? Прывядзіце прыклады.*
3. *Як можна працаваць з гаджэтамі на ўроках гісторыі і грамадазнаўства, калі ўлічыць, што яны адрозніваюцца па сваіх магчымасцях і ёсць не ва ўсіх вучняў?*

*Падчас абмеркавання гэтых пытанняў у класе мэтазгодна запоўніць табліцу «Гаджэты ў навучанні».*

| | Дапамагаюць | Перашкаджаюць |
|---|---|---|
| *Настаўнік* | | |
| *Вучань* | | |
| *Правілы выкарыстання гаджэтаў на ўроках* | | |

***Планаваныя вынікі***

- *Вучні і настаўнікі на прыкладах прадэманструюць плюсы і мінусы (на іх думку) выкарыстання гаджэтаў на ўроках.*
- *Удзельнікі абмяркуюць іх і вылучаць умовы, пры якіх гаджэты спрыяюць / перашкаджаюць эфектыўнаму навучанню.*
- *Будуць сфармуляваны правілы, якіх трэба прытрымлівацца ў выкарыстанні гаджэтаў у школе [1, с. 43].*

*Рэкамендуецца раздрукаваць гэтыя правілы і павесіць у класе на заўважным месцы.*

Важна суадносіць магчымасці і рызыкі выкарыстання інтэрнэту, ацэньваць канкрэтную сітуацыю (асабісты ці грамадскі камп'ютар, ці маюць да яго доступ староннія людзі і да т. п.). Гэта датычыцца і працы на агульных камп'ютарах, і падключэнняў да грамадскіх сетак Wi-Fi з мабільнага тэлефона. Асноўнай рызыкай з'яўляецца крадзеж асабістых звестак, якія могуць уключаць, напрыклад, паролі ад розных акаўнтаў: электроннай пошты, сацыяльных сетак або ад электроннага кашалька.

Таксама падчас навучання неабходна звяртаць увагу на магчымую агрэсію ў інтэрнэце — ***кібербулінг, тролінг, мову варожасці***. У якасці агрэсара могуць выступаць як знаёмыя людзі, так і цалкам староннія. Ахвярай кібербулінгу можа стаць кожны карыстальнік сеткі, незалежна ад яго ўзросту і полу, таму не варта саромецца і маўчаць, калі вы самі трапілі ў падобную сітуацыю. Часта бяздзейнасць ахвяры і беспакаранасць агрэсара яшчэ больш правакуюць на пераслед і цкаванне. Пры сутыкненні з агрэсіўнымі паводзінамі трэба не паддавацца на правакацыі агрэсара, не спрабаваць правучыць яго, а звярнуцца па падтрымку. Акрамя таго, варта выконваць шэраг правілаў зносін у інтэрнэце, у першую чаргу ў сацыяльных сетках, каб даць адпор кібербулінгу і самому не стаць тролем.

Звяртаем увагу на выдатны практыка-арыентаваны анлайн-курс для вучняў, іх бацькоў і настаўнікаў «Безопасный интернет».

## *Сацыяльныя сеткі ў навучанні*

*Калі бацькі прыйшлі ў Facebook,*
*дзеці пакінулі гэту сетку і пайшлі ў Instagram…*
*Ё. Андэрсан*

Больш за ўсё магчымасцяў для працы ў сацыяльных сетках можна знайсці на ўроках грамадазнаўства па тэме «Міжасобасныя зносіны». Каб убачыць сеткавую дыферэнцыяцыю грамадства і абмеркаваць яе, можна зрабіць наступнае практыкаванне.

### *Практыкаванне «Мы ў сацыяльных сетках»*

***#медыяспажыванне #сацыяльныя_медыя #правы_і_свабоды #дыскусія***

***Мэты***: *патлумачыць уласны сеткавы выбар, асэнсаваць спрыяльныя і неспрыяльныя ўмовы сеткавай камунікацыі дзеля ўласнага навучання і развіцця.*

1. *На вялікім плакаце, інтэрактыўнай ці звычайнай дошцы намалюйце табліцу, дадзеную ў канцы практыкавання, і папрасіце прысутных запоўніць яе з дапамогай каляровых стыкераў, фламастараў ці інш. Бацькам, вучням і настаўнікам трэба выдаць стыкеры рознага колеру (напрыклад, бацькам — сінія, дзецям — жоўныя, настаўнікам — чырвоныя), каб лепш візуалізаваць інфармацыю.*

2. *Пасля запаўнення табліцы адбываецца абмеркаванне атрыманых вынікаў.*
- *Перш за ўсё трэба звярнуць увагу на крайнасці: чым тлумачыцца вялікая колькасць акаўнтаў ці поўная іх адсутнасць у асобных удзельнікаў? Якія сацсеткі, не названыя ў табліцы, дапісалі ўдзельнікі?*
- *Ці ёсць адрозненні паміж выбарам сеткі дзецьмі, настаўнікамі, бацькамі? Якія сацсеткі самыя папулярныя, якія непапулярныя? Што ўдзельнікі робяць у сацсетках: камунікуюць, забаўляюцца, вучацца, супольна вырашаюць нейкія праблемы?*
- *Станоўча ці адмоўна ўплывае сяброўства ў сацыяльнай сетцы на навучанне? [1, с. 40]*

**Сацыяльныя сеткі**

| Назва сацсеткі | Ёсць акаўнт, карыстаюся | Не ведаю пра яе | Ведаю, але не карыстаюся | Ёсць акаўнт, але не карыстаюся |
|---|---|---|---|---|
| **Facebook** | | | | |
| **ВКонтакте** | | | | |
| **Одноклассники** | | | | |
| **Twitter** | | | | |
| **Google+** | | | | |
| **YouTube** | | | | |
| **Instagram** | | | | |
| **Мой мир** | | | | |
| **LinkedIn** | | | | |
| **Badoo** | | | | |
| **Pinterest** | | | | |
| **Tagged** | | | | |
| **Постила** | | | | |
| **Іншыя сеткі** | | | | |

На думку расійскага даследчыка І. В. Чэлышавай, да галоўных асаблівасцяў, якія адрозніваюць сацыяльныя сеткі ад іншых інтэрнэт-рэсурсаў, належаць:
- *шырокія магчымасці для камунікацыі (у тым ліку абмен інфармацыйнымі паведамленнямі, фатаграфіямі, відэа і інш.) і ацэнкі кантэнту (каментаванне і выстаўленне адзнак і лайкаў);*
- *магчымасць ствараць асабістыя старонкі (профілі);*
- *аб'яднанне ў групы, суполкі па агульнай прыкмеце (сферы інтарэсаў, узрост; месца вучобы, працы, жыхарства і інш.) [2, с. 14].*

Сёння рэпутацыя ў інтэрнэце гэтаксама важная, як і рэпутацыя ў рэчаіснасці, больш за тое, рэпутацыя ў сетцы можа наўпрост уплываць на рэальнае жыццё. Вядома, што працадаўцы правяраюць пры прыёме на працу профілі ў сацыяльных сетках прыблізна ў 40 % патэнцыйных супрацоўнікаў.

Рэпутацыя чалавека ў сетцы звязаная не толькі з тым, што ён сам публікуе пра сябе, але і з тым, што іншыя карыстальнікі могуць апублікаваць пра яго. Паспрабуйце «праверыць» сябе (свой профіль, фота) — пашукайце сваё імя і прозвішча з дапамогай розных пошукавікаў у сусветным павуцінні. Гэта не толькі цікава, але і вельмі пазнавальна. Наступнае практыкаванне складзена паводле матэрыялу Т. Барткевіч «Сацыяльныя сеткі ў навучанні: метадычныя аспекты выкарыстання ў адукацыйным працэсе» [3].

## *Практыкаванне «Медыяпрофіль у сацыяльных сетках»*

***Мэта**: удзельнікі пашыраць свае веды пра інфармацыю ў профілі карыстальніка сацыяльных сетак (нікнэйм, аватарка, рэпосты, лайкі, фотаздымкі, тэкставая інфармацыя).*

***Падрыхтоўчы этап (дамашняе заданне)**: вучні ў групах рыхтуюць паведамленні пра віды нікнэймаў (1-я група), характар аватарак (2-я група), значэнне тэкставай інфармацыі (3-я група), фотаздымкі ў сацсетках (4-я група).*

*Некалькі вучняў (два–тры) самастойна складаюць псіхалагічныя партрэты абраных імі карыстальнікаў сацыяльных сетак па параметрах, якія вызначаюць самі.*

***Абсталяванне**: камп'ютар і праектар для дэманстрацыі старонак з сацыяльных сетак (або іх скрыншотаў), гексы (выразаныя з паперы шасцікутнікі-соты для запісу паняццяў і высноў).*

***Ход практыкавання***

***I этап.** Выступленні вучняў з аповедамі пра высновы, зробленыя імі падчас аналізу старонак карыстальнікаў сацыяльных сетак. Вучні расказваюць, на чым грунтуюцца іх вывады, задаюць пытанні адно аднаму, абменьваюцца меркаваннямі.*

***Вучні 1-й групы** коратка знаёмяць прысутных з той класіфікацыяй нікаў, якую склалі.*

***Вучні 2-й групы** распавядаюць пра класіфікацыю аватарак, якую склалі. Яны расказваюць, чаму некаторыя выкарыстоўваюць злосныя аватары, аватары з жывёльнага свету, герояў мультфільмаў, зорныя аватары, аватары ўлады, спакушальныя аватары, сапраўдны твар і інш.*

***Вучні 3-й групы** знаёмяць усіх з класіфікацыяй тэкставай інфармацыі на старонцы абранага карыстальніка: кантакты, адукацыя, жыццёвая пазіцыя, асабістыя звесткі.*

***Вучні 4-й групы** расказваюць, якую інфармацыю для псіхалагічнага партрэта даюць фотаздымкі.*

***II этап.** Настаўнік прапануе матэрыял для аналізу са старонкі ў Facebook нейкай публічнай персоны (неабходна загадзя вызначыць персону і ўважліва вывучыць публічную інфармацыю на яе старонцы).*

*Вучні зноў размяркоўваюцца па групах. Пажадана, каб ніхто з вучняў не рабіў два разы аднатыпныя заданні.*

***Заданні для аналізу старонкі публічнай персоны ў Facebook***

***Заданне 1.** Выкажыце сваё меркаванне пра медыйную персону адным словам, запішыце яго на шасцікутніку (гексе).*

***Заданне 2.** Разгледзьце аватарку персоны. Выкажыце сваё меркаванне адносна характару ўладальніка. Рысы характару запішыце на шасцікутніках.*

***Заданне 3.** Прааналізуйце тэкставую інфармацыю са старонкі. Дайце азначэнне рысам характару. Запішыце на гексах.*

***Заданне 4.** Прааналізуйце фотаздымкі, змешчаныя на старонцы персоны. Паспрабуйце вызначыць рысы характару чалавека, запішыце.*

***III этап.** Вучні размяшчаюць на дошцы напрацаваны матэрыял. На лістках-гексах — складнікі псіхалагічнага партрэта карыстальніка сацыяльных сетак.*

***IV этап. Рэфлексія.** Настаўнік задае пытанні, дае заданні на роздум, але кожны з вучняў адказвае на іх толькі ў думках.*

- *Успомніце, калі ласка, як вы прадстаўляеце сябе іншым у сацыяльных сетках.*
- *Пра што гаворыць ваш нікнэйм: пра адкрытасць або закрытасць, пра добразычлівасць або агрэсіўнасць, пра ганарлівасць ці сціпласць?*
- *Якім вас бачаць іншыя на фотаздымку — рамантычным і жыццярадасным або легкадумным, загадкавым ці пыхлівым?*

- *Што ты посціш? Як гэта можа характарызаваць цябе?*
- *Якія словы ты ўжываеш у перапісцы? Як яны раскрываюць твой духоўны свет?*
- *Як думаеш: твой віртуальны вобраз прыцягвае ці адштурхоўвае? [3]*

Сацыяльныя сеткі могуць стаць і адным з самых магутных стымулаў для навучання. Вельмі важна, каб вучні ўмелі правільна сфарміраваць сваю стужку ў сацыяльных медыя для навучання. Калі педагогі навучаць дзяцей гэта рабіць, то сацыяльная сетка перастане быць проста акенцам для забавак і ператворыцца ў дадатковы канал навучання [4].

Адзначым наступную тэндэнцыю: замест падрыхтоўкі паведамленняў і прэзентацый з біяграфіяй якога-небудзь юбіляра творчыя педагогі ўсё часцей даюць заданне зрабіць яго старонку ў сацыяльнай сетцы. Адразу можна ўявіць сабе скарынаўскі профіль: сябры і суполкі, кнігі, якія ён чытаў, музыка, якую слухаў, месцы, дзе вучыўся, працаваў, вандраваў… Асабліва папулярная для стварэння акаўнтаў гістарычных персон сацыяльная сетка «ВКонтакте».

**_Акаўнт гістарычнай асобы ў сацсетках — фэйк ці адукацыя?_**

*Ці можна ствараць акаўнты ад імя гістарычных асоб у сацыяльных сетках? Ці не будзе гэты акаўнт лічыцца фэйкавым?*




***Крыніцы**: https://vk.com/frosya.polotsk; https://belarusianheroes.com/eufrasinnya.polatskaya*

Для таго каб пазбегнуць абвінавачванняў у стварэнні па сутнасці фэйкавых акаўнтаў, лепш карыстацца спецыяльнымі платформамі, якія імітуюць сацыяльныя сеткі, ці сэрвісамі — сімулятарамі сацыяльных сетак, ці самае простае і эфектыўнае — працаваць з шаблонам сацыяльнай сеткі на папяровай аснове.

Настаўнік сам можа выкарыстаць сімулятары сацыяльных сетак для навучання гісторыі ў займальнай форме. Напрыклад, ствараючы з дапамогай сімулятара пост ад імя гістарычнага дзеяча, ён можа мець наступныя мэты:

- *удасканаліць уласныя медыяінфармацыйныя кампетэнцыі (карыстальніка сацыяльных сетак, пошуку і праверкі крыніц інфармацыі, стваральніка медыятэкстаў і г. д.);*
- *максімальна выкарыстаць змест вучэбнага прадмета;*
- *прапанаваць вучням у прывабнай сеткавай абгортцы сітуацыю, у якой ім нельга разабрацца без адпаведных ведаў па гісторыі.*

Для таго каб ствараць посты ад імя гістарычнай персоны, мэтазгодна папрацаваць з сэрвісам, які вырабляе Facebook- і Twitter-сімуляцыі: http://simitator.com. Сэрвіс-сімулятар вельмі просты: дастаткова загрузіць фота і паслядоўна ўвесці тэксты каментарыяў, выбраць колькасць лайкаў і інш. Звяртаем увагу, што ў вучэбных мэтах лепш не рабіць пост публічным, а зрабіць яго скрыншот (ці спампаваць з рэсурсу ў фармаце JPG).

Вельмі важным з'яўляецца адно з галоўных медыяадукацыйных пытанняў: што я магу зрабіць у адказ на гэта медыяпаведамленне? Галоўнае, каб, усвядоміўшы вялікія магчымасці медыя маніпуляваць свядомасцю, вучні не расчараваліся і не сталі цынікамі, а актыўна і адказна самарэалізоўваліся, у тым ліку праз медыя. Вялікую ролю ў практычнай медыяадукацыі сацыяльныя медыя адыгрываюць як інструмент для дыялогу і самаарганізацыі грамадства. Праблемнае поле для адпаведнай дыскусіі на ўроку грамадазнаўства можна акрэсліць наступнымі пытаннямі.

- *Ці могуць лайкі (падабайкі?) і рэпосты вырашаць сацыяльныя праблемы?*
- *Што трэба, каб лайкі ператварыліся ў рэальныя дзеянні?*

Паўнавартасна рэалізаваць свае правы і плённа ўдзельнічаць у жыцці грамадства можа асоба з развітым крытычным мысленнем і актыўнай грамадзянскай пазіцыяй.

Медыяінфармацыйныя кампетэнцыі дапамагаюць чалавеку прымаць больш разумныя і своечасовыя рашэнні, што тычацца самога чалавека, яго сям'і, здароўя, дабрабыту, адукацыі, грамадства і дзяржавы, — і быць паспяховым у жыцці. Напрыканцы звяртаем увагу настаўнікаў, зацікаўленых у падвышэнні ўласнай медыяінфармацыйнай кампетэнтнасці, на адукацыйны рэсурс, распрацаваны беларускімі педагогамі, «Школа медыяадукатараў».

**Літаратура і электронныя рэсурсы**


1. Медыяадукацыя ў школе: фарміраванне медыяграматнасці вучняў: дапам. для настаўнікаў / М. І. Запрудскі [і інш.]; пад рэд. М. І. Запрудскага. — Мінск, 2016.
2. *Челышева, И. В.* Мир социальных сетей и семейное воспитание школьников / И. В. Челышева. — Таганрог: Изд-во Таганрог. ин-та им. А. П. Чехова, 2014.
3. *Барткевіч, Т.* Сацыяльныя сеткі ў навучанні: метадычныя аспекты выкарыстання ў адукацыйным працэсе / Т. Барткевіч // настаўнік.info [Электронны рэсурс]. — 2017. — Рэжым доступу: http://www.nastaunik.info/node/15992. — Дата доступу: 20.04.2018.
4. Праект «Падарожнікі ў часе» фатографа Аляксандра Перагудава [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.facebook.com/AleksanderPeregudov/posts/415514648628026. — Дата доступу: 20.04.2018.

*Табліца 25*

## Даведнік па практыкаваннях (фарміраванне медыяінфармацыйных кампетэнцый)

| Назва практыкавання, метадычныя і змястоўныя тэгі | Мэта практыкавання | Від вучэбна-пазнавальнай дзейнасці | Магчымасці правядзення практыкаванняў з прыкладамі па тэмах вучэбных праграм |
|---|---|---|---|
| ***Факты і меркаванні*** | *Умець з дапамогай слоў-маркераў вылучаць меркаванні аўтара і аддзяляць іх ад фактаў* | Работа з тэкстам вучэбнага дапаможніка, гістарычнымі дакументамі, рознымі крыніцамі інфармацыі, матэрыяламі друкаваных і электронных СМІ | • Работа з тэкстамі падручніка «История БССР» (Л. С. Абецэдарскі [і інш.]), беларускіх і замежных падручнікаў гісторыі розных гадоў выдання па розных тэмах гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі: перыядызацыя айчыннай і сусветнай гісторыі; утварэнне першых дзяржаў на тэрыторыі Беларусі; утварэнне ВКЛ і Рэчы Паспалітай; войны Расіі і Рэчы Паспалітай (XVI — XVIII стст.); падзелы Рэчы Паспалітай; утварэнне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, Беларусь у міжваенны перыяд; Другая сусветная і Вялікая Айчынная войны, халодная вайна і інш.;<br>• работа з тэкстамі вучэбных дапаможнікаў, у якіх апісваюцца і ацэньваюцца гістарычныя падзеі, і з гістарычнымі дакументамі, звязанымі з гэтымі падзеямі (напрыклад, устаўныя граматы БНР, тэксты пагадненняў, вядомых як Брэсцкі і Рыжскі мір, дагавор аб утварэнні СССР, пакт Рыбентропа — Молатава, вынікі Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцый і інш.) |
| ***Вікіпедыя як крыніца інфармацыі*** | *Умець правяраць дакладнасць інфармацыі з розных крыніц і разумець адказнасць стваральнікаў медыятэкстаў* | Работа з рознымі крыніцамі інфармацыі, матэрыяламі друкаваных і электронных СМІ пры падрыхтоўцы паведамленняў, тэкстаў выступленняў, дакладаў, рэфератаў і прэзентацый | • Работа з артыкуламі з Вікіпедыі на розных мовах (беларускай, рускай, польскай, украінскай) пра літаратараў першай паловы XIX ст. (А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, Я. Чачота і інш.);<br>• работа з артыкуламі з Вікіпедыі пра паўстанні пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі і К. Каліноўскага (на беларускай, рускай, польскай мовах);<br>• праверка, праўка, стварэнне артыкула ў Вікіпедыі пра свой населены пункт, школу, знакамітага дзеяча (урокі «Наш край») |
| ***Каналы камунікацыі*** | *Умець выкарыстоўваць розныя каналы камунікацыі ў залежнасці ад мэтавай аўдыторыі і з захаваннем правіл бяспекі* | Канкрэтызацыя прыкладамі правіл медыябяспекі, захавання прыватнасці і канфідэнцыйнасці ў віртуальным свеце падчас праектнай дзейнасці і сеткавай камунікацыі | • Работа з рознымі крыніцамі сацыяльнай інфармацыі і каналамі камунікацыі (паведамленні па электроннай пошце, форумы на сайтах, посты ў сацыяльных сетках, чаты ў месенджарах) па грамадазнаўстве па змесце раздзела «Дзейнасць і зносіны ў жыцці чалавека» і тэме «Чалавек у віртуальным свеце» (9 клас), тэме «Сацыяльная камунікацыя» (10 клас), «Гарызонты інфармацыйнага грамадства» (11 клас) |
| ***Помнік як навіна*** | *Умець адрозніваць медыярэпрэзентацыі адной падзеі і тлумачыць іх прычыны* | Характарыстыка і ацэнка гістарычных падзей і персаналій, гістарычных помнікаў з выкарыстаннем розных крыніц інфармацыі, работа з ілюстрацыямі | • Работа з візуальнымі крыніцамі інфармацыі: фатаграфіямі помнікаў, прысвечаных гістарычным падзеям і персаналіям, на ўроках гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі (6–11 класы);<br>• работа з матэрыяламі электронных і друкаваных СМІ з навінамі пра адкрыццё новых помнікаў у Беларусі і свеце на ўроках грамадазнаўства па тэмах «Пераемнасць і развіццё культуры», «Культурная разнастайнасць і дыялог культур» (9 клас), «Мастацтва і духоўнае жыццё» (10 клас); |

| Назва практыкавання, метадычныя і змястоўныя тэгі | Мэта практыкавання | Від вучэбна-пазнавальнай дзейнасці | Магчымасці правядзення практыкаванняў з прыкладамі па тэмах вучэбных праграм |
|---|---|---|---|
| | | | • вучэбныя і сацыяльныя праекты па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, культуры памяці і мемарыялізацыі («Наш край») |
| ***Роля ў канфлікце*** | *Умець правяраць дакладнасць інфармацыі з розных крыніц і разумець адказнасць стваральнікаў медыятэкстаў* | Характарыстыка і ацэнка гістарычных падзей і персаналій, гістарычных помнікаў з выкарыстаннем розных крыніц інфармацыі, работа з ілюстрацыямі | • Работа з візуальнымі гістарычнымі крыніцамі (гістарычнымі фота і здымкамі з сямейнага альбома) падчас вывучэння праблемных пытанняў найноўшай гісторыі;<br>• работа з візуальнымі крыніцамі інфармацыі (сучасныя фота) падчас вывучэння тэндэнцый развіцця сучаснага грамадства (грамадазнаўства, 9–11 класы) |
| ***Як працуе прапаганда*** | *Умець вызначаць спосабы ўздзеяння стваральнікаў медыятэкстаў на аўдыторыю* | Характарыстыка і ацэнка гістарычных падзей і персаналій, сучасных сацыяльных з'яў і тэндэнцый развіцця грамадства падчас работы з візуальнымі крыніцамі інфармацыі (палітычны плакат, рэкламны постар) | • Работа з візуальнымі гістарычнымі крыніцамі — палітычнымі плакатамі падчас вывучэння гісторыі войнаў: Першая і Другая сусветныя войны, халодная вайна, інфармацыйная вайна, лакальныя войны і канфлікты (гісторыя Беларусі і сусветная гісторыя, 8–9 і 11 класы);<br>• работа з візуальнымі крыніцамі інфармацыі — палітычнымі плакатамі, улёткамі, флаерамі — матэрыяламі выбарчай кампаніі на ўроках грамадазнаўства падчас вывучэння раздзела «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» (9 клас), тэм «Палітычная сістэма грамадства» (10 клас) і «Унутраная палітыка беларускай дзяржавы» (11 клас);<br>• работа з візуальнымі крыніцамі інфармацыі — рэкламнымі постарамі, плакатамі, улёткамі, флаерамі на ўроках грамадазнаўства падчас вывучэння тэм раздзелаў «Эканамічнае жыццё грамадства» (10 клас), «Унутраная палітыка беларускай дзяржавы» (11 клас) |
| ***Мова кіно — не толькі словы*** | *Умець вызначаць спосабы ўздзеяння стваральнікаў медыятэкстаў на аўдыторыю* | Тлумачэнне гістарычнага кантэксту пры праглядзе фільмаў, характарыстыка жанраў медыятэкстаў | • Работа з экраннымі крыніцамі інфармацыі — мастацкімі гістарычнымі фільмамі, анімацыяй і відэа на ўроках гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі (6–11 класы): напрыклад, у 7 класе фрагменты мастацкіх фільмаў «Пастка для зубра», «Анастасія Слуцкая» (тэма «Палітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага»), «Агнём і мячом» (тэма «Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. на беларускіх землях»), «Маці ўрагану» (тэма «Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў першай палове XVIII ст.») і інш.;<br>• работа з экраннымі крыніцамі інфармацыі — дакументальнымі і навукова-папулярнымі фільмамі (тэлепраекты «Обратный отсчет», «Гісторыя пад знакам Пагоні» і інш.) |

| Назва практыкавання, метадычныя і змястоўныя тэгі | Мэта практыкавання | Від вучэбна-пазнавальнай дзейнасці | Магчымасці правядзення практыкаванняў з прыкладамі па тэмах вучэбных праграм |
|---|---|---|---|
| ***Ствараем свой медыятэкст*** | *Умець вызначыць і данесці да аўдыторыі галоўную ідэю, пасыл медыятэксту* | Тлумачэнне гістарычнага кантэксту пры праглядзе фільмаў, характарыстыка жанраў медыятэкстаў, работа з візуальнымі крыніцамі гістарычнай інфармацыі (стварэнне постара, афішы, комікса, трэйлера да фільма) | • Работа з экраннымі крыніцамі інфармацыі: дакументальнымі і мастацкімі гістарычнымі фільмамі, анімацыяй і відэа на ўроках гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі (6–11 класы) |
| ***Параўноўваем тэкст і яго экранізацыю*** | *Разумець ролю вобразна-выяўленчых сродкаў мовы ў мастацкім творы і сродкаў кінамовы ў яго экранізацыі* | Тлумачэнне гістарычнага кантэксту пры праглядзе фільмаў, характарыстыка жанраў медыяпаведамленняў, работа з рознымі крыніцамі гістарычнай інфармацыі, стварэнне ўласнага медыяпрадукту (постара, афішы, комікса, трэйлера да фільма) | • Работа з тэкстам міфа і мультфільмам пра Праметэя (тэма «Культура Старажытнай Грэцыі», сусветная гісторыя, 5 клас);<br>• работа з фрагментамі тэкстаў летапісу «Аповесць мінулых часоў» і мультфільмамі аднайменнай серыі (тэма «Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі», гісторыя Беларусі, 6 клас);<br>• работа з тэкстам казкі Ш. Перо «Папялушка» і яе экранізацыямі (тэма «Масавая, элітарная і народная культура», грамадазнаўства, 9 клас) |
| ***Як працуюць загалоўкі ў медыя*** | *Умець распазнаваць прыёмы, якія выкарыстоўваюцца для прыцягнення ўвагі аўдыторыі, і разумець структуру медыяпаведамленняў* | Канкрэтызацыя прыкладамі тэарэтычных палажэнняў тэорый і сацыяльных працэсаў, якія вывучаюцца, ацэнка гістарычных падзей і з’яў падчас работы са статыстычнымі данымі, навукова-папулярнай і публіцыстычнай літаратурай, матэрыяламі электронных і друкаваных СМІ | • Работа з архіўнымі матэрыяламі: газетнымі публікацыямі пра гістарычныя падзеі, якія вывучаюцца на ўроках гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі;<br>• работа з матэрыяламі сучасных электронных і друкаваных СМІ падчас вывучэння асноўных тэндэнцый грамадскага развіцця, формаў рэгулявання грамадскіх адносін, асноўных галін права, унутранай і знешняй палітыкі беларускай дзяржавы, пагроз і выклікаў сучаснага свету, перспектыў развіцця Беларусі (грамадазнаўства) |
| ***Штучная прыгажосць*** | *Умець распазнаваць маніпуляцыі ў рэкламе і разумець тэхналогію стварэння рэкламнага прадукту* | Тлумачэнне і канкрэтызацыя прыкладамі спосабаў уздзеяння на людзей (заражэнне, унушэнне, перакананне, перайманне) і распазнаванне стэрэатыпаў ва ўспрыманні іншых людзей падчас работы з крыніцамі сацыяльнай інфармацыі; характарыстыка сацыяльнай ролі спажыўца тавараў і паслуг | • Работа з рэкламнымі ролікамі, у якіх навязваюцца пэўныя стандарты прыгажосці і моды, на ўроках па тэмах «Сацыяльнае ўзаемадзеянне», «Культурная разнастайнасць і дыялог культур», «Масавая, элітарная, народная культура», «Рынкавая эканоміка» (грамадазнаўства, 9–10 класы) |

*Заканчэнне табл. 25*

| Назва практыкавання, метадычныя і змястоўныя тэгі | Мэта практыкавання | Від вучэбна-пазнавальнай дзейнасці | Магчымасці правядзення практыкаванняў з прыкладамі па тэмах вучэбных праграм |
|---|---|---|---|
| ***«За» і «супраць» гаджэтаў на ўроках*** | *Разумець адукацыйны патэнцыял гаджэтаў і ведаць правілы іх бяспечнага і эфектыўнага выкарыстання на ўроках* | Вызначэнне ўласнай пазіцыі падчас рашэння задач у галіне міжасобасных адносін, тлумачэнне ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці паміж правамі на свабоду і іх абарону і абмежаваннямі, якія ўсталяваны этычнымі і прававымі нормамі | • Работа з рознымі крыніцамі сацыяльнай інфармацыі і каналамі камунікацыі (посты ў сацыяльных сетках, чаты ў месенджарах) па грамадазнаўстве па змесце раздзела «Дзейнасць і зносіны ў жыцці чалавека» і тэмах «Чалавек у віртуальным свеце» (9 клас), «Сацыяльная камунікацыя» (10 клас), «Гарызонты інфармацыйнага грамадства» (11 клас) |
| ***Мы ў сацыяльных сетках*** | *Ведаць правілы сеткавай камунікацыі і ўмець бяспечна выкарыстоўваць інтэрнэт дзеля ўласнага навучання і развіцця* | Вызначэнне ўласнай пазіцыі падчас рашэння задач у галіне міжасобасных адносін, тлумачэнне ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці паміж правамі на свабоду і іх абарону і абмежаваннямі, якія ўсталяваны этычнымі і прававымі нормамі выкарыстання інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій | • Работа з рознымі крыніцамі сацыяльнай інфармацыі і каналамі камунікацыі (посты ў сацыяльных сетках, чаты ў месенджарах) па грамадазнаўстве па змесце раздзела «Дзейнасць і зносіны ў жыцці чалавека» і тэмах «Чалавек у віртуальным свеце» (9 клас), «Сацыяльная камунікацыя» (10 клас), «Гарызонты інфармацыйнага грамадства» (11 клас) |
| ***Медыяпрофіль у сацыяльных сетках*** | *Ведаць правілы публічнасці і прыватнасці і ўмець этычна і бяспечна выкарыстоўваць іх у сеткавай камунікацыі* | Вызначэнне ўласнай пазіцыі падчас рашэння задач у галіне міжасобасных адносін, тлумачэнне ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці паміж правамі на свабоду і іх абарону і абмежаваннямі, якія ўсталяваны этычнымі і прававымі нормамі выкарыстання інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій | • Работа з рознымі крыніцамі сацыяльнай інфармацыі і каналамі камунікацыі (посты ў сацыяльных сетках, чаты ў месенджарах) па грамадазнаўстве па змесце раздзела «Дзейнасць і зносіны ў жыцці чалавека» і тэмах «Чалавек у віртуальным свеце» (9 клас), «Сацыяльная камунікацыя» (10 клас), «Гарызонты інфармацыйнага грамадства» (11 клас) |

*Табліца 26*

**Даведнік па кейсах з медыятэкстамі**

| Назва кейса | Вучэбны прадмет | Тэма вучэбнай праграмы |
|---|---|---|
| ***Факты і меркаванні ў падручніках*** | Гісторыя Беларусі | Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. і афармленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці |
| ***Адам Міцкевіч у Вікіпедыі*** | Гісторыя Беларусі | Грамадска-палітычнае жыццё ў першай палове і сярэдзіне XIX ст.<br>Культура Беларусі ў XIX ст. |
| ***Фота з сямейнага архіва*** | Гісторыя Беларусі | Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1940-х — 1980-я гг. |
| ***Пара фотаздымкаў*** | Гісторыя Беларусі | Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1940-х — 1980-я гг. |
| ***Фотакалаж — гістарычная задача*** | Гісторыя Беларусі | Абагульненне па раздзеле «Станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі».<br>Развіццё беларускай нацыі ва ўмовах савецкай грамадска-палітычнай сістэмы.<br>Канфесійная палітыка ў БССР |
| ***Помнікі на фота*** | Гісторыя Беларусі | Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі |
| ***Культавае фота Эйнштэйна*** | Сусветная гісторыя | Злучаныя Штаты Амерыкі.<br>Культура краін ЗША і Еўропы. Лад жыцця насельніцтва |
| ***Фотарэтуш ці «карэкціроўка» рэальнасці?*** | Гісторыя Беларусі | Грамадска-палітычнае жыццё ў 1920–1930-я гг.<br>Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1940-х — 1980-я гг. |
| ***Роля ў канфлікце*** | Сусветная гісторыя | Абагульненне па раздзеле «Другая сусветная вайна. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа» |
| ***Пазнай субкультуру*** | Грамадазнаўства | Сацыяльнае развіццё і моладзь |
| ***Ці можа фота стаць інфармацыйнай зброяй?*** | Сусветная гісторыя | Міжнародныя адносіны ў 1980-х гг. — пачатку XXI ст. |
| ***Якога плаката тут не хапае?*** | Сусветная гісторыя | Першая сусветная вайна |
| ***Выберыце правільны лозунг*** | Сусветная гісторыя | СССР у 1953–1964 гг. |
| ***Што аб'ядноўвае гэтыя карыкатуры?*** | Гісторыя Беларусі | Геапалітычнае становішча Беларусі ў XIX ст.<br>Беларусь ва ўмовах Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў |
| ***Сатырычная замалёўка да карыкатуры*** | Гісторыя Беларусі | Беларусь у геапалітычных умовах міжваеннага перыяду.<br>Грамадска-палітычнае жыццё ў 1920–1930-я гг. |
| ***Карты-карыкатуры?*** | Сусветная гісторыя | Першая сусветная вайна |
| ***Прачытайце інфаграфіку — перакладзіце інфармацыю*** | Грамадазнаўства | Інфармацыйная культура ў сучасным грамадстве |
| ***З чаго пачалося беларускае кіно?*** | Гісторыя Беларусі | Культура Беларусі ў 1920–1930-я гг. |
| ***Вобраз гістарычнай асобы ў кіно*** | Гісторыя Беларусі | Палітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага |
| ***Кастусь Каліноўскі ў кіно*** | Гісторыя Беларусі | Грамадска-палітычнае жыццё ў першай палове і сярэдзіне XIX ст. |
| ***Навошта ісці і глядзець?*** | Гісторыя Беларусі | Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.<br>Развіццё беларускай савецкай культуры ў другой палове 1940–1980-х гг. |

*Заканчэнне табл. 26*

| Назва кейса | Вучэбны прадмет | Тэма вучэбнай праграмы |
|---|---|---|
| ***Як працуюць трэйлеры гістарычных фільмаў?*** | Гісторыя Беларусі | Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. і афармленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці |
| ***Параўноўваем анімацыйныя ролікі*** | Гісторыя Беларусі | Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай.<br>Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі |
| ***Герой ці антыгерой?*** | Сусветная гісторыя | Распад СССР і ўтварэнне СНД |
| ***Тэхнікі работы з відэа*** | Сусветная гісторыя | Асноўныя тэндэнцыі развіцця краін свету пасля Другой сусветнай вайны.<br>Краіны мусульманскага свету |
| ***Што рэкламуюць на этыкетках запалак?*** | Гісторыя Беларусі | Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 1940-х — 1980-я гг. |
| ***Як рэклама ўздзейнічае на спажыўца?*** | Сусветная гісторыя<br>Грамадазнаўства | Культура краін ЗША і Еўропы. Лад жыцця насельніцтва.<br>Элітарная, масавая, народная культура.<br>Узаемадзеянне краін і народаў ва ўмовах глабалізацыі |
| ***Акаўнт гістарычнай асобы ў сацсетках — фэйк ці адукацыя?*** | Гісторыя Беларусі<br>Грамадазнаўства | Хрысціянізацыя насельніцтва беларускіх зямель у канцы X — сярэдзіне XIII ст.<br>Чалавек у прасторы медыякультуры |

## *Слоўнік медыяпедагога*

| | |
|---|---|
| ***Акаўнт*** (англ. *account* — лік) | уліковы запіс карыстальніка, які змяшчае звесткі пра чалавека. Для адназначнай ідэнтыфікацыі наведвальніка выкарыстоўваюцца лагін і пароль. Акрамя іх могуць фіксавацца дата нараджэння, пол і іншая інфармацыя пра карыстальніка |
| ***Візуалізацыя*** (ад лац. *visualis* — глядзець) | метад падачы інфармацыі, фізічных і сацыяльных працэсаў і з'яў, падзей у выглядзе, зручным для назірання і аналізу (напрыклад, у выглядзе малюнкаў і фатаграфій, графікаў, дыяграм, структурных схем, табліц, картаў і г. д.) |
| ***Журналістыка*** | сістэматычны пошук, збор, адбор і рэдагаванне, распаўсюджванне інфармацыі праз медыя — прафесійная дзейнасць у сродках масавай інфармацыі і камунікацыі |
| ***Інфаграфіка*** (ад лац. *informatio* — усведамленне, тлумачэнне, пераказ і грэч. γραφικός — пісьмовы, ад γράφω — пішу) | графічны спосаб падачы інфармацыі, даных і ведаў |
| ***Інфармацыя*** | звесткі (паведамленні, даныя) незалежна ад формы іх падачы |
| ***Кантэнт*** (англ. *content* — змест, тое, што ўтрымліваецца) | змест газеты, часопіса (навіны, артыкулы, рэклама і інш.) |
| ***Кібербулінг*** | запалохванне, здзек, кпіны ў інфармацыйнай прасторы праз інфармацыйна-камунікацыйныя каналы і сродкі (у тым ліку ў інтэрнэце) |
| ***Кінематограф*** (ад грэч. κινεμα — рух і грэч. γραφο — пісаць, адлюстроўваць) | комплекс прылад і метадаў, неабходных для стварэння, пракату і паказу фільма (асобны кінатвор) |
| ***Клікбэйт*** (англ. *clickbait* ад *click* — пстрычка, клік і *bait* — прынада) | маркетынгавы ход, які выкарыстоўваецца, каб прадаць рэкламу, павысіць наведвальнасць сайта і інш. |
| ***Медыя*** (ад лац. *medium* — пасярэднік) | сродкі масавай камунікацыі, да якіх належаць друк, прэса, тэлебачанне, кінематограф, радыё, гуказапісы і інтэрнэт; ***новыя медыя*** — сацыяльныя сеткі і месенджары |
| ***Медыяадукацыя*** | частка адукацыйнага працэсу, скіраваная на фарміраванне ў грамадстве медыякультуры, падрыхтоўку асобы да бяспечнага і эфектыўнага ўзаемадзеяння з сучаснай сістэмай масмедыя, уключаючы як традыцыйныя (друкаваныя выданні, радыё, кіно, тэлебачанне), так і найноўшыя (інтэрнэт, мабільная тэлефанія) медыя з улікам развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій |
| ***Медыяканвергенцыя*** (ад лац. *medium* + *convergens* — які супадае) | працэс аб'яднання розных сродкаў масавай камунікацыі на адзінай тэхналагічнай платформе |
| ***Медыяпісьменнасць*** | сукупнасць кампетэнцый, якія дазваляюць людзям атрымліваць доступ, аналізаваць, ацэньваць і ствараць паведамленні ў розных відах, жанрах і формах медыя для асабістага самавыяўлення, рэалізацыі сваіх грамадзянскіх правоў і забеспячэння фундаментальных свабод грамадства |
| ***Медыятэкст*** | паведамленне, тэкст любога медыйнага віду і жанру (артыкул у газеце, мастацкі ці дакументальны фільм, тэленавіны, рэклама на радыё, пост у сацыяльнай сетцы і інш.) |
| ***Пост*** (англ. *post* — адпраўляць па пошце) | асобна ўзятае паведамленне ў форуме, сацыяльнай сетцы або блогу. ***Рэпост*** (англ. *repost*) — гэта капіяванне пэўнага запісу да сябе на старонку ў сацыяльнай сетцы. Пасля рэпосту якой-небудзь навіны ці паведамлення яе змогуць прачытаць сябры і падпісчыкі сацыяльнай сетцы |

| | |
|---|---|
| ***Постпраўда*** | зварот да эмоцый і асабістых перакананняў, якія суправаджаецца ігнараваннем аб'ектыўных фактаў |
| ***Таргетынг*** (ад англ. *target* — мішэнь, мэта) | працэс вылучэння з шырокай аўдыторыі групы патэнцыйных пакупнікоў |
| ***Тролінг*** (ад швед. *Troll* — зачараванне, вядзьмарства) | размяшчэнне ў інтэрнэце (на форумах, у сацыяльных сетках) правакацыйных паведамленняў з мэтай выклікаць канфлікты паміж удзельнікамі, узаемныя абразы і інш. |
| ***Фактчэкінг*** (англ. *fact checking* — праверка фактаў) | праверка дакладнасці звестак, фактаў у навінах і іншых медыятэкстах (можа ажыццяўляцца як да публікацыі тэксту, так і пасля) |
| ***Фэйк*** (англ. *fake* — падрабляць, фальсіфікаваць) | наўмыснае распаўсюджванне дэзынфармацыі ў сацыяльных медыя і традыцыйных СМІ (напрыклад, фальшывыя навіны) |

## *Памяткі для вучняў*

***Памятка 1***

**Пытанні для аналізу медыяпаведамлення**

1. Аддзяліце факты, якія паддаюцца праверцы, ад меркаванняў.
2. Вызначце, што ў гэтым матэрыяле для вас істотна, а што няважна.
3. Вылучыце недаказаныя або слаба аргументаваныя сцвярджэнні. У чым вы бачыце прадузятасць і неаб'ектыўнасць аўтара? Чаму вы так вырашылі?
4. Наколькі можна давяраць гэтай крыніцы? Што для вас з'яўляецца крытэрыем сапраўднасці?
5. У чым заключаецца пункт гледжання аўтара гэтага матэрыялу? Чаму вы так лічыце? Ці можна прасачыць логіку развагі, як аўтар прыходзіць да сваіх высноў?
6. Наколькі моцна аргументаваная пазіцыя аўтара? Ці прапануе ён прыняць свае меркаванні на веру? Як вы прыйшлі да такой высновы?
7. Наколькі дакладная інфармацыя ў гэтым матэрыяле? Што вы зрабілі для таго, каб пераканацца ў яе дакладнасці?
8. Ці прыводзіць аўтар альтэрнатыўныя пункты гледжання? Як ён ставіцца да аргументаў сваіх апанентаў?

***Памятка 2***

**Праверка сапраўднасці і дакладнасці інфармацыі**

1. На якім сайце апублікаваная інфармацыя? Што можна сказаць пра гэты сайт?
2. Ці азначана крыніца інфармацыі? Што вы можаце сказаць пра гэтую крыніцу?
3. Хто аўтар інфармацыйнага паведамлення?
4. Каму адрасавана гэтае паведамленне?
5. Якая аргументацыя выкарыстоўваецца? Ці ёсць у тэксце фактычныя памылкі?
6. Вызначце мэту, якую мае гэтае інфармацыйнае паведамленне.
7. Знайдзіце ў сетцы падобныя паведамленні (падобную інфармацыю па гэтай тэме), выкарыстоўваючы розныя камбінацыі ключавых слоў. Параўнайце інфармацыю з розных крыніц, прааналізуйце яе.
8. Зрабіце выснову, ці можна давяраць гэтай інфармацыі.

***Памятка 3***

**Ключавыя пытанні да медыятэкстаў**

1. Хто напісаў / зняў / зрабіў гэта? Хто за гэта заплаціў?
2. Для каго гэта напісана / знята / зроблена?
3. Якія прыёмы выкарыстаны, каб перадаць інфармацыю?
4. Якія ідэі, каштоўнасці, пункты гледжання даносяцца?
5. Што важнае засталося па-за паведамленнем?
6. Калі, дзе і як гэты медыятэкст выйшаў?
7. Гэта факт, пункт гледжання ці нешта іншае?
8. Ці можна давяраць гэтай крыніцы?
9. Як розныя людзі гэта могуць зразумець?
10. Хто выйграе, а каму зашкодзіць гэтае паведамленне?
11. Як я разумею гэтае паведамленне?
12. Якія будуць дзеянні ў адказ на гэтае паведамленне?

*Памятка 4*

**План аналізу фотаздымка**

1. Апішыце асоб, якіх вы бачыце на фота, а таксама іх дзеянні і / або аб'екты, паказаныя на здымку.
2. Як згрупаваныя людзі і / або аб'екты? Апішыце, што вы бачыце на заднім плане, на пярэднім плане, у цэнтры, з левага і правага бакоў фатаграфіі.
3. Што, на вашу думку, адбываецца на гэтым фотаздымку?
4. Хто гэтыя людзі? Чым яны займаюцца? Якія гэта аб'екты?
5. Прыкладна адкажыце, калі, на вашу думку, быў зроблены здымак (год, перыяд, падзеі).
6. Ці змяшчаецца на фота тэкставая інфармацыя: плакаты, рэклама, подпісы?
7. Гэта пастановачнае фота? Людзі пазіравалі перад фотакамерай?
8. Чаму менавіта ў гэтым месцы і менавіта ў гэты час з'явіўся чалавек з фотаапаратам?
9. На якія пытанні фатаграфія не можа адказаць? Якая інфармацыя адсутнічае?
10. Ці дапамаглі вам пры выкананні практыкавання вашы веды па гісторыі?
11. Што ў вас выклікала цяжкасці? Чаму?

*Памятка 5*

**План аналізу плаката**

1. Вызначце падзею (і яе дату), якой прысвечаны плакат.
2. Па чыім палітычным заказе плакат быў выраблены і для якой аўдыторыі?
3. Якія фігуры ці аб'екты вынесены на пярэдні план, а якія аднесены на задні план?
4. Якія фігуры і аб'екты намаляваны вялікімі, а якія — маленькімі? Чаму?
5. Сфармулюйце паведамленне, якое плакат мусіць данесці да сваёй аўдыторыі.

*Памятка 6*

**Пытанні для аналізу рэкламнага роліка**

1. Апішыце свае эмоцыі і пачуцці, асацыяцыі, якія ўзнікаюць падчас прагляду роліка.
2. Паразважайце ў парах, чаму вы так рэагуеце.
3. Звярніце ўвагу на слоган роліка. Як вы лічыце, чаму ён менавіта такі? Які ў яго закладаецца сэнс?
4. Звярніце ўвагу на сюжэт (дзе разгортваецца дзеянне, да якой дзейнасці падахвочвае відэа).
5. Звярніце ўвагу на музычны фон (які настрой ствараецца).
6. Звярніце ўвагу на дзейных асоб (хто з'яўляецца героямі роліка, што яны робяць, з якім настроем, з кім уступаюць у камунікацыю).
7. Прасачыце пэўную заканамернасць. Фізічна прывабныя людзі часцей дэманструюць нешта станоўчае, непрывабныя людзі — наадварот, нешта негатыўнае. Як выглядаюць у роліку мужчыны і жанчыны, дзеці, старыя? Чаму? Ці прасочваюцца іншыя заканамернасці?

*Памятка 7*

**Як знайсці маніпуляцыі і фэйкі ў тэлесюжэтах?**

- Неверагодныя гісторыі;
- вострая, эмацыйная лексіка;
- неадпаведнасць карцінкі і словаў каментатара;
- ацэначны характар паведамлення журналіста;
- «сведчанні відавочцаў», якія немагчыма праверыць.

*Парады*

- Уважліва сачыце за тэлекарцінкай. Ці адпавядае выява сцвярджэнням? Аналізуйце кантэкст цалкам, параўноўваючы з іншымі медыя. Ці чулі вы пра той самы факт з іншых крыніц?
- Адрознівайце чуткі ад фактаў. Якая першакрыніца інфармацыі? Ці можна яе праверыць?
- Аналізуйце, ці замоўчваецца ў тэлесюжэтах пэўная інфармацыя, параўнаўшы з іншымі медыя.
- Звярніце ўвагу на цытаваных экспертаў. Ці чулі вы пра іх раней? Ці ведаеце, якая ў іх прафесійная рэпутацыя? Калі ўзнікнуць сумневы — скарыстайцеся інтэрнэтам.

***Памятка 8***

**Як знайсці маніпуляцыі і фэйкі ў сацыяльных сетках?**

У першую чаргу звяртайце ўвагу на:

- падазроныя акаўнты, з якіх паходзіць інфармацыя;
- неверагодную інфармацыю, якая выклікае шок;
- хвалепадобнае распаўсюджванне вызначанага паведамлення;
- адсутнасць спасылак на першакрыніцу.

*Парады*

- Заўсёды спрабуйце знайсці першакрыніцу інфармацыі, якая актыўна распаўсюджваецца ў сетцы.
- Звяртайце ўвагу на акаўнт-старонку, з якой распаўсюджваецца інфармацыя. Кім яна створана, як даўно?
- Колькі падпісчыкаў акаўнт-старонкі (сяброў, followers)?
- Колькі чалавек падзяліліся інфармацыяй (колькасць рэпостаў, shares, likes)?
- Звяртайце ўвагу на агульны характар папярэдніх паведамленняў, публікацый (posts).



**_Грамадазнаўства, 9 клас. Тэмперамент і характар чалавека_**

*Выканайце прапанаваныя заданні, выкарыстоўваючы фрагмент тэксту вучэбнага дапаможніка, комікс, матэрыял з Вікіпедыі.*

***Заданне 1***

*Устаўце прапушчаныя ў тэксце словы.*

*Кожны з чатырох тэмпераментаў не з'яўляецца ні дрэнным, ні добрым. Усе яны маюць свае вартасці і недахопы. Нягледзячы на тое што «прывабней» за ўсіх выглядае _______ (1), лідарам калектыву часцей за ўсё становіцца _______ (2), а сярод самых надзейных і адданых людзей найбольш _______ (3). _______ (4) дзівіць нас сваёй адчувальнасцю і дае магчымасць адчуць значнасць тых бакоў жыцця, якіх мы часта не заўважаем (фрагмент з твора К. Рыжова).*

***Заданне 2***

*Якія з прапанаваных тэкстаў (падручнік і Вікіпедыя) мае патрэбу ў выпраўленнях? Абгрунтуйце свой пункт гледжання прыкладамі з тэкстаў.*

***Заданне 3***

*Напішыце ад першай асобы свайго тыпу тэмпераменту кароткае паведамленне (пост у Twitter — не больш за 140 знакаў), дзе апісваецца пэўная сітуацыя, і праілюструйце яе ў выглядзе комікса.*

***Заданне 4*** * (дадаткова, па выбары)

*Стварыце для вашай бабулі аватар, які адлюстроўвае яе тэмперамент, для профілю ў сацыяльнай сетцы «Одноклассники».*

*Тэмперамент* (ад лац. temperamentum — суразмернасць, суадносіны) — гэта сукупнасць індывідуальных асаблівасцей, якія надаюць спецыфіку паводзінам і дзейнасці чалавека, характарызуюць ступень яго жыццёвай актыўнасці.

Вучэнне пра тэмперамент бярэ пачатак у далёкім мінулым. Яшчэ старажытна-грэчаскі ўрач Гіпакрат вучыў, што ў арганізме чалавека ёсць чатыры вадкасці: кроў (па-лацінску «sanguis»), слізь (па-грэчаску «phlégma»), жоўтая жоўць (па-грэчаску «cholế») і чорная жоўць (па-грэчаску «melas» — чорны, «cholế» — жоўць). Змешванне гэтых вадкасцей і перавага якой-небудзь з іх, як сцвярджаў Гіпакрат, ляжыць у аснове тыпаў тэмпераменту: сангвінічнага, флегматычнага, халерычнага і меланхалічнага.

## Теория темперамента по Гиппократу и Галену [ править | править вики-текст ]

Магия чисел в средиземноморской цивилизации привела к учению о четырёх темпераментах, в то время как на Востоке развивалась пятикомпонентная «система мира».

Слово «темперамент» (от лат. *peramentum*) в переводе с латинского обозначает «устойчивая смесь, соотношение частей», равное ему по значению греческое слово «красис» (др.-греч. κρᾶσις, «слияние, смешивание») ввели врачи античности Гиппократ и Гален. Он предположил, что существуют устойчивые индивидуальные различия в соотношениях между химическими системами, регулирующими поведение человека. Несмотря на то, что он среди первых указал на роль мозга в общей регуляции поведения, наиболее устойчивые индивидуальные различия он приписывал различиям в смесях нейро-гуморальных жидкостей тела. Гиппократ предположил, а Гален объяснил темперамент более детально как особенности поведения, преобладание в организме одного из «жизненных соков» (четырёх элементов):



Четыре темперамента в виде наглядных смайликов (названия слева направо и сверху вниз): флегматик, холерик, сангвиник, меланхолик.

<table>
<tr>
<td>Грамадазнаўства. 9 клас<br>Змест: тэмперамент і характар<br>Кампетэнцыі, якія правяраюцца:
<ul>
<li>арыентавацца ў розных крыніцах інфармацыі, крытычна ацэньваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц;</li>
<li>перакладаць інфармацыю з адной знакавай сістэмы ў іншую;</li>
<li>выкарыстоўваць сродкі інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій з захаваннем прававых і этычных нормаў;</li>
<li>ведаць азначэнні паняццяў тэмперамент, характар;</li>
<li>характарызаваць тыпы тэмпераменту і рысы характару; праявы біялагічнага, псіхалагічнага і сацыяльнага ў чалавеку</li>
</ul></td>
<td>Каментарыі для настаўніка<br><br>Заданне 1 (I — II узроўні засваення зместу адукацыі: 1–4 балы)<br>Гэта заданне дазваляе праверыць валоданне зместам вучэбнага прадмета на ўзроўні пазнавання і адрознівання асноўных паняццяў, іх правільнага вызначэння.<br>Адказы: 1) сангвінік; 2) халерык; 3) флегматык; 4) меланхолік.<br><br>Заданне 2 (III — IV узроўні засваення зместу адукацыі: 5–8 балаў)<br>Заданне пабудавана так, што вучні ў працэсе параўнання розных крыніц інфармацыі выяўляюць наяўныя ў іх супярэчлівыя звесткі пра тэмперамент. Хутчэй за ўсё, навучэнцы будуць звяртацца да тэксту вучэбнага дапаможніка як да аўтарытэтнай крыніцы. Але выяўленне розначытанняў у паходжанні паняцця «тэмперамент» у перакладзе з лацінскай мовы ў вучэбным дапаможніку і Вікіпедыі паспрыяе звароту да слоўніка для ўдакладнення. Пасля работы з тэкстам Вікіпедыі навучэнцы прыходзяць да высновы, што ў вучэбным дапаможніку інфармацыі недастаткова: родапачынальнікам вучэння пра тэмперамент названы старажытнагрэчаскі навуковец Гіпакрат, а старажытнарымскі вучоны Гален наогул не згадваецца. Для абгрунтавання значнай ролі Галена ў даследаванні тэмпераменту вучні павінны выявіць, што паняцце «тэмперамент» стала ўжывацца менавіта ў лацінскай мове, што сведчыць пра яго шырокае распаўсюджанне ў пэўных колах старажытнарымскага грамадства. Вучні прыходзяць да высновы, што неабходна выправіць абодва тэксты.<br><br>Заданне 3 (V узровень засваення зместу адукацыі: 9–10 балаў)<br>Работа з коміксам дазваляе вербалізаваць візуальную інфармацыю, г. зн. правяраецца ўменне перакладаць інфармацыю з адной знакавай сістэмы ў іншую. Складанне кароткага апісання (не больш за 140 знакаў — абмежаванне аб’ёму паведамлення) прымушае вучняў звяртацца да больш выразных сродкаў мовы для апісання прыкмет пэўнага тыпу тэмпераменту ў дзеяннях чалавека. Публічнасць паведамлення дае разуменне неабходнасці захавання этычных і прававых нормаў: не дапускаць абразлівых выразаў, праяў дыскрымінацыі па якой-небудзь прыкмеце і інш.<br><br>Заданне 4 * (V узровень засваення зместу адукацыі: 9–10 балаў)<br>Стварэнне аватара (візуалізацыя персоны) для іншага чалавека дазваляе не толькі прааналізаваць тэмперамент і суаднесці яго з характарам, але спрыяе лепшаму разуменню ўласнага тэмпераменту і характару — узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці біялагічнай і сацыяльнай прыроды чалавека. Выконваючы заданне, вучань мусіць улічыць узрост сваёй бабулі, яе прафесію і захапленні, а таксама спецыфіку аўдыторыі сацыяльнай сеткі «Одноклассники», у якой ён зазвычай не мае акаўнту.</td>
</tr>
</table>

# ЗМЕСТ

**Ад аўтара** ........ 3

**Частка 1. Рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі вучняў па гісторыі і грамадазнаўстве сродкамі медыяадукацыі** ........ 5
1.1. Кампетэнтнасны падыход да падрыхтоўкі вучняў па гісторыі і грамадазнаўстве: мэты, метады і сродкі, вынікі навучання ........ 5
1.2. Медыяадукацыя: гісторыя, асноўныя паняцці, тэорыі, падыходы ........ 8
1.3. Метады і прыёмы работы з інфармацыяй на ўроках гісторыі і грамадазнаўства ........ 16
1.4. Асноўныя метады і прыёмы работы з медыятэкстамі на ўроках ........ 24

**Частка 2. Метадычныя рэкамендацыі па рабоце з медыятэкстамі на ўроках гісторыі і грамадазнаўства** ........ 31
2.1. Візуальныя медыятэксты: фатаграфія, карыкатура, плакат, інфаграфіка ........ 31
2.2. Аўдыявізуальныя медыятэксты ........ 53
2.3. Навінныя і рэкламныя медыятэксты ........ 68
2.4. Новыя медыя ў навучанні: гаджэты і сацыяльныя сеткі ........ 77

**Даведнік па практыкаваннях (фарміраванне медыяінфармацыйных кампетэнцый)** ........ 83
**Даведнік па кейсах з медыятэкстамі** ........ 87
**Слоўнік медыяпедагога** ........ 89
**Памяткі для вучняў** ........ 91
**Дадатак «Кампетэнтнасна арыентаваныя заданні»** ........ 94

Вучэбнае выданне

**Палейка** Алена Аляксандраўна

**МЕДЫЯТЭКСТЫ
Ў НАВУЧАННІ ГІСТОРЫІ І ГРАМАДАЗНАЎСТВУ**

Дапаможнік для настаўнікаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Рэдактары *В. М. Іваноў, Н. Г. Шчарбакова*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Камп'ютарная вёрстка *А. Б. Грышына*
Карэктары *В. Р. Ермаковіч, В. М. Іваноў, Н. Б. Кучмель*

Падпісана да друку 10.12.2018. Фармат 84×108 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 10,08.
Ул.-выд. арк. 8,00. Тыраж 2365 экз. Заказ 528.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014,
№ 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.